## Шаноўныя студэнты!

Вы пачынаеце вывучаць курс гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя. У ходзе лекцый, практычных заняткаў, самастойнай працы па вышэй акрэсленай дысцыпліне вы станеце сведкамі і ўдзельнікамі вяртання да жыцця многіх імёнаў, твораў, ідэй, беспадстаўна занядбаных у часы сталінскіх рэпрэсій і застою.

Ужо выдадзены зборы твораў М. Гарэцкага, Я. Пушчы, спадчына Л. Калюгі, А. Мрыя (Л. Калюга. Творы. Мінск, 1992; А. Мрый. Творы. Мінск, 1993), паэзія А. Гаруна («Матчын дар», «Сэрцам пачуты звон»), У. Жылкі («Выбраныя творы»)... Свой уклад у вяртанне духоўнай спадчыны таленавітага пакалення пакутнікаў унеслі выкладчыкі кафедры беларускага літаратуразнаўства БрДУ, прапанаваўшы студэнтам і настаўнікам у якасці вучэбнага дапаможніка першы выпуск кнігі «Беларуская літаратура. У святле новых фактаў і назіранняў».

Робіцца сёння шмат. Але колькі трэба яшчэ вярнуць!.. Культура знішчалася сапраўды з эпічным размахам. Толькі ў дзень 29 кастрычніка 1937 года, па звестках Б. Сачанкі, С. Грахоўскага, былі расстраляны М. Зарэцкі, П. Галавач, А. Дудар, А. Вольны, В. Сташэўскі, М. Чарот. Не дзіўна, што А. Мальдзіс назваў гэты дзень «чорным днем для беларускай літаратуры». Паводле інфармацыі Б. Сачанкі на жалобным вечары ў СП БССР, прысвечаным ахвярам сталінізму, да 1938 года было рэпрэсіравана 128 членаў Саюза беларускіх пісьменнікаў. Засталося 14 з тых, якія пісалі па-беларуску.

Нагадаем некаторыя гістарычныя падзеі і змены, што адбыліся ў культурным жыцці краіны ў 20–30-я гады. Спадзяемся, што яны дапамогуць вам адчуць дух эпохі і асаблівасці літаратуры вывучаемага курса.

Бальшавікі не падтрымлівалі беларускі рух. Тым не менш, беларускія дзеячы жылі спадзяваннем, што ў хуткім часе здолеюць паспяхова пераадолець перыяд анархіі, неўладкаванасці. Гэтую надзею ўмацаваў Усебеларускі з’езд, што адбыўся 15 снежня 1917 года, ганаровым старшынёй якога быў абраны акадэмік Яўхім Карскі. З’езд быў разагнаны бальшавікамі, але ўсе яго дэлегаты (дзве тысячы), што з’ехаліся з розных куточкаў Беларусі, заявілі аб тым, што барацьбу беларусаў за сваю незалежнасць спыніць не здолее ніякая ўлада. Аб немажлівасці скарыць беларускі народ сведчыць факт абвяшчэння на акупаванай кайзераўскімі войскамі (немцы знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі з лютага 1918 да пачатку 1919 года) тэрыторыі, у Мінску, 25 сакавіка 1918 года Беларускай народнай рэспублікі. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі бальшавікі паспешліва абвясцілі ўтварэнне БССР (1 студзеня 1919 г.). У правядзенні гэтага мерапрыемства імі кіравала не шчырае жаданне дапамагчы беларусам вызначыць свой лёс, а вера, што ў хуткім часе пралетарская руская рэвалюцыя захлыне ўвесь Сусвет і ад былой БССР застанецца адзіны ўспамін.

Не паспеў беларускі народ забыць пра нямецкую навалу, як ужо яго землі разыгрываюць паміж сабой суседзі з усходу і захаду. Некаторыя беларускія дзеячы (А. Гарун, Т. Грыб) паверылі ў шчырасць «начэльніка панства». «Стан безупыннай няволі, – адзначаў Пілсудскі ў адозве да насельніцтва былога Вялікага Княства Літоўскага, – які я, нарадзіўшыся на гэтай нешчаслівай зямельцы, добра ведаю, павінен нарэшце быць зніштожаны і ўжо раз і назаўсёды ў гэтай быццам праз Бога забытай старонцы павінна запанаваць свабода і права вольнай, нічым не звязанай гутаркі аб сваіх патрэбах... Хачу вам даць магчымасць развязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы гэтак, як самі захочаце, без ніякага гвалту, або націску з боку Польшчы» (Ніва (Беласток). 1990. 11 лют.). І хаця пры Пілсудскім на Беларусі пачалі выходзіць перыядычныя выданні на беларускай мове, адкрыўся гарадскі Нацыянальны тэатр, ілюзіі беларусаў вырашыць нацыянальныя пытанні пры дапамозе палякаў паступова развеяліся як змрочны сон. Было зразумела, што для Пілсудскага Беларусь – гэта сродак барацьбы супраць бальшавіцкай Расіі і не болей. Беларускі народ стаміўся за гады бясконцых акупацый. Пагоршылася эканамічнае становішча краіны. Спакутавалася душа беларускага народа. Ён марыў адчуць сябе гаспадаром, а не «тутэйшым» на роднай зямлі, прагнуў міру. Думкі, перажыванні беларусаў за будучы лёс краіны, думаецца, найбольш поўна акрэслены Я. Купалам у артыкуле «Незалежнасць» (артыкул надрукаваны ў газеце «Беларусь» за 28 лістапада 1919 г.): «Наша незалежнасць соллю ўваччу для незалежнасці нашых суседак – Польшчы і Расіі, бо і адна, і другая хацелі б нашу незалежнасць утапіць у лыжцы вады...

Для адбудавання вялікай Польшчы «ад мора да мора» трэба пераступіць Беларусь; для адбудавання вялікай Расіі: ад Белага да Чорнага мора таксама трэба растаптаць Беларусь.

Вось і выходзе, што трэба Беларусь выкінуць з гісторыі, з геаграфіі, і наогул калі не цалкам прылучыць яе к адной з суседніх дзяржаў, то разрэзаць напалавіну, але так зрабіць, каб яе не было і звання.

А Беларусь, як і кожная іншая дзяржава, мае права і даб'ецца раней ці пазней гэтага права стаць роўнай і вольнай дзяржавай паміж суседзямі».

Польская ўлада працягвалася на Беларусі да 11 ліпеня 1920 г. На жаль, дзень вызвалення беларусаў ад польскай навалы стаў пачаткам эпохі таталітарызму. Сваё праўленне бальшавікі пачалі з будавання канцлагера пад Мінскам для ворагаў савецкай улады, так званых «кулакоў», «старых спецыялістаў», святароў... М. Бухарын у працы «Эканоміка пераходнага перыяда» звяртаў увагу прадстаўнікоў улады на думку, што «без масавых рэпрэсій і растрэлаў нам камунізму не пабудаваць». Болем адгукнуўся ў сэрцы беларусаў падзел на Усходнюю і Заходнюю.

Тым не менш, 20-я гады вызначаюцца шэрагам светлых мерапрыемстваў, што спрыялі адраджэнню беларускай нацыі.

У рэспубліцы паскоранымі тэмпамі ажыццяўляўся працэс беларусізацыі. Ужо ў 1921 годзе на Беларусі працавала шэсць тысяч беларускіх школ. Увага звярталася на развіццё культур іншых нацыянальнасцяў. Даведка: у 1932 г., калі ішлі поўным ходам рэпрэсіі і беларускае адраджэнне пайшло на спад, беларускіх школ было – 90 % (6263), польскіх – 3,6 % (252), яўрэйскіх – 3,2 % (221), рускіх – 1 % (99). Для авалодання беларускай мовай былі створаны па ўсёй рэспубліцы курсы беларусазнаўства тэрмінам на год. Дзяржаўныя ўстановы, 80 % газет перайшлі на беларускую мову, якая стала дзяржаўнай, а руская – сродкам зносін з другімі ўстановамі, рэспублікамі Саюза. У 1922 г. быў адкрыты Інстытут беларускай культуры, на аснове якога ўтворана Акадэмія Навук (1929 г.). У 1921 г. распачаў сваю дзейнасць Беларускі дзяржаўны універсітэт, на аснове факультэтаў якога пазней створаны дзяржаўныя педагагічны, медыцынскі і інш. У гэтым жа годзе расчыніліся для чытачоў дзверы Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі. У 1920 г. адкрываецца Першы Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр. У гэтых умовах нацыянальнага ўздыму стваралася новая беларуская літаратура. Літаратурнае пакаленне 20-х гадоў заявіла аб сабе з'яўленнем двух новых плыняў у развіцці беларускай літаратуры: бурапеннай (неалагізм «бурапена» ўжыты ўпершыню А. Александровічам) і ажыўленскай (гэты тэрмін прапаноўваў А. Бабарэка). Прадстаўнікі абодвух плыняў жылі ідэаламі адраджэння. Розніца ў тым, што бурапенаўцам яно ўяўлялася далёкім ад свайго завяршэння. Некаторыя з іх нават не заўважылі важнасці вырашэння такой гуманістычнай мэты як аднаўленне, сцвярджэнне чалавечай годнасці беларусаў. Вось чаму М. Чарот па-купалаўску сцвярджаў:

Пацерпім няшчасьця бязь ліку мы,
Каб толькі назвацца людзьмі.

Сваю мэту ўслед за М. Багдановічам (артыкул «Забыты шлях») ажыўленцы бачылі ва ўключэнні беларускага ў сусветнае, агульналюдскае.

Развіццю новых плыняў спрыялі літаратурныя часопісы: «Полымя» (1922), «Маладняк» (1923), «Узвышша» (1926), а таксама літаратурныя аб'яднанні («Маладняк» (1923), «Узвышша» (1926), «Полымя» (1927), БелАПП (1928)). Паводле дадзеных, колькасць сяброў «Маладняка» дасягнула менш чым праз год 500 чалавек. Для беларускай літаратуры гэта астранамічныя лічбы. Яны сведчаць аб масавым далучэнні людзей да літаратуры.

Часткова гэтаму спрыяла палітыка бальшавікоў, якія прынялі новую лінію ў нацыянальнай палітыцы, «нацыянальны нэп». НЭП разгарнуўся ў 1923 годзе. З гэтага часу нацыянальнае пытанне было пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсіх з'ездаў і канферэнцый, пленумаў. Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б

1926 г. заявіў, што нацыяналістычныя ўхілы ў Беларусі «страцілі сваю вастрыню». Такога роду заява адлюстроўвае момант найбольшага лібералізму ў дачыненні да нацыянальнага пытання на Беларусі. На гэтым Пленуме было вырашана збеларусізаваць саму камуністычную партыю: «Уся КП(б)Б павінна гаварыць на беларускай мове». За гэты час адбылося ўзбуйненне БССР шляхам далучэння Віцебскай і Магілёўскай губерняў (14 лютага 1924 г.) і двух паветаў Гомельскай губерні (6 снежня 1926 г.).

Аднак у гэтым жа 1926 годзе з'явіліся першыя адзнакі новай рэакцыйнай тэндэнцыі ў напрамку да абмежавання нацыянальнага развіцця ў БССР. Рэзалюцыя 10 з'езду КП(б)Б аддавала ўжо перавагу эканамічнаму развіццю перад развіццём нацыянальнай культуры. Першым аб'ектам бальшавіцкага наступу быў тэатр. У 1926–1927 г. са сцэны Другога Беларускага Дзяржаўнага Тэатра (тэатр пачаў дзейнічаць у 1926 г. Арганізаваны на базе беларускае тэатральнае студыі, што праходзіла курс сцэнічнай тэорыі і практыкі пад пратэкцыяй Маскоўскага Мастацкага Тэатру) зняты трагікамедыя «Тутэйшыя» Я. Купалы, драма В. Шашалевіча «Апраметная», п'есы Эўрыпіда. Змест знятых п'ес сведчыць, што пачаўся наступ не толькі супраць нацыяналізму, але і супраць сапраўднага мастацтва, таго, што не спрыяла выхаванню людзей у «пралетарскім духу». Зразумела, што Еўрыпіда і яго п'есы абвінаваціць у контррэвалюцыйных тэндэнцыях было нельга.

Пісьменнікі не маўчалі. Нагадаем сюжэт аповесці Зм. Бядулі «Салавей». Пан Вашамірскі, спалоханы бунтам у сваім тэатры, зачыняе яго і вырашае заняцца больш бяспечнай працай – гадоўлей коней. Ці не паказвае пісьменнік праз гэты эпізод адосіны бальшавікоў да тэатру, да мастацтва ўвогуле? Канкрэтызуючы ідэю аповесці, што заключаецца ў словах галоўнага героя Сымона («не хачу быць панскім салаўём»), А. Бабарэка ў рэцэнзіі на аповесць пісаў: «Прызначэнне мастацтва быць зброяй у змаганні з пануючым класам, а не забаўкай для апошняе».

Такім чынам, на колькі гэта было магчыма, пісьменнікі выступалі за свабоду і незалежнасць мастацтва. Яны спрабавалі прыцягнуць увагу свету да трагічнага становішча на Беларусі. Сёння, думаецца, сучасным чытачом верш Я. Пушчы «Рабіндранат Тагору», напісаны ў гэты час, успрымаецца як своеасаблівы сігнал «SOS»:

Краскі крыві параслі ў Беларусі,
Паэта мой любы, каханы!

У 1928 годзе Сталін канчаткова спыніў НЭП. Узмацняецца сіла ГПУ ў галіне літаратуры. На 12 з'ездзе КП(б)Б (1928 г.) адзначана неабходнасць «весці самую рашучую барацьбу з усякімі праявамі нацыянал-дэмакратызму». Пачынаецца «вялікі наступ» камунізму на нацыянальным фронце. І як вынік – абвінавачанне найбольш здольных і таленавітых пісьменнікаў

у прыналежнасці да контрэвалюцыйнай арганізацыі – «Саюз Вызвалення Беларусі» (СВБ). А. Бабарэк – залічваюць у секцыю моладзі, Ул. Дубоўку і Я. Пушчу – у тэрарыстычную секцыю... За абвінавачваннямі пачаліся арышты і высылка. Чысткі «нацдэмаў» праводзіліся праз тры гады: 1923–1930 гг., 1933–1934 гг., 1937–1939 гг.

Апазіцыйныя настроі сталі праяўляцца ў паводзінах, творчасці пісьменнікаў, якім пашчасціла заставацца па-за кратамі. Страх, разгубленнасць прымусілі іх знішчыць альбо папсаваць свае творы (Зм. Бядуля папсаваў раман «Язэп Крушынскі», К. Чорны знішчыў раман «Ідзі, ідзі»). М. Лужанін у форме верша «Дзень гневу» выступіў з асуджэннем былых сяброў-узвышэнцаў. Члены «Узвышша» (што былі на свабодзе) прынялі рэзалюцыю пад загалоўкам «Патрабуем жорсткай кары агентам міжнароднае буржуазіі ў Савецкай Беларусі – беларускім контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратам». Жыццё таленавітых беларускіх пісьменнікаў ператварылася ў суцэльную трагедыю. Уладары так званага новага грамадства імкнуліся найхутчэй вытравіць на Беларусі ўсё нацыянальнае. Сведчанне гэтаму роспуск у 30-я гады ўсіх беларускіх літаратурных арганізацый (1931 г. распушчана «Узвышша», 1932 г. «Полымя») і стварэнне на іх месцы адзінага Саюзу Савецкіх пісьменнікаў (рэзалюцыя ЦК КП(б) ад 23 красавіка 1932 г.).

Я. Купала з горычу пісаў:

Мне бацькаўшчынай цэлы свет,
Ад родных ніў я адвярнуўся...
Адно... не збыў яшчэ ўсіх бед:
Мне сняцца сны аб Беларусі!

Рабілася ўсё, каб нацыянальную літаратуру ператварыць у літаратуру савецкую.

Вось чаму сёння так важна вывучаць і асэнсоўваць аб’ектыўную гісторыю беларускай літаратуры, без «белых плям». Здолеем мы, выкладчыкі беларускай літаратуры, разам з вамі, студэнтамі-філолагамі, будучымі настаўнікамі, перакладчыкамі, журналістамі, прапагандыстамі беларускай культуры на роднай Бацькаўшчыне і далёка за яе межамі выканаць гэтую гістарычную місію, значыць у далейшым будзем жыць сваім розумам, самастойна вырашаць культурна-асветніцкія праблемы ў грамадстве. Не здолеем, назаўжды застанемся бязроднымі валацугамі на сваёй зямлі.

Будучыя калегі! Шмат перашкод сустрэнецца вам на шляху авалодання курсам «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя», асабліва яго першай трэці. На сённяшні дзень адсутнічаюць падручнікі, у якіх бы аб’ектыўна асвятлялася творчасць пісьменнікаў 20–30-х гадоў, не хапае тэкстаў, недастатковая колькасць гадзін, з нашага пункту погляду, прадугледжана вучэбным планам, зацверджаным Міністэрствам адукацыі, на

асэнсаванне дадзенай дысцыпліны. Каб кампенсаваць нястачу аб'ектыўнай гісторыі беларускай літаратуры мы прапануем гэты дапаможнік.

Будзем спадзявацца, што вучэбна-метадычныя распрацоўкі, якімі вы будзеце карыстацца ў ходзе самастойнай працы пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў і ў час іх правядзення пад кіраўніцтвам дасведчаных выкладчыкаў, дапамогуць вам, студэнтам філалагічнага, гістарычнага і факультэта замежных моў стацыянара, а таксама студэнтам філалагічнага факультэта аддзялення завочнага навучання, засвоіць праграму курса. Спіс пытанняў і заданняў для самакантролю дазволіць вам у межсесійны перыяд праверыць свае веды, узровень самападрыхтоўкі, належным чынам падрыхтавацца да экзамена.

Прапанаваныя пытанні і заданні да практычных заняткаў акрэсляць кола вашых пошукаў па той ці іншай праблеме. Не ігнаруйце, калі ласка, пытанні праблемнага характару. Падрыхтоўка па іх – найбольш плённы шлях аналізу мастацкага твора. Авалодаўшы майстэрствам праблемнай гутаркі з выкладчыкам, аднакурснікамі, вучнямі ў школе, вы здолееце наблізіцца да разумення аўтарскага погляду на праблему і героя, спасцігнуць эстэтычную сутнасць твораў слоўнага мастацтва нашых беларускіх пісьменнікаў 20–30-х гадоў. Літаратурныя манаграфіі і артыкулы (бібліяграфія па творчасці пісьменніка падаецца ўслед за пытаннямі практычных заняткаў па кожнай тэме) дапамогуць самастойна ацаніць неадназначныя сітуацыі і ўчынкі герояў, даць аб'ектыўную ацэнку творчай спадчыны пісьменніка.

Хочацца спадзявацца, што эмацыянальна-маральна-ацэначныя загалоўкі кожнай тэмы практычных заняткаў і эпіграфы, што будуць суправаджаць кожную новую вашу сустрэчу з пісьменнікам, дадуць магчымасць кожнаму з вас глыбока адчуць праўду эпохі. Усе мы нясем адказнасць перад сабой, перад часам за рознага роду анамаліі ў гістарычным руху краіны, у людскіх узаемаадносінах, хаця прамой віны нашай у гэтым няма.

Вельмі важнай і актуальнай для літаратуразнаўцаў у 1917–1945 гадах была праблема творчых кантактаў і ўзаемаўплываў. Зразумела, што гэтае пытанне не магло застацца па-за нашай увагай. У прапануемым дапаможніку ўлічваецца арыентацыя студэнтаў на другую спецыяльнасць, што вучацца на аддзяленнях беларуская мова і літаратура з гісторыяй, беларуская мова і літаратура з нямецкай мовай, беларуская мова і літаратура з англійскай мовай, руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура (такога роду заданні пазначаны зорачкай і змешчаны ў пераліку пытанняў да практычных заняткаў).

Будучыя настаўнікі-славеснікі! У ходзе падрыхтоўкі да практычных заняткаў уважліва стаўцеся да кожнага незнаёмага слова. Памятайце: дасведчанасць – важны паказчык вашай прафесійнай падрыхтоўкі. З мэтаю

павышэння вашай філалагічнай культуры і далучэння да скарбніцы эстэтычных і маральна-этычных каштоўнасцей свайго народа мы прапануем вам, нашы дапытлівыя сябры, для выкарыстання міні-слоўнік «Тлумачэнне некаторых імёнаў і паняццяў» і спіс твораў для завучвання на памяць. Усе віды працы, прадугледжаныя ў дапаможніку, маюць важнае значэнне для прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-славеснікаў, для павышэння культуры мыслення, для паспяховага авалодання студэнтамі курсам «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя».

*Аўтары*

## Праграма па гісторыі беларускай літаратуры для студэнтаў 3 курса спецыяльнасцяў «Беларуская філалогія», «Беларуская мова і літаратура. Гісторыя», «Беларуская мова і літаратура. Англійская мова», «Беларуская мова і літаратура» (АЗН)

### Беларускі літаратурны працэс першай трэці XX ст.

*1. «Нашаніўскі» перыяд*

Агульная характарыстыка. Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры на пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і нацыянальнае адраджэнне. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», кансалідацыя творчых сіл на платформе «нашаніўства». З'яўленне іншых перыядычных выданняў. Разгортванне кнігавыдавецкай дзейнасці. Славянскі друк пачатку XX ст. пра беларускае нацыянальнае адраджэнне, літаратуру, дзейнасць «Нашай нівы». Ацэнкі газеты ў савецкі час.

Пафас, вядучыя матывы, вобразы беларускай літаратуры пачатку XX ст. Развіццё лірычнай паэзіі, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу, станаўленне прозы і драматургіі. Узнікненне крытыкі і публіцыстыкі, разгортванне перакладчыцкай справы. Паскоранасць літаратурнага працэсу. Засваенне вопыту фальклору. Праблема метаду і стылю. Вядучае месца твораў рэалістычнай скіраванасці. Рамантычныя формы спасціжэння свету. Праявы мадэрнізму ў творчасці Я. Купалы, В. Ластоўскага, З. Бядулі і інш. Трансфармацыя еўрапейскіх традыцый на беларускай глебе.

*2. Пісьменнікі-пачынальнікі навейшай літаратуры*

Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі, 1869–1922). Факты біяграфіі. Пачатак літаратурнай творчасці. Зборнікі апавяданняў «Бярозка», «Васількі». Уплыў фальклору на фарміраванне таленту. Этычная пазіцыя пісьменніка. Гуманістычная скіраванасць сацыяльна-псіхалагічных апавяданняў («З бальнічнага жыцця», «Гаротная», «Зарабляюць» і інш.). Паказ трагічнага лёсу людзей працы. Алегарычныя творы («Падласенькі», «Рабы», «Павук», інш.). Філасафічнасць зместу імпрэсій і вершаў у прозе («Васількі», «Раны», «Чалавек»). Раман «Золата» як адзін з першых твораў буйной празаічнай формы ў нацыянальнай літаратуры. Ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці. Публіцыстыка Ядвігіна Ш. («Лісты з дарогі», «Думкі з падарожы» і інш.). Творы мемуарнага жанру.

Цётка (Алаіза Пашкевіч, 1876–1916). Біяграфічныя звесткі. Ідэйна-эстэтычныя вытокі творчасці. Цётка як пачынальніца беларускай палітычнай лірыкі («Мора», «Хрэст на свабоду», «Добрыя весці», інш.). Паэзія Цёткі і творчы вопыт М. Горкага, Л. Украінкі, І. Франко. Элегічная і медытатыўная лірыка перыяду эміграцыі («На чужой старонцы», «З чужыны», «Мае думкі» і інш.). Цётка-празаік. Выкарыстанне сімволікі і алегорыі, асаблівасці псіхалагізму ў творах. Публіцыстыка («Да вясковай моладзі

беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Як нам вучыцца», інш.). Уклад у развіццё мемуарнага жанру («Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі»). Педагагічная дзейнасць А. Пашкевіч. Вобраз пісьменніцы і рэвалюцыянеркі ў літаратуры і мастацтве.

Уладзіслаў Галубок (Уладзіслаў Голуб, 1882–1937). Жыццёвы лёс, шматграннасць творчай асобы. Пачатак літаратурнай працы. Адлюстраванне мінулага і сучаснасці ў п’есах «Ганка», «Пан Сурынта», «Суд», «Пісаравы імяніны» і інш. Зварот да розных жанравых формаў. Майстэрства стварэння камедыйных сітуацый. Шырокая прысутнасць фальклору ў п’есах. Уклад у станаўленне беларускага тэатра і драматургіі. «Вандроўны» тэатр У. Галубка ў гісторыі беларускай культуры.

Францішак Аляхновіч (1883–1944). Біяграфічныя звесткі. Пачатак літаратурнай і тэатральнай дзейнасці. Тэма горада, паказ жыцця інтэлігенцыі ў п’есах «Страхі жыцця», «Цені», «Манька», «Шчаслівы муж». Водгук драматурга на падзеі сучаснасці («Калісь», «Няскончаная драма» «Пан міністар» і інш.). Зварот да фальклору («Чорт і баба», «Бутрым Няміра», «Круці не круці – трэба памярці»). Ф. Аляхновіч як пачынальнік «новай драмы» ў беларускай літаратуры. Дакументальна-мастацкая аповесць «У капцюрох ГПУ». Кніга Ф. Аляхновіча ў кантэксце «гулагаўскай» літаратуры. Ф. Аляхновіч – даследчык гісторыі беларускага тэатра.

Вацлаў Ластоўскі (1883–1938). В. Ластоўскі як асоба. Уклад у гістарычную навуку, мовазнаўства, этнаграфію. Ідэйна-творчыя ўстаноўкі пісьменніка і дыскусія 1913 г. у «Нашай ніве». Клопат пра высокі мастацкі ўзровень нацыянальнай літаратуры (артыкул «Па сваім шляху»). Жанравая разнастайнасць твораў В. Ластоўскага, іх праблемна-тэматычнае наватарства. Адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі падзей беларускай гісторыі («Троіцкі замак», «Князёўна Рагнеда», «Бітва каля Магільны», «Лабірынты», «О, Крыўская зямля...», інш.). Адраджэнскія матывы ў творах «Прывід», «Лебядзіная песня». Інтэлектуалізм, філасафічнасць прозы і паэзіі пісьменніка («Дзень ружавай кветкі», «Слёзы», «У час аблогі», інш.).

Змітрок Бядуля (Самуіл Плаўнік, 1886–1941). Жыццёвыя «ўніверсітэты» будучага пісьменніка. Ранняя творчасць. Адметныя рысы Бядулі-апавядальніка.

Тэма мастака і мастацтва ў творчасці (апавяданні «Велікодныя яйкі», «Бондар», вершы «На горне душы першы верш я каваў...», «Мары паэта», аповесць «Салавей»). Лірыка перыяду Першай сусветнай вайны («Сухавеі», «...І сотнямі тысяч...», «Ад крыві чырвонай...», інш.). Гісторыя напісання рамана «Язэп Крушынскі». Ідэйны змест твора. Навізна праблематыкі і вобраза галоўнага героя. Беларускі фальклор у творчасці З. Бядулі. Казачная ўмоўнасць і яе роля ў сюжэтна-кампазіцыйным афармленні аповесці «Сярэбраная табакерка». Працяг З. Бядулем традыцый сацыяльна-

філасофскай прозы. З. Бядуля – публіцыст, літаратурны і тэатральны крытык, дзіцячы пісьменнік.

Алесь Гарун (Аляксандр Прушынскі, 1887–1920). Перыяды жыцця і творчасці. Думы аб Беларусі – лейтматыў паэзіі А. Гаруна. Вобраз выгнанніка-рэвалюцыянера і вобраз Радзімы ў творах зборніка «Матчын дар». Гісторыя напісання і выдання кнігі. Тэматычныя аспекты лірыкі паэта («Мая люба», «Дзяўчаці», «У прыпар», «Як ліст вярбінкі маладой...», «Ідуць гады», «Адбітак», інш.). Творчае засваенне і выкарыстанне набыткаў фальклору. Проза А. Гаруна (І.Жывіцы): жанравая шматстайнасць, праблемна-тэматычнае наватарства. «Жывыя казкі», іх мастацкія асаблівасці. А. Гарун – публіцыст.

Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч, 1887–1937). Грамадска-палітычная дзейнасць. Тэматычнае наватарства паэзіі. Вобраз рабочага ў зборніку «Песні». Змена танальнасці, вобразна-мастацкіх сродкаў у кнігах савецкага часу («Песні працы і змагання», «Урачыстасць»). Тэматыка і праблематыка апавяданняў (зборнікі «Трэскі на хвалях», «Прысады», «Гаспадар»). Спроба стварэння вобраза актыўнага героя. Мастацкія выдаткі твораў. Праца над раманам «Сокі цаліны». Вобраз прафесійнага рэвалюцыянера Рыгора Нязвычнага. Жанрава-тэматычнае наватарства, сюжэт і кампазіцыя твора, асаблівасці стылю. «Сокі цаліны» ў ацэнцы крытыкі 1920-х гг. Сучаснае прачытанне рамана. Ц. Гартны – крытык і нарысіст. Вобраз З.Жылуновіча ў беларускай літаратуры.

Уклад у развіццё паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі і літаратуразнаўства Каруся Каганца, Гальяша Леўчыка, Казіміра Сваяка, Зоські Верас, Алеся Гурло, Канстанцыі Буйло, Антона Навіны, Сяргея Палуяна.

*3. Творчасць пісьменнікаў-класікаў*

Янка Купала (Іван Луцэвіч, 1882–1942). Жыццёвы і творчы шлях. Роля Я. Купалы ў развіцці беларускай паэзіі і драматургіі. Вытокі творчасці. Пераемнасць традыцый папярэднікаў і іх узбагачэнне. Творчая эвалюцыя паэта ў зборніках «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця». Тэмы, матывы, вобразы, мастацкія асаблівасці лірыкі. Спецыфіка купалаўскага рамантызму. Раннія паэмы («Зімою», «Нікому», «Адплата кахання»). Наватарская сутнасць драматычных паэм «Адвечная песня», «Сон на кургане», іх гісторыка-літаратурнае значэнне. Сувязь твораў з асноўнымі матывамі лірыкі. Рамантычныя паэмы Я. Купалы: характары герояў, прырода канфлікту, мастацка-вобразная сістэма твораў. Праблемы духоўнага абуджэння народа ў паэмах «На Куццю», «На Дзяды». Арыгінальнасць зместу і формы паэмы «Яна і я». Гістарычная абумоўленасць звароту пісьменніка да драматычных жанраў. Майстэрства Купалы-драматурга. Сцэнічны лёс камедыі «Паўлінка», прататыпы герояў. Рэалістычна-бытавы і ўмоўна-рамантычны планы дзеяння, вобразы-сімвалы ў драме «Раскіданае гняздо». П’еса Я. Купалы ў

кантэксце беларускай літаратуры аб «раскіданых гнёздах». Час і месца дзеяння ў п'есе «Тутэйшыя». Сістэма вобразаў. Акцэнтацыя ўвагі на трагедыі «тутэйшасці».

Водгук Я. Купалы на сацыяльна-палітычныя падзеі канца 1918 г. (вершы «Для Бацькаўшчыны», «Свайму народу», «На сход!», «Паязджане», артыкулы «Незалежнасць», «Больш самачыннасці», інш.). Роздум аб гістарычным лёсе Беларусі ў пазнейшых творах. Зборнікі «Спадчына» і «Безназоўнае». 1930-я гг. у лёсе і творчасці Я. Купалы. «Ляўкоўскі» цыкл вершаў. Паэтычная канцэпцыя жыцця ў творах. Ацэнкі цыкла ў савецкія дзесяцігоддзі і на сучасным этапе. Паэма «Тарасова доля». Зборнікі паэзіі «Песня будаўніцтву», «Беларусі ардэнаноснай», «Ад сэрца». Лірыка і публіцыстыка Я. Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны («Беларускім партызанам», «Паўстаў народ», «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Кліч да беларускага народа» і інш.). Гістарызм мыслення аўтара. Я. Купала – перакладчык.

Вобраз народнага паэта ў літаратуры і мастацтве.

Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч, 1882–1956). Біяграфічныя звесткі. Традыцыі рускай літаратуры ў фарміраванні будучага мастака слова. Лірыка Я. Коласа. Агульнае і адрознае з Я. Купалам. Зборнік паэзіі «Песні-жальбы»: дамінантныя вобразы, матывы, танальнасць кнігі. Мастацкае спасціжэнне паэтам рэалій рэвалюцыйнай эпохі («Да працы!», «Пакліч»). Роздум аб лёсе народа і Радзімы («Беларускаму люду», «На чужыне», «Крыж», «Цені-страхі», «Звон шыбаў»). Паэма «Новая зямля» як этапная з'ява ў творчасці Я. Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. Праблема зямлі і волі. Жанравая прырода паэмы. «Новая зямля» ў крытыцы і літаратуразнаўстве. Твор Я. Коласа і сучаснасць. Паэма «Сымон-музыка». Аўтарскія рэдакцыі. Канцэпцыя мастака і мастацтва. Адметнасць кампазіцыі. Роля лірычных адступленняў і ўстаўных навел. Вобразна-выяўленчае майстэрства аўтара ў паэме «Рыбакова хата».

Проза пісьменніка. Праблематыка, жанрава-стылявыя асаблівасці апавяданняў. Эвалюцыя і адметнасць коласаўскага псіхалагізму («Васіль Чурыла», «Нёманаў дар», «Малады дубок», інш.). Філасофскія навелы-прытчы (зборнік «Казкі жыцця»). Фальклорныя і літаратурныя вытокі твораў, арыгінальнасць жанравай формы, філасофска-сацыяльны змест («Жывая вада», «Хмарка», «Стары лес», «Балотны агонь», «Курган» і інш.). Апавяданні Я. Коласа 1920-х гг. («Сяргей Карага», «Крывавы вір», «Туды, на Нёман!», «Балаховец»). Палемічная скіраванасць твораў супраць тагачасных літаратурных канонаў. Спачуванне ахвярам рэвалюцыі. Трылогія «На ростанях». Гісторыя напісання. Аўтабіяграфізм. Уплыў агульнай атмасферы часу на заключную частку твора. Лабановіч як прадстаўнік перадавой беларускай інтэлігенцыі, пошук ім шляхоў да народа. Высокая

культура псіхааналізу, філасофскія адступленні ў трылогіі. Паказ калектывізацыі ў аповесці «Адшчапенец». Твор Я. Коласа і паэма «Краіна Муравія» А. Твардоўскага. Дакументальная аснова, праблематыка аповесці «Дрыгва». Творчасць Я. Коласа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: публіцыстыка, лірыка, паэмы «Суд у лесе», «Адплата». Грамадская дзейнасць народнага паэта. Пісьмо-запавет Я. Коласа нашчадкам. Мастацкая і навукова-крытычная літаратура пра пісьменніка.

Максім Багдановіч (1891–1917). Жыццяпіс. Нетрадыцыйнасць постаці М. Багдановіча ў нацыянальнай літаратуры. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Дыскусія 1913 г. і пазіцыя пісьменніка. Праблема красы ў творах «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару», «У вёсцы», «Свяча бліскучая зіяе...», «Санет (На цёмнай гладзі сонных луж балота...)». Творчая гісторыя зборніка «Вянок», першае і наступныя яго выданні. Ідэйна-мастацкае адзінства, лірычныя сюжэты цыклаў і ўсёй кнігі. Паэтычнае майстэрства аўтара. Пейзажная і інтымная лірыка. М. Багдановіч як пачынальнік філасофскай плыні ў беларускай паэзіі («Жывеш не вечна, чалавек...», «С.Е. Палуяну», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...», інш.). Узмацненне грамадзянскага і патрыятычнага пафасу на заключным этапе творчасці («Беларусь, твой народ дачакаецца...», «Ты не згаснеш, ясная заранічка...», «Пагоня»). Узбагачэнне нацыянальнай паэзіі класічнымі жанрамі, новымі рытмічнымі і страфічнымі формамі. Жанравая і тэматычная навізна прозы пісьменніка. Ідэя «нацыянальнага стылю» ў артыкуле «Забыты шлях». Праца па асэнсаванні гісторыі беларускай літаратуры. М. Багдановіч і культурна-гістарычная школа. Ацэнкі твораў пісьменнікаў-сучаснікаў. М. Багдановіч як заснавальнік нацыянальнай школы мастацкага перакладу. Вобраз пісьменніка ў літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

Максім Гарэцкі (1893–1938). Біяграфічныя звесткі. Навізна тэматыкі і праблематыкі ранніх твораў (апавяданні «У лазні», «Роднае карэнне», драма «Антон» і інш.). Зборнік прозы «Рунь» у кантэксце нацыянальнага эпасу пачатку ХХ ст. Вобраз інтэлігента-адраджэнца ў апавяданнях і аповесцях («У чым яго крыўда?», «Меланхолія», інш.). Знешні і ўнутраны аўтабіяграфізм твораў. Паказ складанага паразумення «вучонага сына» з маці-вёскай. Падзеі Першай сусветнай вайны ў асэнсаванні М. Гарэцкім («На імперыялістычнай вайне», «Літоўскі хутарок», «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Ціхая плынь», інш.). Гуманістычная пазіцыя аўтара. Творы М. Гарэцкага і пісьменнікаў «страчанага пакалення». Лёс народа, беларуская гісторыя ў прозе першых паслярэвалюцыйных гадоў («Фантазія», «Бітва на Уле», «Апостал», «Дзве душы», інш.). Адыход ад тагачаснай традыцыі ў паказе вобраза камуніста. Раманы «Віленскія камунары», «Камароўская хроніка»: гісторыя напісання, праблематыка, жанравая адметнасць. Цыкл «Сібірскія абразкі». Апошнія творы пісьменніка («Скарбы жыцця», «Ляво-

ніус Задумекус», «Кіпарысы»). Арыгінальнасць жанравай формы. Зварот да прытчы, алегорыі, сімволікі. Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве. М. Гарэцкі – крытык і літаратуразнаўца. «Гісторыя беларускае літаратуры»: лёс кнігі, ацэнкі сучасных даследчыкаў.

*4. Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гг.*

Актывізацыя культурна-грамадскага жыцця. Палітыка беларусізацыі, яе плённае ўздзеянне на агульны стан нацыянальнай культуры. Уклад у літаратуру пісьменнікаў старэйшага пакалення (творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, З. Бядулі, Ц. Гартнага). Стварэнне літаратурных арганізацый «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», інш. Ідэйна-эстэтычныя праграмы аб’яднанняў: стаўленне да класічнай спадчыны, вуснай народнай творчасці, погляды на месца і ролю літаратуры ў жыцці народа, на выхаванне новага чалавека. «Маладнякоўская» паэзія і проза. Ідэя стварэння новага пралетарскага мастацтва. Пошукі арыгінальных вобразна-выяўленчых сродкаў (паэма М. Грамыкі «Гвалт над формай», вершы А. Александровіча, А. Вольнага, Я. Пушчы, У. Дубоўкі, Т. Кляшторнага, А. Дудара). Жыццесцвярджальны пафас, зварот да новага героя. Узоры прыгодніцкай літаратуры (аповесці «Свінапас» М. Чарота, «Два» А. Вольнага, «Ваўчаняты» А. Вольнага, А. Александровіча, А. Дудара). Сюжэтна-кампазіцыйная блізкасць да «маладнякоўскай» аповесцей Я. Коласа («На прасторах жыцця»), З. Бядулі («Салавей»). Праблемна-тэматычная, жанрава-стылявая шматстайнасць твораў сяброў «Узвышша» (У. Дубоўкі, Я. Пушчы, К. Крапівы, Т. Кляшторнага, М. Лужаніна, К. Чорнага, А. Мрыя, С. Дарожнага). Арыентацыя на нацыянальна адметнае мастацтва. Нерэалізаванасць праграмы аб’яднання ў цэлым, прычыны гэтага. Адносіны былых «нашаніўцаў» і «маладнякоўцаў». Перарастанне барацьбы літаратурнай у палітычную. Рэарганізацыя «Маладняка». Адмаўленне БелАПП ад нацыянальных традыцый.

Пошукі і набыткі паэзіі, прозы, драматургіі. Творчасць Тодара Кляшторнага, Паўлюка Труса, Максіма Лужаніна, Пятра Глебкі, Уладзіміра Хадыкі, Васіля Каваля, Лукаша Калюгі, Барыса Мікуліча, Янкі Нёманскага, Платона Галавача, Рыгора Мурашкі, Сымона Баранавых, Еўсцігнея Міровіча, Міхайлы Грамыкі, Васіля Шашалевіча.

*5. Творчасць пісьменнікаў «Маладняка» і «Узвышша»*

Андрэй Мрый (Андрэй Шашалевіч, 1893–1943). Біяграфічныя звесткі. Адметнасць таленту. Апавяданні «ўзвышаўскага» перыяду. Нетрадыцыйнасць герояў, асаблівасці мовы твораў. «Запіскі Самсона Самасуя». Гісторыя публікацыі, прачытанне рамана ў 1920-я гг. і ў наш час. «Непатапляльнасць» Самасуя, тыповасць, універсальнасць адкрытага А. Мрыем вобраза. Сатырычныя вобразы другога плана (Сом, Лін, Крэйна, Торба, інш.), іх адрозненні ад Самсона Самасуя. Шапялёўка як мастацкая мадэль

свету, створаная па законах сатырычнай літаратуры. Мастацкія сродкі ўзнаўлення рэчаіснасці ў творы, кампазіцыйныя асаблівасці. Раман А. Мрыя ў кантэксце сатырычнай прозы 1920–30-х гг. (творы К. Крапівы, М. Булгакава, М. Зошчанкі, А. Платонава, Я. Гашака).

Міхась Чарот (Міхась Кудзелька, 1896–1937). Жыццёвы і творчы шлях. Месца М. Чарота ў літаратурным працэсе 1920-х гг. Вызначальныя рысы паэзіі. Вобраз рэвалюцыі ў зборніку «Завіруха». Ліра-эпас пісьменніка. Паэма «Босыя на вогнішчы». Сімволіка вобразаў, розныя трактоўкі «босых» (У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, І. Багдановіч). Жанравая разнастайнасць прозы. Гуманістычны пафас твораў пра лёс прадстаўнікоў старога свету («Галя», «Талачка-шкрабалачка»). П’есы для дзяцей. Драма «На Купалле». Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча і Я. Купалы ў камедыі-вадэвілі «Мікітаў лапаць». Апошні верш М. Чарота.

Уладзімір Жылка (1900–1933). Біяграфічныя звесткі. «Дзённік» пісьменніка. «Віленскі» і «пражскі» перыяды творчасці. Стасункі з «Маладняком». Гістарычны лёс радзімы, незалежніцкія і адраджэнскія матывы ў творах («Покліч», «Хто мужны, хто смелы, хто дужы...», «Беларусь», інш.). Традыцыі М.Багдановіча ў творчасці У.Жылкі («Меч», «Палімпсест», «Хараство», «Вершы аб Вільні»). Танальнасць філасофскай лірыкі («На ростані», «Бяспынна, глуха процьма часу...», «Усе мы страчаныя...» і інш.). Міні-паэма «Тэстамент» – споведзь і запавет паэта наступным пакаленням. Вобраз аўтара ў творы. У. Жылка – крытык і перакладчык.

Уладзімір Дубоўка (1900–1976). Жыццяпіс. Раннія зборнікі «Строма», «Трысцё», «Credo», іх мастацка-вобразная адметнасць. Выявы «маладнякоўскай бурапеннасці». Стаўленне Дубоўкі-маладнякоўца да класічнай спадчыны. Зварот да ліра-эпасу («Там, дзе кіпарысы», «Плач буры», інш.). У. Дубоўка і М. Багдановіч. Шырокае выкарыстанне фальклору ў творах «узвышаўскага» перыяду, смелы пошук новых паэтычных формаў. Тэма мастака і мастацтва ў паэтычнай трылогіі «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!». Сюжэтнае і кампазіцыйнае наватарства паэм. Творы ва ўспрыманні крытыкі 1920-х гг. і іх сучаснае прачытанне (М. Арочка, В. Максімовіч). Творчасць 1950–70-х гг. Гісторыя напісання зборніка «Палеская рапсодыя». Вобраз Беларусі ў кнізе.

Міхась Зарэцкі (Міхась Касянкоў, 1901–1937). Жыццёвы і творчы шлях. Рысы «маладнякоўскай» прозы ў ранніх апавяданнях (зборнікі «У віры жыцця», «Пела вясна»). Абарона агульначалавечых каштоўнасцей (апавяданні «Адна партыя ў шашкі», «Ворагі», «Кветка пажоўклая», «Бель», «Дзіўная»). Навізна праблематыкі першых вялікіх эпічных твораў («Голы звер», «Сцежкі-дарожкі»), сюжэтна-кампазіцыйнае майстэрства празаіка. Нарыс «Падарожжа на Новую зямлю», няскончаны раман «Крывічы» ў творчым і чалавечым лёсе пісьменніка. Падзеі калектывізацыі ва

ўзнаўленні М. Зарэцкім. Раман «Вязьмо». Віна і бяда Сымона Карызны. Вобраз Галілея і яго функцыянальная роля ў ідэйным змесце твора. Раман М. Зарэцкага ў кантэксце літаратуры свайго часу пра «вялікі пералом». Тэматыка і праблематыка п'ес «Віхор на балоце», «Белыя ружы». Пытанне пра творчы метад пісьменніка.

Язэп Пушча (Іосіф Плашчынскі, 1902–1964). Факты біяграфіі. Творчасць 1920-х гг. у ацэнцы савецкай крытыкі. Пафас «маладнякоўскіх» зборнікаў «Раніца рыкае», «Vita». Захапленне паэтыкай імажынізму. Выдаткі паэтычнага эксперыменту. Змена танальнасці ў кнігах «Дні вясны» і «Песні на руінах». Матывы і вобразы цыклаў «Асенніх песні», «Лісты да сабакі». Ідэйна-мастацкія адрозненні паміж «маладнякоўскім» і «ўзвышаўскім» перыядамі. Задума стварэння паэмнай трылогіі і яе мастацкае ўвасабленне. Рэалістычны і сімвалічны планы прачытання паэм «Песня вайны», «Цень Консула». Архітэктоніка твораў. Паэма «Сады вятроў». Тэма мастак і народ у ліра-эпасе Я. Пушчы. Пушча-крытык пра ролю творцы і літаратуры ў грамадскім жыцці (артыкулы «У абарону маладой паэзіі», «Максім Лужанін. Крокі» і інш.). Зборнікі Я. Пушчы 1960-х гг. «Вершы і паэмы», «Пачатак легенды». Змест ненадрукаваных пры жыцці аўтара вершаў.

## Літаратурны працэс 1930-х – сярэдзіны 1950-х гг.

*1. Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гг.*

Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі. Маласпрыяльныя ўмовы для творчасці. Падмена сапраўдных мастацкіх каштоўнасцей творамі-аднадзёнкамі, шырокае бытаванне ў літаратуры сацыяльных і ідэалагічных заказаў. Адыход ад рэалістычных традыцый узнаўлення падзей, ідэалізацыя і прыхарошванне як норма ў творчасці. Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Стварэнне адзінага Саюза пісьменнікаў СССР. Станоўчае і адмоўнае значэнне гэтай акцыі. З'яўленне і афіцыйнае замацаванне ў тэорыі тэрміна «сацыялістычны рэалізм». Адкрытае і прыхаванае непрыманне пісьменнікамі таталітарнай улады. Асуджэнне прымусовай калектывізацыі, паспешлівасці ў яе правядзенні (аповесці і раманы Я. Коласа «Адшчапенец», Б. Мікуліча «Чорная Вірня», М. Зарэцкага «Вязьмо», п'есы К. Чорнага «Лета», В. Шашалевіча «Рой»). Адстойванне ідэі даверу да чалавека (камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»). Матывы расчараванасці і смутку ў паэзіі У. Хадыкі, З. Астапенкі, С. Астрэйкі.

Кандрат Крапіва (Кандрат Атраховіч, 1896–1991). Жыццёвы і творчы шлях. Аб'екты аўтарскага смеху ў ранніх паэтычных і празаічных зборніках. Праблематыка, героі баек, традыцыі народнай смехавой культуры ў творах. Зварот да парадыйнай і сатырычнай паэмы («Біблія», «Хвядос-Чырвоны нос»). К. Крапіва пра месца сатыры ў жыцці і літаратуры (арты-

кулы канца 1920–50-х гг.). Спроба стварэння рамана «Мядзведзічы». Першыя п’есы пісьменніка («Канец дружбы», «Партызаны»). Месца сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім» у творчай спадчыне К. Крапівы. Гуманістычная ідэя твора, сутнасць канфлікту, вобразы персанажаў. Майстэрства драматурга. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе мастацкае вырашэнне ў драме «Проба агнём». Нетрадыцыйны паказ ваеннай рэчаіснасці ў сатырычнай камедыі «Мілы чалавек». Уплыў тэорыі бесканфліктнасці на лірычную камедыю «Пяюць жаваранкі». «Брама неўміручасці» як філасофскі роздум драматурга над сутнасцю чалавечага існавання. Галерэя сатырычных тыпаў і вобразаў. Роля станоўчых персанажаў у камедыі. Апошнія творы, інтэрв’ю і выступленні народнага пісьменніка.

Міхась Лынькоў (1899–1975). Біяграфічныя звесткі. Паказ у ранніх творах (апавяданні «Над Бугам», «Маньчжур», «Баян» і інш.) нараджэння новага чалавека. Тэма Заходняй Беларусі ў творчасці. Адметнасць стылявой манеры М. Лынькова. Праца над раманам «На чырвоных лядах». «Малая» проза ваеннага часу (зборнік «Астап»). Вобразы дзяцей у творах («Васількі», «Салют» і інш.). Спроба шырокага эпічнага асэнсавання подзвігу народа ў рамане «Векапомныя дні». Багатая падзейная аснова твора, рэальныя прататыпы герояў. Месца рамана ў беларускай ваеннай прозе.

Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі, 1900–1944). Жыццёвы і творчы шлях. Старонкі «Дзённіка» К. Чорнага пра жыццё ў Маскве і на радзіме. Вобраз пісьменніка ў мастацкай літаратуры. Уплыў Чорнага на творчасць беларускіх празаікаў. Першыя публікацыі. Асаблівасці апавяданняў «маладнякоўскага» і «ўзвышаўскага» перыядаў. Творчае крэда пісьменніка: «Чалавек – гэта цэлы свет». Блізкасць першых раманаў «Сястра», «Зямля» да апавяданняў. Раманы ў ацэнцы крытыкі (М. Гарэцкі, А. Адамовіч, І. Чыгрын). Задума стварэння цыкла эпічных твораў пра гістарычны шлях народа. Арыгінальнасць мастацкай ідэі. Цікавасць празаіка да філасофскіх праблем. Здзейсненае і нязздзейсненае К. Чорным. Тэматыка, праблематыка, мастацкія асаблівасці, цэнтральныя вобразы раманаў «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне», аповесцей «Лявон Бушмар», «Люба Лук’янская». Сучаснае прачытанне «Трэцяга пакалення». Змены ў светапоглядзе пісьменніка ў 1930-я гг. Вяртанне К. Чорнага ў час Вялікай Айчыннай вайны да ідэі складанасці чалавечага свету. Вяршынныя творы пісьменніка – раманы «Млечны шлях», «Пошукі будучыні», «Вялікі дзень». Асэнсаванне сутнасці і вытокаў фашызму. Месца твораў у нацыянальнай літаратуры пра мінулую вайну. Асаблівасці стылю К. Чорнага.

*2. Літаратура Заходняй Беларусі*

Мінск і Вільня як два культурныя цэнтры Беларусі. Перадумовы і прычыны гэтага. Папулярнасць ідэі аб’яднання ў абедзвюх частках краіны. Грамадска-палітычнае жыццё на «крэсах усходніх». Этапы нацыянальна-

вызваленчага руху. Перыядычныя выданні на беларускай мове. Праца ў драматургіі 1920-х гг. Л. Родзевіча і Ф. Аляхновіча. «Віленскі» перыяд у творчасці М. Гарэцкага, У. Жылкі. Асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны, дзяржаўнасці народа публіцыстыкай (артыкулы Б. Тарашкевіча, А. Луцкевіча, А. Смоліча, М. Гарэцкага, Л. Родзевіча і інш.). Літаратурна-філасофскія эсэ І. Абдзіраловіча (І. Канчэўскага) «Адвечным шляхам», Сулімы (У. Самойлы) «Гэтым пераможаш!». Неаднароднасць літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі. Пашырэнне масавай паэзіі, літаратуры факта. Творчасць пісьменнікаў розных культурна-мастацкіх і ідэйных арыентацый, аб’яднаных ідэяй служэння Радзіме (З. Верас, К. Сваяка, Хв. Ільяшэвіча, А. Салагуба, Н. Арсенневай, М. Васілька, М. Машары, П. Пестрака і інш.). Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў паэзіі 1930-х гг. (творчасць М. Танка, М. Машары, М. Засіма, В. Таўлая і інш.).

## ПАЭЗІЯ 20-Х – 30-Х ГАДОЎ

Паэзія 20-х гадоў стылёва мазаічная, спектр яе матываў і ідэйна-вобразная палітра часта мелі палемічны характар. У паэзіі грамадзянскага гучання адлюстроўвалася не толькі сацыяльная і геапалітычная вектарнасць пазіцыі таго ці іншага паэта, але і літаратурная барацьба, якая набыла асабліва абвостраны характар у другой палове дзесяцігоддзя ў сувязі з расколам «Маладняка» і ўтварэннем новых літаратурных аб’яднанняў – «Узвышша», БелАПП, «Полымя». У аснове ідэйна-творчых размежаванняў ляжалі глыбокія, абумоўленыя грамадска-палітычнымі абставінамі прычыны, што замыкаліся на галоўнай ідэі – ідэі Беларускага Шляху, з якой пачалося для Беларусі ХХ ст. Цётцы, Янку Купалу, Якубу Коласу, Максіму Багдановічу, Алесю Гаруну належала пачэсная роля годнага пяснярскага служэння Бацькаўшчыне-Беларусі, ідэал якой для іх звязваўся з сацыяльным і нацыянальным вызваленнем, незалежнасцю, асветаю, самаахвярнай стваральнай працай на дабро і росквіт Айчыны. Галоўнымі фактарамі на шляху да гэтага ідэалу былі беларуская мова і нацыянальная самасвядомасць.

Паэзію 20-х гадоў тварылі некалькі пакаленняў: старэйшыя паэты-класікі, стваральнікі «нашаніўскага» адраджэння: Я. Купала, Я. Колас, Зм. Бядуля; тыя, хто пачаў фарміравацца да рэвалюцыі пад дабратворным уплывам «Нашай нівы», – Ц. Гартны, А. Гурло, Я. Журба, М. Хведаровіч; маладыя паэты, чыя творчая і грамадзянская свядомасць выспявала на скрыжаванні дзвюх вялікіх ідэй – нацыянальнага адраджэння і рэвалюцыйнага пераўтварэння свету. Гэта была лідэрская група паэтаў, заснавальнікаў «Маладняка», пазней «Узвышша», творчасць якіх была пастаянна ў цэнтры ўвагі чытачоў і крытыкі: У. Дубоўка, М. Чарот, А. Александровіч, А. Вольны, А. Дудар, Я. Пушча, У. Жылка, К. Крапіва, П. Трус, Т. Кляшторны, В. Маракоў, П. Глебка. Асаблівую ноту ў паэтычную сімфонію 20-х гадоў прыўносілі такія адметныя паэты, чый талент фарміраваўся ўнутры новых літаратурных аб’яднанняў («Маладняка», «Узвышша»), як С. Дарожны, М. Багун, Я. Туміловіч, У. Хадыка, Ю. Лявонны, А. Моркаўка, П. Шукайла, Я. Пфляўбаум, А. Звонак, М. Лужанін, Я. Бобрык, С. Фамін.

У агульных рысах развіццё паэзіі ў 20-я гады адбывалася ў дзвюх асноўных ідэйна-мастацкіх плынях, кожная з якіх адрознівалася сваімі стылёвымі парадыгмамі (традыцыйнай і авангардысцкай) і тэматычнымі дамінантамі: нацыянальна-адраджэнскай і пралетарска-рэвалюцыйнай. Абедзве плыні грунтаваліся на адпаведных грамадскіх ідэалагемах, кожная з якіх па-свойму прадвызначала сутнасныя мадэлі Беларускага Шляху, то судакранаючыся, то рэзка палемізуючы паміж сабой.

З другога боку, паэзія 20-х гадоў была пазначана відавочнымі рысамі афіцыёзнага авангардызму, звязанага найперш з устаноўкай на стварэнне

новага мастацтва пад уплывам рэвалюцыйна-пралетарскага светабачання і класавай ідэалогіі. Культ рэвалюцыйных перамен, аптымістычны жыццесцвярджальны пафас, матыў індустрыяльнага горада, гімн маладосці, якая будуе і для якой будуецца новае жыццё, класавы матыў, выражаны ў сімвалічнай перамозе «сярпа і молата», супрацьпастаўленне «мінулых чорных дзён» і новай «светлай раніцы волі» і пры гэтым ніякай рэфлексіі, смутку, сумненняў, ніякага самазаглыблення ў сваё асабістае «я», калі яно не звязана з адчуваннем прыналежнасці да вялікай пераможнай рэвалюцыйнай «мы – грамады», – вось асноўны спектр матываў і настрояў, якія ўласцівы авангардысцкай плыні, якую прадстаўлялі маладнякоўцы (паводле І. Багдановіч, рэвалюцыйны канцэптуалізм). Ім важна было стварыць літаратурны міф аб рэвалюцыйнай перамозе пралетарыяту. Першым тонкім майстравітым апалагетам *рэвалюцыйнага паэтычнага авангардызму быў Міхась Чарот*, талент якога ярка бліснуў ужо на пачатку 20-х гадоў. Яго першы паэтычны зборнік *«Завіруха» (1922), паэмы «Босыя на вогнішчы» (1922), «Беларусь лапцюжная» (1924), «Чырвонакрылы вяшчун» (1924) сталі ў поўным сэнсе «класікай авангарду»,* з усімі таленавіта ўвасобленымі пастулатамі пралетарска-рэвалюцыйнай дактрыны ў мастацтве – з яе апраўданнем тэрору («Хто не наш – таго даві!»), адмаўленнем культурнагістарычнай спадчыны («Годзе плакаць і вам над Рагнедаю...»), сімволікай класавай барацьбы ў выглядзе паядынку двух волатаў-«рацей» («змагаюцца праца з багаццем»). Характэрныя асаблівасці авангардысцкай паэтыкі вызначалі стыль рэвалюцыйнага канцэптуалізму ў творах іншых паэтаў, якія развівалі *пралетарска-рэвалюцыйны тэматычны накірунак.* Так, несумненна галоўным ён быў у паэзіі былога «капыльскага гарбара» *Цішкі Гартнага,* які выдаў дзве кнігі сваіх твораў *«Песні працы і змагання» (1922) і «Урачыстасць: 1. Рэвалюцыі, 2. Жыцця» (1925)*, куды часткова ўвайшлі яго ранейшыя вершы. Творы, з якімі Ц. Гартны ўступаў у новае дзесяцігоддзе, з’яўляліся ў пераважнай большасці паэтычнымі фармулёўкамі рэвалюцыйных камуністычных ідэалаў, з якімі для паэта і актыўнага грамадска-палітычнага дзеяча звязвалася светлая будучыня Беларускага Шляху.

*Купалу* ж будучыня бачылася трагічнай. Таму творчасць Купалы і яго зборнік *«Спадчына» (1922)* не прымаліся, крытыкаваліся адэптамі новага пралеткультаўскага мастацтва, у яго адрас даносіліся абвінавачванні ў неразуменні гістарычнай ролі рэвалюцыі для Беларусі. Для Купалы ж гэта былі відавочна несумяшчальныя ідэалы: вольная і незалежная Беларусь і гвалт рэвалюцыйнай дыктатуры. Ён празрыста акрэсліў гэтую несумяшчальнасць у *паэме «Безназоўнае»*, стварыўшы алегарычны вобраз заручын «вясельніцы засмучанай з вясёлым жаніхом».

*Я. Колас* у 20-я гады ўвасобіў свой боль па айчыне, спрадвечным аплотам якой была сядзіба з уласнай зямлёй, у закончанай тады паэме-

эпапеі *«Новая зямля».* Відавочным убачыўся вялікаму паэту вынік пошукаў Міхалам сваёй «новай зямлі». У гэтай алегарычнай метафары, якая падразумявала і пошукі «новай айчыны», або Беларускага Шляху, Коласам была скарыстана біблейская сімволіка. Новая зямля – гэта біблейскі сімвал новага раю – Новага Ерусаліма, які застаўся для Міхала няздзейсненай марай, перапыненай смерцю. Пошукі «новай зямлі» – новай Беларусі для героя Я. Коласа засталіся такімі ж «снамі аб Беларусі», якія «сніў» адпаведны гістарычнаму часу лірычны герой Я. Купалы. Як і Купала, *Я. Колас у 1922 г. выдаў зборнік вершаў «Водгулле»*, у якім апрача ранейшых дарэвалюцыйных твораў была нізка, напісаная ў 1921 г.: вершы *«Водгулле», «Родныя малюнкі», «У палёх Беларусі», «Звон шыбаў», «Цені-страхі», «Покліч», «Беларускаму люду».* Ствараючы жывыя пластычныя карціны беларускай прыроды – гэтай вечнай неўміручай каштоўнасці нацыянальнага быцця, Колас дае мастацкі водгук на тагачаснае грамадскае жыццё, якое бачыцца яму неўладкаваным і заганным. Паэт не спяшае падзяляць гартнаўскі імпэт і радасць, хаця нібыта рэвалюцыйная стыхія мусіла «парваць ланцуг» нядолі.

*Змітрок Бядуля выдаў у 1924 г. выбраныя вершы «Буралом».* Папярэдні ж зборнік «Пад родным небам» выданы, як і кнігі Я. Купалы «Спадчына», Я. Коласа «Водгулле», у 1922 г. Беларускім кааператыўна-выдавецкім таварыствам «Адраджэнне», быў пазначаны рысамі традыцыйнай адраджэнскай паэзіі з уласцівымі Бядулю містычнымі біблейнымі, гістарычнымі матывамі. Самастойнасць, незалежнасць Беларусі для Бядулі – неаспрэчная жыццёвая каштоўнасць.

Імкненнем да новага стылю была пазначана таксама паэзія аўтараў старэйшага пакалення, былых капыльскіх паплечнікаў Ц. Гартнага *Алеся Гурло і Міколы Хведаровіча,* у творах якіх сугучна часу адбіваліся «навальніцы жыцця і змагання», настроі «радасці неабсяжнай» ад «адважнай хады» «ў нагу з эпохай». Матывы іх лірыкі не вылучаліся асаблівай разнастайнасцю, былі сугучныя новаму «пралетарскаму» стылю. Яркае і таленавітае слова ў новых паэтычных формах з раскрыццём творчых індывідуальнасцей выпала на долю сказаць у 20-я гады плеядзе маладых паэтаў, чые творчыя індывідуальнасці раскрыліся ў пачатку і сярэдзіне дзесяцігоддзя. Плёнам іх арганізацыйнай дзейнасці стала ўтварэнне ў *1923 г.* маштабнага літаратурна-творчага аб'яднання *«Маладняк».* Сярод іх апрача М. Чарота вылучаліся *А. Александровіч, А. Вольны, У. Дубоўка, А. Дудар, К. Крапіва, Я. Пушча, В. Маракоў, Т. Кляшторны, П. Глебка, П. Трус, С. Дарожны* і іншыя маладыя песняры «новай будучыні» і новых настрояў. Агульнае ў іх паэзіі – гэта культ маладосці, якой належыць будучыня, захапленне жыццём, у якім з'явілася перспектыва ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Сутнасць літаратурнай палемікі пакаленняў, якая адпавядала ідэалагічнай

перамене ў разуменні Беларускага Шляху, акрэсліў маладнякоўскі *крытык Адам Бабарэка, вызначыўшы два асноўныя кірункі «адраджанізму» і «маладнякізму».* Гэтыя тэрміналагічныя наватворы не прыжыліся ў крытыцы і эстэтыцы 20-х гадоў, але яны адлюстроўвалі наяўнасць у тагачасным літаратурным працэсе дзвюх вызначальных ідэйна-стылёвых парадыгмаў, адна з якіх прадстаўляла *традыцыю*, а другая – *авангард.*

Калі *паэтычная апазіцыя А. Дудара, У. Дубоўкі, Я. Пушчы* ў другой палове дзесяцігоддзя была адкрытай і мэтанакіраванай, то ў іншых паэтаў адносіны да тагачаснай рэчаіснасці раздзяліліся на дзве плыні. Адны «ў нагу з часам» стараліся ўзмацніць сваю рэвалюцыйную прававернасць, парадніць яе з дарагім абліччам айчыны і ўласнымі пачуццямі, што было досыць няпроста для такіх значных паэтаў, як *П. Трус, В. Маракоў, Т. Кляшторны, але без асаблівага надрыву адчуваецца ў З. Бандарынай, М. Багуна, П. Шукайлы.* Прадстаўнікі другой плыні перажывалі эвалюцыю ад захопленага апявання «бунтарнай», новай, камсамольскай рэчаіснасці да адлюстравання стану расчараванасці, загубленых надзей, унутранага дыскамфорту. *У так званай «багемнасці» абвінавачвалі В. Маракова, Т. Кляшторнага, У. Жылку, А. Дудара, Ю. Лявоннага, Я. Пушчу,* якія нібыта адыходзілі ад грамадскіх праблем, замыкаючыся ў сваім унутраным свеце: апявалі «вясёлы разгул», «валанцужнічанне», эратызм, «чарку», хісталіся «ўбок» ад разумення вялікай гістарычнай місіі пралетарыяту.

Ва *«Узвышшы»* сцвердзіўся талент і такога ўнікальнага паэта, як *Кандрат Крапіва*, без трапнай і дасціпнай гумарыстыкі, з’едлівай і хлёсткай сатыры якога немагчыма ўявіць сабе паэтычную ніву 20-х гадоў. Аб’ектамі яго сатырычнага пяра з’яўляліся ўсе праявы тагачаснага жыцця: знешнія і ўнутраныя палітычныя падзеі («Сваты», «Белы “певень”», «Гаагская “каробачка”», «Ад пачосткі ныюць косткі»), маральна-этычная недасканаласць новага грамадства («Самагоначка», «Класавыя ворагі», «На мінскім скверы»), антырэлігійная барацьба («Годзе слухаць байкі», «Буду спекулянтам», «Як Антэк стрэў “вельканоц”», «Дзве кумы»), літаратурная палеміка («Нібы сатыра на нібы паэму – «Гвалт над формай»», «Прагулка на Парнас», «Муза падвяла», «Праборка музе», «Аб “буры і націску”», «К літаратурным спрэчкам»).

Адметным творчым почыркам вызначалася ў 20-я гады паэзія *Уладзіміра Хадыкі, Юркі Лявоннага, Аркадзя Моркаўкі, Янкі Туміловіча, Янкі Бобрыка, Алеся Звонака, Максіма Лужаніна, Сяргея Астрэйкі, Віктара Казлоўскага, Сяргея Фаміна.* Цікава заявілі пра сябе, але не раскрыліся ў поўнай меры або вычарпаліся такія паэты, як Апанас Атава, Язэп Падабед, Пятро Сяўрук, Пятро Росіч, Язэп Вазёрны, Юрка Бітус, Уладзімір Прыбыткоўскі, Язэп Сукала. Так выглядала стракатая паэтычная мазаіка 20-х гадоў, у якой суіснавалі розныя пакаленні творцаў, змагаліся непрымірымыя

светапоглядныя арыентацыі, спаборнічалі авангард і традыцыя, мажор і мінор, рыторыка рэвалюцыйных перамог і дынаміка працоўных будняў. А над усім гэтым узнімаўся трывожны і замілаваны спеў пра Айчыну, якой абяцалася зорная будучыня, вечны пакутлівы роздум пра Беларускі Шлях, што ўсцілаюць дзіды і церні.

У гісторыі развіцця *беларускай паэзіі 30-я гады* – перыяд складаны і трагічна цяжкі, як і ў самім грамадскім жыцці нашага народа. Цяпер усё глыбей ускрываюцца прычыны неспрыяльных абставін у тагачасным сацыяльна-палітычным жыцці, у засіллі таталітарнага рэжыму. У беларускай паэзіі, як і ўсёй літаратуры і культуры, былі няшчадна выцераблены, падсечаны пад корань вялікія жыццятворныя сілы. «У адзін дзень, – піша С. Грахоўскі, – 29 кастрычніка 1937 года, забілі Платона Галавача, Васіля Каваля, Анатоля Вольнага, Валерыя Маракова і Ізі Харыка. За што? Сагнаныя разам, у адной турме на нарах апынуліся У. Хадыка, З. Астапенка, А. Звонак, С. Грахоўскі, С. Шушкевіч, С. Ракіта, М. Багун, В. Шашалевіч, А. Розна, С. Знаёмы і многія іншыя.Яшчэ на парозе 30-х гадоў здарыліся арышты У. Дубоўкі, Я. Пушчы, А. Бабарэкі, трагедыя У. Ігнатоўскага, спроба самагубства Янкі Купалы.

У жыцці літаратуры таго часу адбылося некалькі значных падзей, якія не маглі роздумна не закрануць прагрэсіўную грамадскасць. Трагічны лёс А.С. Пушкіна, стагоддзе з дня смерці якога шырока адзначала краіна, прыкаваў увагу мастакоў слова, іх нялёгкія думкі аб трагічных лёсах паэтаў. Для беларускіх паэтаў класічнай школай творчай вывучкі станавіліся Пушкін і Лермантаў.

Трэба памятаць, што ў тых трагічных для нацыянальнай літаратуры акалічнасцях зусім на супрацьлеглым полюсе, на кругах рэпрэсіўнага пекла пачынала зараджацца ў скупых балючых радках, бязмежна далёкіх ад ідылічнасці і прыстасавальнасці, «запісаная» часцей за ўсё ў памяці паэзія, ці дакладней – яна зарубцоўвалася ў жахлівых фактах, патэнцыяльна назапашвалася, каб у сумленным слове стаць потым цяжкім *мастацкім сведчаннем злачынстваў таталітарнай сістэмы (У. Дубоўка, Я. Пушча, С. Грахоўскі, А. Звонак, С. Шушкевіч, П. Пруднікаў).* Вернецца развярэджанай памяццю да сваіх закатаваных сяброў З. Астапенкі і Ю. Таўбіна эпічны талент *А. Куляшова.*

Незваротнасць страт у 30-я гады не магла не адкладвацца негатыўна на патэнцыяле мужнага роздуму і духу многіх наступных пакаленняў. І ўсё ж родная зямля не хацела скупіцца з нараджэннем новых талентаў. У паэзію 30-х гадоў прыходзілі новыя імёны – *П. Панчанка, Ф. Куляшоў, М. Танк, А. Русецкі, К. Кірэенка, М. Калачынскі, М. Аўрамчык, А. Вялюгін* – тыя, каму неўзабаве суджана было праз агонь і новыя выпрабаванні несці місію паэтаў франтавога пакалення.

# БЕЛАРУСКАЯ ПРОЗА 20-Х – 30-Х ГАДОЎ

## Апавяданне 20-х гадоў

У «нашаніўскі перыяд» проза пачала ўсведамляцца як адзін з тыпаў нацыянальнай літаратуры, раўнапраўны з паэзіяй. У 20–30-я гады адбывалася яе далейшае станаўленне і развіццё, разгортванне і станаўленне яе ўнутраных мастацкіх магчымасцей, узбагачэнне яе ў жанравых і стылявых адносінах. Пачынаючы з сярэдзіны 20-х гадоў проза паступова займае вядучае становішча ў мастацкай літаратуры, на першы план выходзяць такія яе жанры, як раман і аповесць.

Мастацкая эвалюцыя беларускай прозы адбывалася на фоне росквіту паэзіі ў пачатку ХХ ст. Аднак вонкавае падабенства прозы з паэзіяй, якое выяўлялася найперш у блізкасці рытмічна-інтанацыйнай пабудовы, паступова пераадольвалася ўжо ў творчасці Ф. Багушэвіча, Цёткі, Ядвігіна Ш., Я. Коласа, З. Бядулі, М. Багдановіча, М. Гарэцкага. Уласцівае беларускаму менталітэту паэтычнае ўспрыманне свету з часам выявілася ў павышанай цікавасці да духоўнага жыцця чалавека, да яго пачуццяў і ідэй, мараў і мэтаў. Першыя спробы тэарэтычна ўсвядоміць месца мастацкай прозы ў нацыянальным жыцці народа належалі М. Багдановічу і М. Гарэцкаму. Менавіта М. Гарэцкі востра адчуў, што наступным крокам у эстэтычным руху беларускай літаратуры будзе з'яўленне буйных празаічных твораў, якія шмат у чым вызначаць шлях духоўнага развіцця нацыі на новым гістарычным этапе: «Ці не пара б нашым пісьменнікам напісаць што даўжэйшае?

Ці не дадуць нам к дзесяцілеццю «Наш[ай] нівы» нашы літаратары добры раман? Хаця б з сучаснага жыцця раман? Аб тым, як трухлее старое і патроху, у муках, расце маладое? А можа б, якую гістарычную повесць, драму?..

Прозы, прозы, добрай, мастацкай прозы беларускай дайце нам!»

Пасля ўзнікнення ў пачатку 20-х гадоў першых беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісаў («Маладняк», «Узвышша», «Полымя»), свайго рэспубліканскага выдавецтва магчымасці друкаваць празаічныя творы прыкметна пашырыліся. Менавіта ў гэты час выходзяць многія зборнікі апавяданняў, першыя аповесці і раманы, мастацкая проза пакрысе вызваляецца ад уплыву верша і ператвараецца ў самастойную эстэтычную з'яву, якая мае свайго чытача і крытыку.

У ранні перыяд беларускай паслярэвалюцыйнай літаратуры на першым плане знаходзілася апавяданне, якое безумоўна пераважала над іншымі празаічнымі жанрамі. Небывалая інтэнсіўнасць духоўнага жыцця нацыі ў 20-я гады, узрушанага сусветнай вайной і сацыялістычнай рэвалюцыяй,

шпаркая змена падзей адкрылі перад апавяданнем вялікую перспектыву развіцця.

Перш чым падступіцца да паказу сучасных падзей, мастацкая проза павінна была падвесці рахункі з мінулым. Натуральна, што гэту задачу ўзялі на сябе **прадстаўнікі старэйшага пакалення, такія як Я. Колас, З. Бядуля, Ц. Гартны, М. Гарэцкі.** Менавіта ў апавяданнях, прысвечаных развітанню са старым светам, выразна выявіліся першыя зрухі ў мастацкай свядомасці і пазначыўся напрамак эстэтычнага руху. Калі ў апавяданні «Смерць пані» (1919) **З. Бядулі** сцвярджалася думка, што панства як грамадская сіла стала папярок самой гісторыі і павінна знікнуць нават фізічна, то ў апавяданні «Бондар» (1920) увага пераакцэнтоўвалася на роздум аб месцы творцы ў новым свеце. Майстэрства бондара Данілы, узведзенае ў ранг сапраўднага мастацтва, непатрэбнае адарваным ад жыцця народа вышэйшым класам. У апавяданні «Бондар» З. Бядулі ў алегарычна-палемічнай форме былі пазначаны духоўныя арыенціры новага мастацтва, неабходнасць і гістарычную наканаванасць прыходу якога добра адчуваў пісьменнік.

Захоўваючы творчыя набыткі ранейшага часу, уменне тыпізаваць малюнкі і з’явы рэчаіснасці, ствараць яскравыя вобразы людзей з народа, рабіць адпаведныя гуманістычныя высновы, апавядаць пра складанае простымі словамі і ў той жа час пазбягаць прастамоўя, празаізмаў і дыялектызмаў, паслядоўна і займальна разгортваць сюжэт, будаваць дыялогі, а часам выкарыстоўваць маналогі і прыёмы псіхалагічнага аналізу, Я. Колас, З. Бядуля, Ц. Гартны, М. Гарэцкі ў новых сваіх творах імкнуліся спасцігнуць логіку гістарычнага прагрэсу, эстэтычна асвоіць глыбіні народнага існавання.

Сваім шляхам у асэнсаванні мінуўшчыны і ўзбагачэнні апавядальнага жанру ішоў **М. Гарэцкі**. У яго апавяданнях «Тамашы», «Злосць», «Досвіткі», «Памылка» (1920), «Дурны настаўнік», «Смачны заяц», «Страшная музыкава песня», «У панскай кухні» (1921) сюжэт будуецца на дакументальным матэрыяле, аповедаў з «часоў паншчыны».

Вядомы нашаніўскі матыў твораў пра паэта і паэзію, песняра, музыку, гусляра, скрыпача, дудара набыў у М. Гарэцкага актуальнае гучанне: беларуская літаратура заўсёды служыла працоўнаму народу, яго Адраджэнню, яму аднаму аддавала сябе і сваю чыстую душу.

Апавяданне 20-х гадоў, знаходзячыся на мяжы дзвюх літаратурных эпох, непазбежна было вельмі супярэчлівым па свайму ідэйнаму зместу і стылявому малюнку. Кожны беларускі празаік у адпаведнасці з уласнымі мастацкімі здольнасцямі і творчымі задумамі лічыў за абавязак узбагачаць празаічнае слова за кошт новых фарбаў і адценняў, беручы за прыклад не толькі народнае апавяданне, але і эстэтычныя здабыткі класікаў сусветнай літаратуры, актыўна выкарыстоўваючы пры гэтым біблейскую праблема-

тыку і паэтыку. У апавяданнях **Ц. Гартнага** пачатку 20-х гадоў, якія пазней увайшлі ў зборнік «Трэскі на хвалях» (1924), напрыклад, адчуваўся моцны ўплыў сацыялістычнай ідэалогіі, уласцівай яму як аднаму з яе актыўных прапагандыстаў. Пісьменнік раней за іншых развітаўся з мінулым, адмовіўшыся яшчэ ў дарэвалюцыйны час ад традыцыйнай вясковай тэматыкі і стварыўшы вобраз перадавога рабочага. Адным з першых у беларускай прозе ён паказаў чырвонаармейца («За свабоду», 1918) і камуніста («Загадзе», 1920). Аднак перавага ідэалагем у мастацкай творчасці не прыводзіла да поспехаў у сферы эстэтыкі, як уяўлялася ў савецкія часы многім пісьменнікам партыйнай ангажаванасці. Наадварот, палітыка выцясняла з літаратуры праўду, дабро і хараство, а сацыялогія падмяняла псіхалогію. Малюнкі мінулага ў апавяданні Ц. Гартнага «На руінах» (1923), узноўленыя ў памяці былым чырвонаармейцам Несцерам Грэбенем, уведзены ў твор не з мэтаю раскрыць унутраны свет галоўнага героя, а з мэтаю сцвердзіць ідэю рэвалюцыйнага змагання за новае жыццё. Вобраз руінаў у апавяданні Ц. Гартнага нясе ў сабе глыбокі сімвалічны і філасофскі сэнс: толькі зруйнаваўшы стары свет, трэба пачынаць пабудову новага, даць прастору для творчасці.

Як палітычны дзеяч Ц. Гартны спавядаў ідэі рэвалюцыйнай ломкі жыцця, а як таленавіты мастак слова і сумленны чалавек спрабаваў натуральна спалучыць у сваёй творчасці традыцыйнае і наватарскае.

Своеасаблівую інтэрпрэтацыю ў зборніку «Трэскі на хвалях» (1924) атрымлівае вядомае ў 20-я гады выслоўе, якое нездарма любіў паўтараць І. Сталін: «Лес сякуць – трэскі ляцяць». Маўляў, людзі – трэскі, ахвяры непазбежныя ў рэвалюцыйным змаганні, а таму гуманістычныя адносіны да асобнага чалавека павінны разглядацца з улікам пануючай ідэалогіі, якая аддае перавагу агульнаму перад прыватным. Ц. Гартны і ў сваёй грамадскай дзейнасці, і ў сваёй мастацкай творчасці спавядаў актыўнае стаўленне да жыцця, гераізаваў «новых людзей», якія не маглі ўявіць сябе бязвольнымі «трэскамі» на бурных хвалях рэвалюцыйнай рэчаіснасці і імкнуліся быць свядомымі ўдзельнікамі падзей.

Актуальная праблематыка, новы герой, матэрыял рэвалюцыйнай рэчаіснасці, уведзеныя пісьменнікам у беларускую літаратуру, прыкметна змянялі старую форму апавядання, традыцыйнага апісальніцтва, стылявой аднастайнасці. Аднак для сапраўднай літаратурнай творчасці аднаго захаплення сацыялістычнай ідэалогіяй і партыйнай фразеалогіяй, нават самага шчырага, было ўсё ж замала. Патрэбна была больш трывалая жыццёвая, філасофская, эстэтычная аснова, на якой можна было ствараць новае мастацтва.

**Я. Колас** хоць і рэдка звяртаўся ў 20-я гады да жанру апавядання, але сцвярджаў сваёй творчасцю ідэю пераемнасці літаратурных традыцый.

Пісьменнік, па сутнасці, не ведаў у сваёй творчай эвалюцыі рэзкіх перарываў або перападаў: эпічная плынь паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка», над якімі ён працаваў больш за дзесяцігоддзе, плаўна «перацякла» ў новы час. І гэта з'ява не была толькі вонкавай, безадноснай да літаратурнага працэсу, але і глыбока сутнаснай, змястоўнай. Не адмаўляючыся ад гуманістычнай спадчыны мінулага, ад напрацаванага творчага вопыту, Колас чула ўслухоўваўся ў гукі новага жыцця, рабіў подступы да вырашэння эстэтычных задач, прадыктаваных часам, а ў выніку паступова ўзбагачаў сваімі мастацкімі знаходкамі беларускую літаратуру, у тым ліку і жанр апавядання. Пазбаўленая вонкавых эфектаў, далёкая ад ідэалагічнай рыторыкі, уласцівай 20-м гадам, **«малая проза» Коласа** не адразу звярнула на сябе ўвагу крытыкі. Між тым такія апавяданні Коласа, як «Сяргей Карага», «Дачакаўся», «Крывавы вір» (1923), адкрывалі перад беларускай прозай новыя ідэйныя і эстэтычныя далягляды. Але крытка ацэньвала гэтыя творы досыць стрымана як «зарысоўкі паасобных эпізодаў з часу грамадзянскай вайны», не заўважаючы ў іх глыбокай гуманістычнай праблематыкі, ад вырашэння якой шмат залежала ў далейшым гістарычным руху народа і ў паступальным развіцці новай беларускай прозы.

Востра праблемным з'яўляецца апавяданне «Крывавы вір», у якім прасочваецца імкненне паглядзець на рэвалюцыйныя падзеі з пункту погляду гуманізма. Калі рэвалюцыя – стыхія, а ў крывавым віры нянавісці і жорсткасці гінуць ідэі, дзеля якіх і распачыналася гэта рэвалюцыя, то ўсё ў выніку пазбаўляецца чалавечага сэнсу. У апавяданні яскрава паказана атмасфера руйнавання старога свету, а разам з ім і ўсяго, што звязана з мінулым. Гэты твор і іншыя апавяданні Коласа гэтага часу не атрымалі чаканага водгуку ў тагачасным грамадстве, але пісьменнік і не спадзяваўся на неадкладную рэакцыю сучаснікаў, адрынутых падзеямі ў маральным развіцці далёка назад.

Настойлівае імкненне абнавіць жанравую форму апавядання прадэманстравалі маладыя пісьменнікі, якія папоўнілі шэрагі беларускіх літаратараў у пачатку 20-х гадоў. Пафас абнаўлення рэчаіснасці, змен у этыцы і эстэтыцы, стварэння «новага чалавека» быў уласцівы ў той ці іншай ступені **К. Чорнаму, М. Зарэцкаму, К. Крапіве, М. Лынькову, Р. Мурашку, В. Кавалю, П. Галавачу, Я. Скрыгану, Я. Нёманскаму, М. Нікановічу** – аўтарам, якія выявілі сябе і свой талент найперш у жанры апавядання. Заяўленае ў ваяўніча-дэкларатыўнай форме адмаўлення ад «спадчыны мінулага», адмежаванне ад традыцый «нашаніўства», якое садзейнічала самасцвярджэнню «маладнякоўцаў», на практыцы прыводзілі да пазёрства, прэтэнцыёзнасці, спрашчэнства, а ў выніку і да адрыву ад жыцця. Дарэчы, не хто іншы, як менавіта Я. Колас, па-настаўніцку мудра, у жанры празаічнага жарту цёпла паўшчуваў беларускіх «авангардыстаў», справядліва адносяча-

чы многае ў іх паводзінах на кошт нявопытнай і дзёрзскай маладосці (алегарычная казка «Купальскія светлякі»). Найбольш таленавітыя і сумленныя з «маладнякоўцаў» хутка адолелі хваробу левізны ў эстэтыцы і выпрацавалі імунітэт ад павярхоўнай паэтызацыі рэчаіснасці і ўсяго «новага» ў ёй, ад саманадзейнага жадання стварыць невядомую свету «пралетарскую літаратуру», ад дэкларатыўнасці і эстэтычнага нігілізму.

**«Маладнякоўскае» апавяданне** было ўсяго момантам у працэсе станаўлення і развіцця беларускай прозы, але шмат дало для разумення прыроды празаічнага слова. Своеасаблівымі стылявымі прыкметамі гэтага апавядання былі запазычаныя ў паэзіі метафарызм, штучная пафаснасць, напружаная эмацыянальнасць, павышаная ўвага да гукапісу, рытмізаванасць мовы, схільнасць да інверсіі ў пабудове фразы і інш. Пашыранымі жанрамі з’яўляліся імпрэсіі, эцюды, замалёўкі, прозавершы, эскізы. Даніну «паэтычнай» прозе, абстрактным вобразам, касмізму светаадчування, рубленай фразе аддалі так ці інакш амаль усе маладыя празаікі: А. Бабарэка («Каля балота», «Цёмнаю ночкай», 1923), М. Зарэцкі («Камсамолка», «Пела вясна», 1925), В. Каваль («Маёвым вечарам», «Шапаціць пажоўклае лісце», 1926), Б. Мікуліч («Восень бродзіць», 1927; «Музыка», «Тэма і варыяцыі», 1928), М. Нікановіч («Песні вясны», «У хвалях жыцця», 1925; «Крык працы», 1926; «Залатыя званочкі», 1927), К. Чорны («Будзем жыць», 1924; «Радасць жанчыны», «Срэбра жыцця», «Восень і радасць», 1925). Мастацкі эксперымент, фарматворчасць, стылявыя вышукі былі спосабам выказвання сваёй ідэйнай пазіцыі і эстэтычнай арыентацыі.

У **К. Чорнага**, пісьменніка філасофскага складу, схільнага не толькі да вонкава-дакладнага ўзнаўлення рэчаіснасці, але і яе глыбокага аналітычнага асэнсавання, пошукі новага слова прыкметныя нават у назвах апавяданняў. Адзін з ранніх яго твораў так і называецца «Новыя людзі» (1925). Новыя людзі – часцей за ўсё прадстаўнікі маладога пакалення, перад якімі адкрыліся далягляды «людской маладой жыццёвай радасці». Небывалы энтузіязм гэтых людзей празаік спяшаўся выявіць з дапамогай рытмізаванай, фрагментарнай прозы, з уласцівай ёй дынамікай апавядання, музычнасцю фразы, эмацыянальна-экспрэсіўнай насычанасцю слова, імпрэсіянізмам замалёвак. Некаторыя абразкі і эцюды вонкава нагадваюць верлібр («Восень і радасць», «Срэбра жыцця»). Усё ў творах маладога Чорнага поўніцца асаблівым, таямнічным сэнсам, асацыятыўна нагадвае пра нешта большае, чым утрымлівае ў сабе апісаная з’ява, прадмет, вобраз. Гэта намёк на нешта вельмі істотнае, што тоіцца ў глыбінях навакольнага свету, у самой атмасферы, якая пануе ў прыродзе, у нетрах чалавечай псіхалогіі. Нездарма Чорны пазней жартаваў, што ў яго ранніх апавяданнях вясковыя хаты не проста стаялі, але і «думалі». І такіх прыкладаў паэтычнага пераўвасаблення ў яго «маладнякоўскай» прозе вельмі шмат. У Чорнага за па-

чуццём захаплення жыццём («жыццё як радасць існавання») заўсёды прысутнічае вялікая думка пра чалавека. Набліжэнне да галоўнага аб'екта літаратуры, якім з'яўляецца чалавек, наглядна паказала складанасць, а часта і супярэчлівасць яго натуры, думак, поглядаў, паводзін. Менавіта разуменне складанасці жыцця вызначала ў сярэдзіне 20-х гадоў характар і стан мастацкай свядомасці не толькі маладых, але і сталых празаікаў.

Моладзь аддавала перавагу героіцы, эфектам, рэвалюцыйнай рамантыцы, таму такую папулярнасць набылі ў 20-я гады творы, пабудаваныя на займальным, прыгодніцкім сюжэце («Свінапас» М. Чарота, 1923; «Два» А. Вольнага, 1924; «Юркава ноч» А. Бабарэкі, 1925; «Адплаціў» М. Нікановіча, 1927). Так засвойвалася майстэрсва сюжэтапабудовы, мастацкай дэталі, уменне паказаць героя ў дзеянні, так ствараўся жанр беларускага «вестэрна», напоўненага непраўдападобнымі прыгодамі, авантурамі, пераапрананнямі, спасылкамі на збег акалічнасцей. Не абышлося без пэўных накладак, бо бальшавіцкія ідэалагемы навісалі над свядомасцю маладых аўтараў: герой найчасцей быў выхадцам з пралетарыяту, у горшым выпадку – з бядняцкіх слаёў, ледзь не з дзяцінства з'яўляўся свядомым змагаром, выключнаю натураю. Складаныя жыццёвыя сітуацыі ў прыгодніцкіх апавяданнях міжволі спрашчаліся, заблытаныя калізіі вырашаліся павярхоўна.

У апавяданні **М. Зарэцкага** «Адна партыя ў шашкі» (1924) учынак чырвонага камандзіра Аснача, які застрэліў белага афіцэра, калі той выйграў у яго партыю ў шашкі, тлумачыцца ўжо не яго псіхалагічным станам, а агульным станам грамадства, падзеленага вайной на два варожыя лагеры. Майстар вострага, займальнага канфлікту, дэтэктыўнага сюжэта, М. Зарэцкі імкнуўся да праўдзівасці ў паказе жыцця і шукаў адэкватныя матэрыялу формы. Апавяданне «42 дакументы» цалкам складаецца з афіцыйных дакументаў, анкет, пратаколаў, тэлеграм, зваротаў, хронікі, загадаў, запісак. Мастацкае апавяданне «пад дакумент» вытрымана ў гэтым ключы да канца, дзе змяшчаецца некралог, які паведамляе пра смерць галоўнага героя Ігната Гронскага.

У сярэдзіне 20-х гадоў у жанры апавядання больш выразнымі сталі прыкметы мастацкага пасталення. Маладыя празаікі з большай увагай і павагай сталі вывучаць творчы вопыт класікаў беларускай і сусветнай літаратур. У выніку менш стала паэтызмаў і стылявых упрыгожванняў, аптымістычнае светаадчуванне выяўлялася ўсё часцей ускосна, з дапамогаю прыёмаў і прынцыпаў, уласцівых празаічнаму маўленню. Мастацкая проза набліжаецца да жыццёвай праўдзівасці. Празаікі ўсё больш увагі аддавалі псіхалагічнай распрацоўцы сюжэта і характару, мастацкаму аналітызму.

Асабліва шмат для таго, каб проза стала прозай ва ўласным сэнсе, зрабіў К. Чорны. Эпічны талент празаіка вельмі хутка вырас з «лірычнай прозы». Ужо ў ранніх апавяданнях яго заўважалася імкненне асэнсоўваць

рэчаіснасць па-філасофску глыбока і сістэмна («Ліст Якуба Малькевіча», «Справа Віктара Лукашэвіча», «Нянавісць», «Спатканні з васпаватым чалавекам» (1929).

Апавяданне 20-х гадоў пашырала свае мастацкія магчымасці таксама за кошт засваення новай тэматыкі, стылістыкі, вобразнасці. Крытыцызм псіхалагічнай прозы ў апавяданнях Я. Коласа, К. Чорнага, К. Крапівы натуральна спалучаўся з сатырычнай плынню, якая прыкметна памацнела ў канцы дзесяцігоддзя, бо памацнеў і татальны наступ ідэалогіі на апошнія свабоды грамадзян. Па сутнасці, у сатырычных творах паказваліся тыя самыя з’явы, што і ў эпасе, аднак вырашаліся творчыя задумы з дапамогай сатыры. У пачатку 20-х гадоў пераважала фіксацыя смешных бакоў «новага свету» («У двары пана Тарбецкага» (1926) Я. Коласа, «Вясковая ветэрынарыя» (1924), «Мяшчане ў густой пары» (1926) К. Чорнага, «Кнак» (1928) П. Галавача, «На полі» М. Нікановіча, «Людзі-суседзі» (1925), «Каровін мужык» (1923), «Мой сусед» (1927), «Вайна» (1927), «Певень» (1927), «Хвост» (1928) К. Крапівы). У сатырычных жанрах фельетона, гумарэскі, жарту выступалі празаікі розных стылявых напрамкаў: Колас і ў гумары заставаўся бытапісальнікам і эпікам, Чорны схіляўся да псіхалагічнага аналізу, Крапіва аддаваў перавагу саркастычнай усмешцы. У сатырычных апавяданнях выяўляўся цвярозы народны погляд на рэчы, эстэтычны і этычны ідэал народа.

Асобнае месца ў прозе 20-х гадоў занялі «Сібірскія абразкі» М. Гарэцкага, якія толькі часткова друкаваліся ў 1928 г. Блізкія ў жанрава-стылявых адносінах да іх апавяданні, якія пісьменнік меркаваў уключыць у зборнік «Люстрадзён» (1929–1930). Гэта сапраўды абразкі, каляндарныя запісы, падарожны рэпартаж, нататкі, замалёўкі, імпрэсіі, аформленыя аўтарам як завершаныя апавяданні. Так у беларускай літаратуры замацоўвалася новая праблематыка – сібірска-беларуская, эмігранцкая. *«Сібірскія абразкі» поруч з «Абразкамі» З. Бядулі адначасова пашыралі жанравы дыяпазон апавядання:* побач з манументальным эпасам і паглыбленай псіхалагічнай прозай з’яўлялася проза эсэістычная, глыбока індывідуальная, суб’ектыўная, чулая, памятлівая на шматлікія падрабязнасці вялікай эпохі.

У другой палове 20-х гадоў у літаратуру ўвайшлі новыя празаічныя таленты – **М. Лынькоў, В. Каваль, С. Баранавых, Б. Мікуліч, Р. Мурашка, Я. Нёманскі, Х. Шынклер**. У апавяданнях гэтых пісьменнікаў маладнякоўская «паэтычная проза» набыла сваё новае дыханне. Узбагачаныя эпічным і псіхалагічным вопытам празаікаў, якія гуртаваліся вакол часопісаў «Полымя» і «Узвышша», многія з апавяданняў прадстаўнікоў новай літаратурнай генерацыі прыкметна ўзбагацілі беларускае празаічнае маўленне. Так, **М. Лынькоў** здолеў адшукаць своеасаблівую «залатую сярэдзіну» паміж рамантызмам і рэалізмам: сінтэз гэтых двух мастацкіх на-

прамкаў у апавяданнях «Над Бугам» (1927), «Манчжур», «Андрэй Лятун» (1928) вельмі арганічны, бо сам рамантычны парыў уласцівы героям гэтых твораў. Празаік выкарыстоўвае шырока і смела метафорыку, эфектныя параўнанні, лірычна-ўсхваляваную інтанацыю, інверсію. У тых выпадках, калі пафас дасягае небяспечных вяршынь, М. Лынькоў звычайна выкарыстоўвае мяккі, добразычлівы гумар, з дапамогай якога вяртае давер чытача, шчырасць, непасрэднасць, праўдзівасць аўтарскага апавядання. М. Лынькоў увёў у літаратурны ўжытак як нешта вельмі натуральнае *рабочую тэматыку*: жыццё беларускіх чыгуначнікаў узнаўляецца ў яго творах у рамантычным арэоле. Гэта ўжо не «жалезныя людзі» (К. Чорны) першай паловы 20-х гадоў, а сапраўды «жывыя людзі», духоўна багатыя і развітыя.

На працягу 20-х гадоў у беларускім апавяданні ўмацоўвалася рэалістычная традыцыя, якая ўскладнялася і ўзбагачалася за кошт творчага засваення набыткаў іншых родаў і жанраў літаратуры. Асабліва шмат узяло апавяданне ад паэтычнага ўспрымання свету, уласцівага беларускаму менталітэту. Сентыменталізм, рамантызм, натуралізм, мадэрнізм – апавядальнікі гэтага дзесяцігоддзя прайшлі праз спакусы самых розных літаратурных напрамкаў, стыляў, школ. Менавіта ў гэты перыяд былі створаны класічныя ўзоры беларускага апавядання, на якія арыентавалася і арыентуецца пазнейшая проза.

### Аповесць і раман

Гісторыя беларускай аповесці і рамана ствралася не на голым месцы. Прыкметы эпасу лёгка заўважаліся ў паэме, вершаваных апавяданнях В. Дуніна-Марцінкевіча, У. Сыракомлі, Я. Лучыны, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа. Гэта – паслядоўнае выкладанне падзей як правобраз празаічнага сюжэта; наяўнасць постаці апавядальніка, які арганізуе вобразную сістэму твора, не толькі выкладае падрабязнасці таго, што адбываецца, але выкарыстоўвае пры гэтым апісанні, лірычныя, публіцыстычныя і філасофскія адступленні; выкарыстанне дыялога, маналога, прамой і няўласна-прамой мовы, празаізмаў, часам дыялектызмаў, прастамоўя, «мовы вуліцы».

Першыя падступы да рамана рабіліся ў жанры аповесці, «сярэдняй» форме эпічнай прозы. *Раман Ц. Гартнага «Сокі цаліны» (1916–1929)* нездарма друкаваўся асобнымі часткамі: цэласнае дзеянне, рух сюжэта, храналагічная паслядоўнасць падзей, што з'яўляецца адной з прыкмет рамана, былі немагчымымі таму, што само жыццё не давала адказу на гэтыя пытанні.

Прыкметы мыслення «аповесцямі» выразныя ў першых дзвюх частках *трылогіі «На ростанях» Я. Коласа* – «У палескай глушы» (1922) і «У глыбі Палесся» (1927). Яшчэ ў 1949 г., калі ішла праца над апошняй часткай «На ростанях», гэтыя творы выходзілі асобным выданнем менавіта як

аповесці. Рысы «раманнага» эпасу тут выявіліся ў аўтабіяграфізме, хранікальнасці, «прывязанасці» падзей да постаці галоўнага героя.

Станаўленне беларускага сацыяльна-гістарычнага рамана адбывалася ў складаных грамадскіх умовах, калі на творчую свядомасць пісьменніка ўсё мацней уплывала афіцыйная канцэпцыя гістарычнага развіцця. Асабліва моцным быў гэты ўплыў у творчасці пісьменнікаў, якія па свайму светапогляду былі блізкімі да камуністычнай ідэалогіі і міжволі падпарадкоўваліся зменлівай кан'юнктуры. Ц. Гартны як адзін з актыўных будаўнікоў «новага жыцця» ахвотна адгукнуўся на «сацыяльны заказ» часу і ў рамане «Сокі цаліны» імкнуўся стварыць вобраз рабочага, прафесійнага рэвалюцыянера, свабоднага ад інтэлігенцкай рэфлексіі і цалкам захопленага ідэяй перабудовы свету.

Сюжэтныя рамкі беларускага эпасу істотна пашырала *«маладнякоўская аповесць», якую стваралі М. Чарот, А. Вольны, А. Александровіч, А. Дудар, М. Нікановіч, Я. Нёманскі, Р. Мурашка.* У прозе маладнякоўцаў паказаныя сутыкненні персанажаў прыкметна ідэалагізуюцца, у скразное дзеянне ўцягваюцца сцэны і эпізоды, якія, паводле задумы, павінны ілюстраваць ходу самой гісторыі.

Своеасаблівым узорам твораў пра «новага чалавека», эталонам «новай літаратуры» служыла аповесць *М. Чарота «Свінапас» (1924*). Аўтар паказаў сацыяльна актыўнага галоўнага героя, сялянскага хлопца Грышку-свінапаса, які становіцца «атаманам» і ўвасабляе ідэю народнага змагання за новае жыццё. Узнаўляючы бурную атмасферу эпохі, М. Чарот актыўна выкарыстаў прыём мантажу асобных эпізодаў, адкрыты ў 20-я гады кінематографам: аповесць нездарма стала сцэнарыем для *першага беларускага мастацкага кінафільма «Лясная быль» (1926).*

Блізкія да аповесці М. Чарота авантурна-прыгодніцкія творы *А. Вольнага «Два» (1925) і «Ваўчаняты» (1925), напісаныя ім у сааўтарстве з А. Александровічам і А. Дударом.* Тут таксама пераважае «рэвалюцыйная рамантыка», сюжэт грунтуецца на вострай сацыяльна-класавай калізіі.

У другой палове 20-х гадоў у друку з'явіліся аповесці і раманы *С. Баранавых, В. Каваля, Л. Калюгі, Р. Мурашкі, Я. Маўра, Я. Нёманскага, Я. Скрыгана, С. Хурсіка, Х. Шынклера*, якія таксама адыгралі сваю ролю ў станаўленні беларускага празаічнага эпасу.

Адной з прыкмет эстэтычнага пасталення беларускага рамана з'ўлялася ўзнікненне і развіццё новых яго жанравых разнавіднасцей. *Сінтэз мастацкасці і дакументальнасці ўпершыню* ў беларускай літаратуры адбыўся *ў прозе М. Гарэцкага.* Ужо ў аповесцях *«Меланхолія»* (1916–1921, 1928) і *«Ціхая плынь»* (1917–1930) аўтабіяграфічны ў сваёй аснове матэрыял напоўнены эстэтычным зместам. Аўтар стварыў вобраз беларуса, інтэлігента ў першым пакаленні, які спалучае ў сабе памяць пра сваё «ніз-

кае» паходжанне і парыў да высокай духоўнасці. Давер да жывога жыцця, спавядальнасць і творчая арыентацыя на сусветныя ўзоры прозы натуральна выявіліся ў аповесці *«На імперыялістычнай вайне»* (1926), жанр якой сціпла абазначаны аўтарам як «запіскі салдата». Узмацненне эпічных тэндэнцый у творчасці пісьменніка выявілася ў імкненні стварыць арыгінальны сінтэз летапіснай традыцыі і найноўшых мастацкіх адкрыццяў у еўрапейскіх літаратурах.

Беларуская проза другой паловы 20-х гадоў напоўнена прароцтвамі, папярэджаннямі, трывогай за будучыню, што выявілася ў распаўсюджванні сатырычных жанраў. *Сатырычныя інтанацыі выразна гучалі ў многіх творах гэтага часу Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі, К. Крапівы, К. Чорнага, М. Зарэцкага, М. Лынькова, А. Мрыя, Л. Калюгі, В. Каваля.*

**Апавяданне 30-х гадоў** па сваёй жанравай прыродзе мала чым адрознівалася ад апавядання 20-х гадоў. Набыты за папярэднія перыяды вопыт дазваляў пазбягаць наіўнасці і прымітывізму, шырока выкарыстоўваць творчыя набыткі ў розных жанравых формах – ад замалёўкі і імпрэсіі да прыгодніцкага апавядання і псіхалагічнага даследавання. Аднак апавяданне ў гэты час стваралася ў іншых грамадскіх умовах, якія стымулявалі пісьменнікаў да палітычнай дзейнасці, але мала спрыялі сапраўднаму творчаму пошуку. Калі да гэтага кіруючая ідэалогія выказвалася за свабоднае спаборніцтва розных груповак і плыней у літаратуры, дэкларавала сваё неўмяшальніцтва ў літаратурныя справы, то ўжо ў канцы 20-х і ў пачатку 30-х гадоў акцэнты рэзка змяніліся. На месца мастацкай шматстайнасці прыходзіла «ідэйнае адзінадумства», а «свабоднае спаборніцтва» розных літаратурных школ падмянялася «ідэалагічнай барацьбой», якая нярэдка вылівалася ў формы палітычных абвінавачванняў і даносаў у карныя органы. Вырашэнне творчых пытанняў часта падмянялася казённа-бюракратычнымі пастановамі і партыйнымі рэзалюцыямі.

«Малая форма» эпасу як жанр, найбольш чулы да павеваў эпохі, імгненна рэагавала на змены ў грамадскай атмасферы. Гэта выявілася ў прыкметнай палітызацыі і пісьменніцкай пазіцыі, у ідэалагізацыі зместу апавядання. У сферы фарматворчасці таксама заўважаліся выразныя змены ў бок большай жанравай і стылявой аднастайнасці: многія апавяданні ў гэты час, асабліва ў сярэдзіне і ў другой палове дзесяцігоддзя, нагадвалі звычайныя вытворчыя нарысы, журналісцкія рэпартажы з месца падзей. Сацыяльна-гістарычны падыход, які быў адкрыццём беларускай літаратуры папярэдняга дзесяцігоддзя і выявіў сваю творчую перспектыўнасць у асобных апавяданнях *К. Чорнага, М. Лынькова, П. Галавача, Р. Мурашкі, Э. Самуйлёнка,* у другой палове 30-х гадоў пачынаў пераважаць над псіхалагізмам, падмяняючы яго голай сацыялогіяй, часта ў вульгарным яе варыянце, дзе панавалі «партыйна-класавыя ацэнкі». Нават у самых лепшых узорах апа-

вядальнага жанру ў гэты перыяд адчувалася, як традыцыйныя ў беларускай літаратуры гуманістычныя адносіны мастакоў слова да «маленькага чалавека» адступалі перад націскам вульгарнага сацыялагізму. У *творчасці К. Чорнага пачатку 30-х гадоў узнікла цікавая для беларускай прозы разнавіднасць апавядальнага жанру. Апавяданні «Сям'я Юрыя Гарэйкі» (1930) і «Семнаццаць год» (1932) адчулі на сабе ўплыў эпічнай задумы празаіка, што выявілася ва ўзмацненні раманнага пачатку.* Сюжэт гэтых твораў будуецца на лёсе асобнага чалавека, разгорнутым у часе і прасторы. Гэта сапраўдны эпас «прыватнага жыцця», у якім выявіла сябе «эпоха войнаў і рэвалюцый».

Новыя дачыненні героя з гісторыяй паказаны і ў апавяданні *П. Галавача «Не так» (1930)*. Дэзерцір Сузон, пабыўшы дома, воддаль ад фронта, дзе вырашаўся і яго лёс, зразумеў, што ён робіць нешта не так. Ён вяртаецца ў сваю вайсковую часць, і яго жыццё напаўняецца новым сэнсам. Герой апавядання *М. Лынькова «Квартармайстар Бадай» (1932)* уздымаецца над лёсам: апынуўшыся пасля цяжкага ранення ў абозе, нядаўні чырвоны камандзір Бадай адчувае сябе адлучаным ад падзей, дзе вырашаецца лёс краіны, і шукае магчымасці выявіць свае здольнасці, быць карысным палку, акружанаму белапалякамі. Аднак у апавяданнях *«Крот»* і *«Сінія галіфэ» (1933)* узнёслая інтанацыя, змякчаная цёплым гумарам, што была адметнай рысай творчай манеры М. Лынькова, падмяняецца выкрывальным пафасам. Сатырычны вобраз дэзерціра Івана Гнёта свядома зніжаецца: здраджваючы сябрам па зброі, герой квапіцца на сінія галіфэ, якія засталіся пасля забітага камандзіра. Класавы падыход, партыйныя лозунгі (аб чым, у прыватнасці, сведчыць назва аднаго з артыкулаў М. Лынькова пачатку 30-х гадоў «За ваяўнічую партыйнасць у пралетарскай літаратуры і мастацтве, за стварэнне сапраўднага вобраза бальшавіка») прыкметна ўплывалі на пісьменніцкую пазіцыю і звужалі магчымасці вобразнага даследавання рэчаіснасці. У апавяданні М. Лынькова з характэрнай, падкрэслена палемічнай назвай *«Аб чалавечым сэрцы» (1935)* ужо свядома супрацьстаўляюцца хрысціянскі гуманізм і гуманізм «пралетарскі», «сацыялістычны». Драматызацыя жанру апавядання адбывалася за кошт спрашчэння складанай карціны рэальнага жыцця, свядомага абвастрэння супярэчнасцей паміж героямі, носьбітамі супрацьлеглых грамадскіх ідэй.

У апавяданні 30-х гадоў знікла зусім «ідэя асобы», якая цікавіла празаікаў у папярэдняе дзесяцігоддзе, бяднейшай стала тэматыка твораў, нягледзячы на тое, што з'явіліся «вытворчы нарыс» і тэма змагання з «ворагамі народа». Нават такія таленавітыя празаікі, як Я. Колас, З. Бядуля, Ц. Гартны, К. Чорны, М. Лынькоў, В. Каваль, Б. Мікуліч, Р. Мурашка, Я. Скрыган, не асмельваліся выходзіць за межы журналісцкага фактаграфізму і павярхоўнай публіцыстыкі.

Сярод тых, хто імкнуўся не толькі стварыць мастацкую «гісторыю фабрык і заводаў», але і асэнсаваць яе маштабна, па-філасофску, быў К. Чорны. У зборніку «Брыгадзіравы апавяданні» (1932) відавочная спроба аўтара бачыць у звычайным незвычайнае, у шараговым выпадку глыбіню, якую па сіле выявіць толькі вялікаму таленту, разгарнуць «малую тэму» да эпасу. Аднак адбывалася выпрамленне людскіх лёсаў, збядненне мастацкага характару, спрашчэнне і вульгарызацыя вельмі складаных грамадскіх праблем. Ілюстрацыйнасць і публіцыстычнасць нагадала аб сабе ў чорнаўскім стылі, нязвыкла аднастайным, амаль газетным, надзвычай бедным на лексіку і прыёмы выразнасці.

Апавяданне як малафарматны жанр давала магчымасць для творчай самарэалізацыі і маладым празаікам, якія, хоць і не так бурна, як іх папярэднікі, усё ж уваходзілі ў літаратуру і ў 30-я гады. *І. Грамовіч, У. Краўчанка, М. Лупсякоў, А. Міронаў, М. Паслядовіч, А. Стаховіч,* некаторыя менш вядомыя празаікі адрозніваліся ад сваіх папярэднікаў большай літаратурнай адукаванасцю, пазітыўным стаўленнем да традыцыі і культуры творчасці, былі назіральнымі і добра ведалі народную гаворку.

Сярод маладых празаікаў, якія пачалі друкавацца ў канцы 20-х і пачатку 30-х гадоў, прыкметна вылучалася творчасць *Э. Самуйлёнка.* У апавяданні «Паляўнічае шчасце» (1933) выявіліся найбольш прыкметныя якасці пісьменніцкай індывідуальнасці: дакладнае адчуванне псіхалогіі герояў, майстэрскае валоданне маналогам, паэтычны погляд на чалавека працы, уменне стварыць вострую сітуацыю, схільнасць да яркай фабулы і дынамічнага сюжэта. Многіх гэтых якасцей якраз і неставала апавяданню 30-х гадоў. Э. Самуйлёнак быў блізкі да вырашэння складанай задачы, над якой марна біліся і больш таленавітыя, і больш вопытныя празаікі: ён стварыў вобраз «новага чалавека», «станоўчага героя», калектывіста па сваіх поглядах і жыццёвых паводзінах.

Некаторыя празаікі выкрывалі капіталізм («Дарагуся» К. Чорнага, 1939 і «Ядвісін дуб» М. Лынькова, 1940), ролю каталіцтва («Капля малака» і «Тры злотых» М. Лынькова, 1940) і ўслаўлялі камуністычнае падполле Заходняй Беларусі («Навела без назвы», 1934, і «Спатканне», 1936, П. Галавача, «Не згасне сонца» Х. Шынклера, 1939).

Апавяданне як жанр перажывала ў 30-я гады ідэйныя і мастацкія трансфармацыі, характэрныя і для іншых жанраў літаратуры. Яно напоўнілася сацыяльным пафасам, але гэта сацыяльнасць небяспечна збліжалася з вульгарным сацыялагізмам. Яно пашырала свой тэматычны дыяпазон, але прыкметна абмялела змястоўна і пабяднела ў фармальных адносінах. Спрашчэнне карціны жыцця, схематызм у пастаноўцы грамадскіх праблем, аднастайнасць стылявых падыходаў, занядбанне гуманістычнай традыцыі класікаў – усё гэта сведчыла, што апавяданне ў гэты час перажывала эстэ-

тычны спад. Многае тлумачылася неспрыяльнай грамадскай атмасферай, якая складвалася ў краіне і не давала магчымасцей для сапраўднага творчага пошуку.

**Аповесць і раман 30-х гадоў** развіваліся, абапіраючыся на набыты ў папярэдні перыяд мастацкі вопыт. У сваім імкненні стварыць эпас нацыянальнага і індывідуальнага жыцця першыя раманісты зыходзілі ў большасці выпадкаў з аўтабіяграфіі, справядліва бачачы ў асабістым лёсе адлюстраванне агульнага руху гісторыі. Пачатковае развіццё беларускага рамана цесна звязана з пануючымі ідэямі эпохі, якія абвастралі цікавасць да лёсу чалавека з народа ў новых варунках гісторыі: *С. Баранавых «Межы» (1929–1930) і «Новая дарога» (1931–1932), П. Галавач «Спалох на загонах» (1930, 1931), Я. Колас «Адшчапенец» (1930–1931), Б. Мікуліч «Чорная Вірня» (1931).* Сацыяльныя канфлікты, класавае сутыкненне перыяду калектывізацыі, якія вызначалі маральную атмасферу пачатку 30-х гадоў і існавалі як цьмяна акрэслены фон, выходзяць у гэтых творах на пярэдні план. Жанр аповесці поруч з апавяданнем і нарысам актыўна асвойваў узварушаны падзеямі новы жыццёвы матэрыял. Пераважна паказваліся падзеі на вёсцы, дзе крышыліся і ламаліся векавыя традыцыі.

Беларускія пісьменнікі добра ўсведамлялі свой абавязак перад сялянствам, бо самі былі выхадцамі з вясковага асяроддзя і ўсё, што там адбывалася, непасрэдна іх датычылася. Аднак іх творы пра калектывізацыю ўжо выходзілі за межы вузкага аўтабіяграфізму. Менавіта таму *аповесці пра калектывізацыю* засталіся ў гісторыі літаратуры не толькі як часовы прадукт мінулай эпохі, але і як хвалюючы дакумент, які перадае сам яе подых. Разам з тым гэтыя аповесці неслі на сабе сляды творчага пошуку новых мастацкіх спосабаў і прыёмаў асваення зменлівай рэчаіснасці.

Пафас сцвярджэння «новага жыцця» ў раманах другой паловы 30-х гадоў перарастаў у высокую патэтыку. Несумненная пераклічка назваў раманаў пра героіку рэвалюцыйнага змагання, якая ўбірала ў сябе ўвесь рамантызм настрояў, што ахапіў маладое пакаленне: С. Баранавых «Калі ўзыходзіла сонца» (1935–1936) і М. Астроўскага «Як гартавалася сталь». Шмат агульнага і ў сюжэце гэтых твораў: грамадзянская вайна, падполле ў час акупацыі, турма, працяг змагання. Ва ўмовах, калі сапраўдныя жыццёвыя канфлікты свядома ўтойваліся афіцыёзам, на іх месца прыходзілі псеўдаканфлікты. Вось чаму вострасюжэтныя раманы 30-х гадоў будаваліся на аснове гістарычнага матэрыялу або шырока выкарыстоўвалі даступную экзотыку.

Нешматлікія празаічныя творы канца 30-х гадоў К. Чорнага, М. Лынькова, З. Бядулі, Э. Самуйлёнка, Р. Мурашкі сведчылі аб тым, што беларуская літаратура выкарыстоўвала любую магчымасць, каб нагадаць пра сваё адвечнае прызначэнне выразніцы народных дум пра час. Прыкметы пале-

мічнасці з шэрагам канцэпцый, на якія перахварэла савецкая літаратура, выразна заўважаюцца ў апошняй рэдакцыі рамана *К. Чорнага «Трэцяе пакаленне», у аповесці-казцы З. Бядулі «Сярэбраная табакерка» (1940) і рамане Р. Мурашкі «Салаўі святога Палікара» (1933–1939).* У гэтых творах адмаўляецца абыякавасць дзяржавы да асобы, погляды на чалавека як на выразніка толькі грамадскіх інтарэсаў, пагардлівыя адносіны да інтымнай сферы чалавечага жыцця.

Гісторыя станаўлення і змены празаічных жанраў і стыляў на працягу 20–30-х гадоў прадэманстравала вялікія мастацкія магчымасці беларускай рэчаіснасці і беларускага слова. Беларускія літаратары вельмі хутка авалодалі майстэрствам празаічнага слова, зрабілі яго паўнавартасным і суверэнным. Эстэтычныя крытэрыі, якія сцвердзіліся ў сусветнай прозе за сотні гадоў яе існавання і развіцця, паспяхова былі засвоены і шматразова апрабаваны на практыцы ў творчасці лепшых беларускіх празаікаў. Па сутнасці, беларуская проза двух міжваенных дзесяцігоддзяў нагадвае вялікае эксперыментальнае поле, на якім выпрабоўваліся самыя розныя мастацкія стылі, прыёмы і спосабы, адкрытыя класікамі. На многіх напрамках эстэтычнага пошуку беларускія празаікі былі на парозе вялікіх творчых адкрыццяў і рухаліся паралельна з лепшымі еўрапейскімі празаікамі. У прозе 20–30-х гадоў былі закладзены эстэтычныя асновы, якія дазволілі наступным пакаленням пісьменнікаў вольна і ўпэўнена адчуваць сябе ў сферы мастацкай творчасці і ў поўнай меры выкарыстаць творчыя магчымасці беларускага слова ў больш спрыяльныя перыяды агульнага ўздыму народнага духу.

## ДРАМАТУРГІЯ

Пачатак 20-х гадоў стаў для беларускай драматургіі прынцыпова новым этапам у яе развіцці. Беларускія пісьменнікі з энтузіязмам падтрымалі справу культурнага нацыянальнага адраджэння ў савецкіх умовах развіцця. 10 жніўня 1920 г. у памяшканні Беларускага рабочага клуба распачаў сваю работу тэатральны калектыў «Трупы беларускіх артыстаў пад загадам Галубка». Прыкладна праз месяц – 14 верасня гэтага ж года адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага тэатра. Арганізацыя адразу двух тэатральных нацыянальных калектываў аб’ектыўна адкрывала вялізную перспектыву ў развіцці беларускай культуры. Патрабавалася забеспячэнне іх адпаведным рэпертуарам.

Амаль ніякіх праблем не было з рэпертуарам хіба што ў трупы **Уладзіслава Галубка**, які спачатку фарміраваўся выключна з п’ес самога Галубка. Свой першы тэатральны сезон адкрывалі камедыяй *«Суд» (1920).* Твор гэты па праву лічыцца адным з самых дасканалых не толькі ў творчасці Галубка, але і ва ўсёй беларускай драматургіі пачатку XX ст. Камедыя

«Суд» і тэматычна, і сэнсава-выяўленчымі сваімі асаблівасцямі была цалкам у традыцыях дакастрычніцкай літаратуры. Тое ж самае можна сказаць і пра іншыя п'есы гэтага часу: «*Мутэрка» (1920) М. Гарэцкага, «Конскі партрэт» (1920) Л. Родзевіча*. Родніць згаданыя п'есы і тое, што ўсе яны параўнаўча невялікія па аб'ёму і не патрабавалі значных выдаткаў на сваю пастаноўку, рэквізіт, сцэнаграфію: такую ашчаднасць дыктаваў галодны паслярэвалюцыйны час. Абразок *«Пасланец» і драма «Вяселле» (1921) В. Гарбацэвіча* далі пачатак *фальклорна-этнаграфічнаму напрамку* ў беларускай драматургіі 20-х гадоў. Найвялікшым дасягненнем на гэтым напрамку з'явілася музычна-этнаграфічная *драма М. Чарота «На Купалле» (1921)*, якой быў наканаваны яркі сцэнічны лёс.

Пачатак 20-х гадоў – час яшчэ дастаткова плюралістычны. Беларускія драматругі ўзяліся за *распрацоўку гераічнай тэматыкі*, бо яна адпавядала ўнутраным патрэбам нацыянальнага тэатра. П'есай-вытокам была драма *В. Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі» (1923)*, прысвечаная барацьбе і пакутніцкай смерці дукорскіх партызан, расстраляных польскімі акупантамі незадоўга перад сваім адступленнем вясной 1920 г. Меншы грамадскі рэзананс атрымала слабейшая па сваіх мастацкіх вартасцях гераіка-рэвалюцыйная драма *А. Ляжневіча «З дымам-пажарам» (1924)*. Гэтыя творы знаходзіліся ў авангардзе жанравых пошукаў, прыносілі ў драматургію новыя тэмы, праблемы, новых герояў. Гэту ісціну добра ўсведамляў *М. Гарэцкі*, прыступаючы да напісання гісторыка-рэвалюцыйнай драмы *«Чырвоныя ружы» (1922).*

П'есы *Е. Міровіча «Машэка»* і *«Каваль-ваявода»* адыгралі вялікую ролю ў станаўленні выяўленчых традыцый беларускай драматургіі. Яны з відавочнай пераканальнасцю даказвалі, што зварот нацыянальнага сцэнічнага мастацтва да фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу быў заканамерным, надзвычай плённым. Плённым было і тое, што ў гэтых п'есах арганічна спалучаліся элементы народнага лубка і класічнай драмы, што ў іх рэальныя персанажы дзейнічалі побач з міфалагічнымі, бо ўсё гэта з'яўлялася вынікам напружанага, нярэдка эксперыментальнага, творчага пошуку, у які ўключаліся вельмі многія драматургі. Важным творам беларускай драматургіі 20-х гадоў, заснаваным на фальклорным матэрыяле, была *п'еса В. Шашалевіча «Апраметная» (1926).* Прысвечаная так званай адраджаніцкай тэматыцы, яна паказвала Беларусь у алегарычным вобразе заснулай прыгажуні, зачараванай злымі сіламі і абуджанай ад сну, вызваленай з духоўнага палону казачна магутнымі віцязямі. Пастаноўку гэтай п'есы ажыццявіў БДТ-2, але спектакль нядоўга пратрымаўся ў рэпертуары, бо быў літаральна разгромлены вульгарызатарскай крытыкай, у прыватнасці В. Вольскім.

Непрыняцце распрацоўкі фальклорных сюжэтаў афіцыйнымі структурамі, якія загадвалі тэатрамі, і, наадварот, усведамленне плённасці такой распрацоўкі самімі творцамі і прымусіла беларускіх драматургаў манеўраваць, шукаць абходныя шляхі. Падказка была знойдзена ў самой драматургічнай практыцы: яшчэ ў *1922 г. У. Галубок напісаў драму «Пан Сурынта»*. Жанрава-стылявым ладам яна вельмі шчыльна прымыкала да фальклорна-этнаграфічных п'ес, але разам з тым мела ўсе фармальныя адзнакі *драмы гістарычнай*. Развіццё ж гэтай жанравай разнавіднасці ўсімі заахвочвалася, таму беларуская драматургія 20-х гадоў зазнала значны прыліў так званых *фальклорна-гістарычных п'ес. Апроч У. Галубка іх пісалі Е. Міровіч («Кастусь Каліноўскі», 1923), Я. Дыла («Панскі гайдук», 1924), А. Александровіч («Паўстанцы», 1925), М. Грамыка («Скарынін сын з Полацка», 1926), Я. Рамановіч («Вір», 1926) і інш.* Адлюстроўваліся ў іх хутчэй легенды аб гістарычных падзеях, а не канкрэтныя гістарычныя факты жыцця беларускага народа ў мінулым. Характэрна, што аж да канца 20-х гадоў мінулае ў творах беларускіх драматургаў бачылася не толькі ў змрочным святле. Прынамсі, нагнятанне негатыўных эмоцый у паказе дарэвалюцыйнага побыту народа, яго бяспраўнасці і забітасці, якое стала ледзь не абавязковым правілам пазнейшага часу, у 20-я гады асаблівага распаўсюджання не мела. У параўнанні з фальклорна-этнаграфічнымі гэтыя п'есы вызначаліся больш шырокім ахопам канкрэтнага матэрыялу, большай ўвагай да псіхалагічнай характарыстыкі персанажаў. Асабліва каштоўным аказаўся вопыт стварэння вобраза К. Каліноўскага. Пастаянна нацэленая на задачы адраджанізму беларуская драматургія праз гэты вобраз дасягнула сапраўднага майстэрства. Толькі тады пэўны народ цалкам усвядоміць сябе суб'ектам гісторыі, калі добра спазнае сваіх нацыянальных герояў – асоб выдатных, канкрэтна-гістарычна абазнаных. На жаль, у святло рампы паспелі ў 20-я гады трапіць *толькі два з вялікай кагорты знакамітых беларусаў – К. Каліноўскі і Ф. Скарына*. Следам за фальклорна-этнаграфічнай палітычнаму астракізму была падвергнута і гістарычная тэматыка. Не ўся, вядома, а толькі тая яе частка, якая ахоплівала ўласна нацыянальныя падзеі. Вульгарна-сацыялагічная крытыка разгарнула планамерны і бязлітасны пераслед менавіта патрыятычна-адраджэнцкіх матываў у літаратуры, аб'яўляючы ледзь не кожную спробу мастацкага асваення мінулых часоў ідэалізацыяй сярэдневякоўя, прапаведніцтвам «залатога веку» ў гісторыі Беларусі. У выніку з рэпертуару выкідваліся нават такія п'есы, як «Вір» Я. Рамановіча – гістарычная хроніка часоў крыжацкіх набегаў на землі старажытнай Беларусі, тых часоў, якія да «залатога веку» ніяк аднесці нельга. *У. Галубок* аж да самага канца 20-х гадоў пісаў і ставіў у сваім тэатры фальклорна-этнаграфічныя і фальклорна-гістарычныя п'есы: *«Пан Сурынта», «Плытагоны» (1927), «Пінская мадонна» (1927), «Белы вянок»* і інш. Паспрабуй

пракантраляваць акцёраў-вандроўнікаў, калі яны сёння выступаюць, напрыклад, у Мазыры, заўтра – у Рэчыцы, а паслязаўгра пераедуць у Бабруйск. Таму ў пачатку 30-х гадоў вандроўную вольніцу «галубкоўцаў» утаймавалі наданнем тэатру новага статусу: пад назвай БДТ-3 са стацыянарнай базай у Гомелі славуты калектыў ператварыўся ў звычайны абласны драмтэатр.

Своеасаблівым актам нязгоды з афіцыёзам было напісанне *Я. Купалам* трагікамедыі *«Тутэйшыя»*. Адразу ж пасля прэм'ерных спектакляў п'есу рашуча забаранілі, а пасля на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пры любой нагодзе крытыкавалі жорстка і несправядліва. Ні «Забастоўшчыкі» (1925) і «Вайна вайне» (1927) Якуба Коласа, ні п'есы драматургаў сярэдняга і малодшага пакаленняў («Белыя ружы» і «Віхор на балоце» М. Зарэцкага) не змаглі прабіцца на сцэну.

Стан развіцця *беларускай драматургіі на пачатку 30-х гадоў* тагачасная крытыка ацэньвала ў цэлым станоўча. Як прынцыпова творчая перамога адзначалася *з'яўленне п'ес з індустрыяльнай тэматыкай*. Хваліліся творы за распрацоўку ў іх праблем сацыялістычнага спаборніцтва, разгортвання рацыяналізатарства на вытворчасці і, вядома ж, за адлюстраванне змагання за інтэрнацыяналізм супраць «нацыянал-шавінізму». На ўсіх тэатральных нарадах у ліку прынцыповых дасягненняў беларускай драматургіі называліся *п'есы «Мост» Я. Рамановіча, «Гута» Р. Кобеца, «Напор» А. Александровіча, «Качагары» І. Гурскага*. У пачатку 30-х гадоў уся савецкая драматургія апынулася ў зоне асаблівай увагі: нездарма І. Сталін назваў яе тым важным звяном, ухапіўшыся за якое, можна выцягнуць увесь ланцуг літаратурных праблем. Да пачатку 30-х гадоў драматургічны «корпус» беларускай літаратуры, часам дзякуючы, а часам насуперак афіцыйным клопатам, падужэў, памацнеў, вырас колькасна і якасна настолькі, што яму былі пад сілу любыя творчыя здзяйсненні. Да зеніту мастакоўскага росквіту падышоў У. Галубок, у добрай форме заставаўся Е. Міровіч, след у след за мэтрамі (у нечым нават абганяючы іх) ішла вялікая група маладзейшых драматургаў на чале з В. Шашалевічам і В. Сташэўскім. У драматургіі ўсё часцей пачалі працаваць прадстаўнікі іншых літаратурных жанраў: *Я. Колас, З. Бядуля, К. Чорны*. І ўсё ж той імклівы разбег, які набыла беларуская драматургія ў 20-я гады, у пачатку наступнага дзесяцігоддзя прыкметна запаволіўся. Спад творчай актыўнасці ў драматургіі, як і ва ўсёй літаратуры, насіў аб'ектыўны характар. Узмацнілася адміністрацыйнае кіраванне мастацтвам, стала адкрытым умяшанне ўладных структур у дзейнасць творчых саюзаў. Пісьменнікаў скіроўвалі на шлях нарматыўнасці і яны пачалі навадняць драматургічна-тэатральную прастору Беларусі павярхоўнымі, пазбаўленымі псіхалагізму і сапраўднага драматургічнага канфлікту п'ескамі на надзённую тэматыку. Асабліва папулярнай па вядо-

мых прычынах была *тэма калектывізацыі. П’есы «Засеўная» і «Помста кулацкая» (1930) Б. Крамскога, «Сварка», «Бальшавіцкая вясна» (1930) І. Гурскага, «На пэўным шляху» (1930) С. Якаўлева, «Шляхі» (1930) У. Стэльмаха, «Камяніца» (1930) М. Міцкевіча, «Песні нашых дзён» (1930) В. Гарбацэвіча, «За калгас» (1930) Я. Мазуркевіча, «Трактар» (1931) М. Блісцінава* ствараюць уражанне аб стане беларускай драматургіі таго часу далёка не аптымістычнае. *І толькі найбольш таленавітыя В. Шашалевіч, М. Зарэцкі, К. Чорны знаходзілі ў сабе сілы не паддавацца масаваму псіхозу, узняцца над ворагаманіяй.* Яшчэ большую паслядоўнасць у імкненні пазбегнуць спрошчанасці і павярхоўнасці ў паказе першых гадоў калектывізацыі беларускай вёскі *праявіў Кузьма Чорны ў драме «Лета» (1932), М. Зарэцкі ў п’есе «Сымон Карызна» (паводле рамана «Вязьмо»).* Але на агульным шэрым фоне дзве–тры яркія ўдачы проста губляліся.

На жаль, у гэты час манаполія на драматургічную крытыку перайшла да В. Вольскага, М. Модэля і некаторых іншых, яшчэ менш кваліфікаваных літаратараў, а такія буйныя спецыялісты, як А. Вазнясенскі, А. Барычэўскі, І. Замоцін, М. Піятуховіч, якія ў 20-я гады прафесіянальна-грунтоўна пісалі пра драматургію, замоўклі.

Аб драматургіі гэтага часу пераканаўча выказаўся *Кузьма Чорны*, які свае погляды падкрэслена палемічна выклаў у артыкулах *«Заўвагі пра драматургію» (1933), «Працаваць над драматургічным словам» (1934), «Рэальная шматграннасць і філасофскае адзінства» (1932).* Гэтыя артыкулы самі па сабе – значны ўклад у выпрацоўку драматургічных традыцый беларускай літаратуры, але К. Чорны на гэтым не спыніўся, паспрабаваўшы на практыцы ажыццявіць уласныя тэарэтычныя погляды. У творчасці ён сябе паслядоўна прылучаў да наватараў, сцвярджаючы спачатку тэорыю жывога чалавека, а потым ідэю малых спраў. Праўда, у гераіка-гістарычнай драме «*Вызваленне» (1930)* пісьменнік выявіўся хутчэй як традыцыяналіст. У драме ж *«Бацькаўшчына»*, напісанай паводле аднайменнага рамана ў 1932 г. (другі варыянт – у 1933 г., канчатковая версія надрукавана ў 1939 г.), ён паспрабаваў звычайныя з’явы штодзённасці ўзняць на «вышыню вялікіх ідэй». Заслуга К. Чорнага перад беларускай драматургіяй заключаецца яшчэ і ў тым, што ён, высока ацэньваючы значэнне тэатра для нацыянальнага адраджэння, паспяхова загітоўваў пісьменнікаў розных жанраў працаваць для сцэны. Пра гэту акалічнасць згадваў К. Крапіва. Менавіта *дзякуючы К. Чорнаму і К. Крапіве* ў беларускай драматургіі сталі сцвярджацца некаторыя новыя творчыя тэндэнцыі. Перш за ўсё гэта выявілася ў пашырэнні яе *жанрава-тэматычных* гарызонтаў. Прыкметна ўзмацнілася, напрыклад, *увага да маральна-этычнай праблематыкі*, стаў паступова пераадольвацца тэндэнцыйны, аднабаковы паказ характараў. Узмацнілася ўвага да народных асноў жыцця, якія вызначалі менталітэт

нацыі. *К. Крапіва* даследуе праблемы маральнай адказнасці асобы, дыялектыку асабістага і грамадскага *(«Канец дружбы», 1934).* Лідэры беларускай драматургіі засяродзілі сваю ўвагу на барацьбе з правінцыйнасцю мастацкага мыслення, павярхоўнасцю і ілюстрацыйнасцю асэнсавання рэчаіснасці. Небяспечна было наогул звяртацца да праблем савецкага жыцця і таму позіркі пісьменнікаў часта скіроўваліся за мяжу.

У 1935 г. *В. Шашалевіч* напісаў драму *«Сімфонія гневу».* Да гэтага ж часу сам драматург паспеў пабываць у берыеўскіх засценках, таму яго аб’ектыўна-светапоглядпае непрыняцце таталітарызму ўзмацнілася яшчэ і асабістымі рахункамі. Як п’есу-папярэджанне ўспрыняла літаратурная грамадскасць «Сімфонію гневу». У шэрагу антыфашысцкіх п’ес своеасаблівае месца належыць драме *Б. Мікуліча «Рот фронт» (1933).*

У гісторыі беларускай *драматургіі другая палова 30-х гадоў* паўстае ў змрачнаватым святле. І сапраўды, былі рэпрэсіраваны У. Галубок, М. Зарэцкі, В. Шашалевіч, Л. Родзевіч, В. Сташэўскі і многія іншыя. Надламаўся, адышоў у іншыя сферы творчасці Е. Міровіч. Нягледзячы ні на што, і ў другой палове 30-х гадоў працягваліся творчыя пошукі. Менавіта на гэты час прыпадае росквіт драматургічнага таленту *Кандрата Крапівы: сатырычная п’еса «Хто смяецца апошнім» (1939)* увайшла ў элітны фонд сусветнай камедыяграфіі. Наглядаўся пэўны прыток свежых сіл у драматургію: М. Паслядовіч – «Гонар» (1934), «Шалёная рысь» (1939), Ф. Альшэўская – «На чыім баку» (1935), Б. Гузарэвіч – «Кансіліум», «Не спяшайся, доктар, спаткнешся», «Памылка» (усе 1938), Х. Шынклер – «Пачэсны рэйс» (1939), Я. Маўр – «Хата з краю» (1939), «Памылка» (1940), А. Якімовіч – «Чалавек-невідзімка» (1939) і інш.

Напрыканцы 30-х гадоў у беларускай драматургіі на поўны голас загучала *тэма жыцця ў прыгранiччы: «Базылевічава сям’я» (1938) К. Чорнага, «Пагібель воўка» (1939) Э. Самуйлёнка, «На варце» (1938) 1. Гурскага, «Гарачае чэрца» (1938) і «Шалёная рысь» (1939) М. Паслядовіча, «Хата з краю» Я. Маўра, «Каля лісяй нары» (1939) Ф. Альшэўскай.*

## «НАШАНІЎСКІ» ПЕРЫЯД БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

I. З’яўленне першых перыядычных выданняў на беларускай мове («Наша доля», «Наша ніва», «Саха» і інш.), дзейнасць выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца» як выяўленне працягу традыцый Беларускага адраджэння. Задачы літаратурнага руху гэтага перыяду.

II. Масавая паэзія пачатку ХХ ст. як новы, магутны ўсплеск этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў (Мікіта Чышчавік, Баўтрук, Юзя Шчупак (Сайкоўскі Язэп), Мірко (Войцік Людвіка), Стары Улас (Сівы-Сівіцкі), Каршун, Паўлюк Жыбуля, Ц. Гартны, М. Арол, Я. Журба, К. Буйло, П. Красоўскі і інш.).

1. Тэма роднага краю ў паэзіі К. Буйло.
2. Творчасць Я. Купалы «нашаніўскага» перыяду.
3. Паэзія Я. Коласа «нашаніўскага» перыяду.
4. Творы Зм. Бядулі на старонках «Нашай нівы».
5. М. Багдановіч і «Наша ніва».
6. Творчасць Я. Журбы.
7. Творы А. Гаруна ў «Нашай ніве».
8. Творчасць А. Гурло.

III. Проза пачатку ХХ стагоддзя. Інтэнсіўнае жанрава-стылёвае развіццё (мастацкая, дакументальная проза; гістарычны, этнаграфічны нарыс; публіцыстыка; змешаныя жанравыя формы – абразкі, імпрэсіі, літаратурнае паданне, псіхалагічны эцюд, эсэ, алегарычная навела ці казка і г.д.). Асноўныя праблемна-тэматычныя і метадалагічныя плыні. Жанрава-стылёвая адметнасць празаічных твораў Кандрата Лейкі, Тамаша Булавы, Ластаўкі з-пад Пцічы, Пётры Простага, Язэпа Шпэта, Пётры Беларуса і інш. Жанрава-стылёвая шматстайнасць празаічных публікацый «Нашай нівы».

1. Проза К. Каганца («Прылукі», «Вітаўка», «Адкуль мядзведзі на свет узяліся...», «Адкуль зязюля ўзялася?», «Машэка», «Скрыпач і воўк», нарысы пра Навагрудскае замчышча, пра засульскіх туроў.
2. Стылёва-жанравая адметнасць празаічных твораў Цёткі.
3. Ранняя проза М. Гарэцкага і яе асаблівасці.
4. Разнастайнасць і адметнасць празаічных твораў Ядвігіна Ш.
5. Празаічныя творы М. Багдановіча і іх арыгінальнасць.
6. Тэматычна-стылёвая адметнасць апавяданняў У. Галубка.
7. Сацыяльна-бытавое апавяданне, алегорыі, прытчы ў ранняй прозе Я. Коласа.
8. Праблематыка і адметнасць «нашаніўскіх» апавяданняў З. Бядулі.

IV. Беларуская драматургія пачатку ХХ стагоддзя. Прапаганда «Нашай нівай» ідэі беларускага тэатра. Грамадска-асветніцкая дзейнасць Беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні. Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча ў

беларускай драматургіі пачатку XX стагоддзя. Камедыя Ядвігіна Ш. «Злодзей». Дзейнасць трупы Ігната Буйніцкага.

1. Праблемна-вобразны аналіз п’ес Каруся Каганца «Модны шляхцюк», «Двойчы прапілі».
2. Мастацкія асаблівасці гістарычных драм «Старажовы курган», «Сын Даніла».
3. Тэматыка і асаблівасці драмы Касьяна Вясёлага «Не розумам сцяміў, а сэрцам».
4. Праграмнае значэнне артыкула М. Гарэцкага «Наш тэатр». М. Гарэцкі аб арганізацыі тэатральнай справы на Беларусі.
5. Уклад Я. Купалы ў развіццё беларускай драматургіі.
6. Драматургічныя творы К. Буйло «Кветка папараці», «Сягонняшнія і даўнейшыя».
7. Праблематыка і асаблівасці п’ес Родзевіча «Пакрыўджаныя», «Збянтэжаны Саўка», «Пасланец», «Конскі партрэт».
8. Праблематыка драмы М. Гарэцкага «Антон».
9. Уклад У. Галубка ў беларускую драматургію пачатку XX ст.
10. Ф. Аляхновіч і беларуская драматургія пачатку XX ст.

## Літаратура

1. Буйло, К. Копіцца рэха: вершы, паэмы, лісты / К. Буйло. – Мінск, 1993.
2. Каганец, К. Выбраныя творы / К. Каганец. – Мінск, 1979.
3. Казека, Я. Старонкі ўспамінаў / Я. Казека // Полымя. – 1990. – № 8. – С. 194.
4. Кветка, Вітан. «Наша ніва» і Іван Луцкевіч / Вітан Кветка // На суд гісторыі: успаміны, дыялогі / уклад. прадм., звесткі пра аўт. Б.І. Сачанкі. – Мінск: Маст. літ., 1994.
5. Ластоўскі, В. Мае ўспаміны аб М. Багдановічу / В. Ластоўскі // На суд гісторыі: успаміны, дыялогі / уклад. прадм., звесткі пра аўт. Б.І. Сачанкі. – Мінск: Маст. літ., 1994.
6. Лаўшук, С. «А ён і сёння яшчэ модны»: п’еса «Модны шляхцюк» Каруся Каганца / С. Лаўшук // Роднае слова. – 2008. – № 2. – С. 8–9.
7. Мроз, К. Талент Віленскага крытыка / К. Мароз // Полымя. – 1996. – № 1. – С. 293.
8. Наша Ніва: першая бел. газета з рысункамі: факсімільнае выданне // Навука і тэхніка. Вып. 1: 1906–1908 / адказ. за вып. З.Ф. Санько. – 1992. – 602 с.: іл.
9. Няфёд, У. Ігнат Буйніцкі – бацька беларускага тэатра / У. Няфёд. – Мінск, 1991.

10. Пашкевіч, А. Каганец зямлі беларускай / А. Пашкевіч // Роднае слова. – 1993. – № 2.

11. Сідарэвіч, А. Антон Луцкевіч і Янка Купала / А.Сідарэвіч // Тэрмапілы. – 2003. – № 7. – С. 161–222.

12. Уласаў, А. Якуб Колас і «Наша ніва» / А. Уласаў // На суд гісторыі: успаміны, дыялогі / уклад. прадм., звесткі пра аўт. Б.І. Сачанкі. – Мінск: Маст. літ., 1994.

## «СТАНУ ПЕСНЯЙ У НАРОДЗЕ»
## ЦЁТКА – АЛАІЗА ПАШКЕВІЧ
## (1876–1916)

Арлы-брацці, дайце скрыдлы,
Бо унізе жыць мне збрыдла...
*Цётка*

Цётка як бы аб’ядноўвала ў сабе двух выдатных жанчын нашай старажытнасці: Рагнеду і Ефрасінню Полацкую. Як першая, яна была барацьбітом за волю радзімы і, як другая, – асветніцай свайго народу.
*М. Ермаловіч*

1. Жыццёвы шлях пісьменніцы-рэвалюцыянеркі і асветніцы. Яе ўклад у гісторыю беларускай літаратуры (паэзіі, прозы, публіцыстыкі).

2. Тэматыка і вобразна-выяўленчая адметнасць вершаў зборніка «Скрыпка беларуская». Суседства грамадзянска-адраджэнцкіх матываў і прыродаапісальных малюнкаў. Выяўленчая роля эмацыянальна афарбаванай лексікі (вершы «Мужык не змяніўся», «Нямаш, але будзе», «Музыкант беларускі», «Лета», «Восень» і інш.).

3. Рэвалюцыйна-грамадскі пафас зборніка «Хрэст на свабоду». Паэтызацыя і ўслаўленне герояў-барацьбітоў за народную волю («Пад штандарам», «Добрыя весці», «Мора», «Бунтаўнік», «Хрэст на свабоду» і інш.).

4. Матывы грамадзянскага суму, грамадская пазіцыя аўтара ў паэзіі 1908–1914 гг. («З чужыны», «Грайка», «Арлы-брацці, дайце скрыдлы», «Гаданне», «З Новым годам», «Сірацінка» і інш.).

5. Публіцыстыка Цёткі як працяг традыцый К. Каліноўскага і Ф. Багушэвіча. Артыкулы «Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Аб душы маладзёжы», «Да дзяўчатак», «Да школьнай моладзі». Дарожныя нататкі, нарысы падарожжаў у Італію, Фінляндыю, Швецыю, Германію («З дарогі», «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю»). Артыкулы-даследаванні «Наша народная беларуская песня», «Папараць-кветка».

6. Пазнавальнае, развіццёвае і выхаваўчае значэнне «Першага чытання для дзетак беларусаў». Пафас абуджэння сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці дзяцей беларусаў.

7. Апавяданні Цёткі. Праблемна-мастацкі аналіз твораў «Прысяга над крывавымі разорамі», «Лішняя», «Зялёнка», «Міхаська», «Асеннія лісты».

**Літаратура**


1. Цётка. Выбраныя творы / Цётка; уклад. прадм. В. Коўтун; камент. С. Александровіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 336 с.
2. Арабей, Л. Новая хвалюючая старонка / Л. Арабей // Полымя. – 1996. – № 7. – С. 26–28.
3. Бельскі, А. Успрыманне Радзімы ў паэзіі Цёткі і Лесі Украінкі / А. Бельскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 2007. – № 4. – С. 35.
4. Бярозкін, Р. Цётка / Р. Бярозкін // Кніга пра паэзію. – Мінск, 1974.
5. Дасаева, П.М. Асаблівасці лірызму ў прозе Цёткі / П.М. Дасаева // Весці НАН Беларусі. – 2001. – № 3. – С. 120.
6. Максімовіч, В. Феномен Цёткі / В. Макісмовіч // Полымя. – 2001. – № 6. – С. 272.
7. Махнач, К. «У Панямонскім небе Цётчынай зорцы не згаснуць» / К. Махнач // Народная асвета. – 2007. – № 2. – С. 85.
8. Петрушкевіч, А.М. Алаіза Пашкевіч – аўтарка «Першага чытання для дзетак беларусаў» / А.М. Петрушкевіч // Скарына і наш час: матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гомель, 13–14 лістапада 2008 г.: у 2 ч. / рэдкалегія: А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2009. – Ч. 2. – С. 231–235.
13. Стэпонас, К. З маіх успамінаў пра Цётку / Кайрыс Стэпонас // На суд гісторыі: успаміны, дыялогі / уклад. прадм., звесткі пра аўт. Б.І. Сачанкі. – Мінск: Маст. літ., 1994.


## ПАЧЫНАЛЬНІК БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ ЯДВІГІН Ш. (1868–1922)

1. Жыццёвы шлях, творчая біяграфія пісьменніка. Светапогляд. Дэбют Ядвігіна Ш. у галіне прозы, драматургіі, публіцыстыкі. Вучань В. Дуніна-Марцінкевіча, паплечнік Я. Купалы, М. Багдановіча, З. Бядулі. Супрацоўнік першых легальных газет «Наша доля», «Наша ніва». Арганізатар штомесячных часопісаў «Саха», «Лучынка».

2. Ядвігін Ш. – навеліст, таленавіты сатырык, гумарыст. Вобраз беларускага селяніна ў навелах: «Вучоны бык», «З маленькім білецікам»,

«Заморскі звер», «Цырк», «Пазыка». Самапрыніжэнне як прыём раскрыцця характару селяніна.

3. Разнастайнасць алегарычных апавяданняў Ядвігіна Ш. па тэматыцы і эмацыянальнай афарбоўцы («Сакатушка», «Павук», «Падласенькі», «Рабы», «Сабачая служба» і інш.). Сувязь праблематыкі алегорый з жыццёвымі абставінамі беларускага селяніна. Уплыў народнай творчасці на сталенне таленту празаіка-«байкапісца» (М. Багдановіч).

4. Паступовы адыход пісьменніка ад сатырычна-гумарыстычнай танальнасці. Сінтэз традыцыйных фальклорных і ўласна-індывідуальных аўтарскіх мастацкіх прыёмаў у алегарычных апавяданнях «Дуб-дзядуля», «Бярозка».

5. Зварот Ядвігіна Ш. да псіхалагічна-бытавога апавядання («Гаротная», «Зарабіў», «Шчаслівая», «З бальнічнага жыцця», «Жывы нябожчык» і інш.) як магчымасці больш глыбока адлюстраваць сучасную рэчаіснасць. Выяўленне празаікам майстэрства псіхалагічнага аналізу. Яго моцныя і слабыя бакі.

6. Незакончаны псіхалагічны раман Ядвігіна Ш. «Золата» – адна з першых спроб стварэння ў беларускай прозе твораў вялікай эпічнай формы. Духоўны свет Васіля Дубінскага і Зосі Стрончык, станаўленне ўзаемаадносін галоўных герояў – ад першага іх знаёмства да трагічнай смерці Васіля. Унутраны драматызм твора. Вырашэнне тэмы «ўлады грошай». Апісанне побыту, нораваў, спадзяванняў беларускага селяніна. Выкарыстанне празаікам прыёмаў мастацкага псіхалагізму.

7. Паэма Ядвігіна Ш. «Дзед Завала». Паэтызацыя народна-сялянскіх уяўленняў аб шчаслівым жыцці людзей, аб забяспечанай старасці. Разважанні пісьменніка аб гарманічных узаемаадносінах паміж чалавекам і прыродай. Легенда пра матачнік. Вобраз Антона Завалы. Блізкасць яго да дзеда Грышкі (Я. Лучына «Стары ляснік») і дзеда Данілы (Я. Колас «Сымон-музыка»).

8. Эвалюцыя творчасці празаіка ў ацэнках літаратуразнаўцаў.

### Літаратура

1. Ядвігін, Ш. Выбраныя творы / Ядвігін Ш. – Мінск: Маст. літ., 2006 – 238 с.

2. Ільяшэвіч, Хведар. Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі): жыццё і літаратурная творчасць / Хведар Ільяшэвіч. – Вільня: Выданне Таварыства беларускай асветы, 1933. – 37 с.

3. Максімовіч, В. Алегарычнае апавяданне Ядвігіна Ш. / В. Максімовіч // Роднае слова. – 1998. – № 6. – С. 49–60.

4. Носік, І. Ядвігін Ш. і станаўленне беларускай прозы / І. Носік // Шостыя рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні: матэрыялы рэспублікан-

скай навуковай канферэнцыі, прысвечаныя 85-годдзю з дня нараджэння У.А. Калесніка, г. Брэст, 26 кастрычніка 2007 года «Слова аб палку Ігаравым» у літаратуры і духоўнай культуры славянскіх народаў: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, г. Брэст, 27–28 красавіка 2007 года / пад агульнай рэдакцыяй З.П. Мельнікавай, Г.М. Праневіча. – Брэст, 2008. – С. 95–99.

5. Нямковіч, Н. Некаторыя рысы стылю Ядвігіна Ш. / Н. Нямковіч // Роднае слова. – 1998. – № 2. – С. 86–90.

6. Пятуховіч, М. Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі): жыццё і літ. дзейнасць / М. Пятуховіч. – Б.м., Б.г. – С. 276–290.

7. Содаль, У. Вугельчыкі з попелу (пра жыццё і дзейнасць Ядвігіна Ш.) / У. Содаль // Роднае слова. – 1999. – № 4. – С. 180–188.

8. Содаль, У. Новая старонка ў беларускай літаратуры (пра апавяданне «Суд» Ядвігіна Ш.) / Роднае слова. – 1996. – № 9. – С. 54–59.

9. Садаль, У. «Ласкавая, ціхая, як анёл...» / У. Содаль // ЛіМ. – 1995. – 23 чэрвеня. – С. 14–15.

10. Содаль, У. Пачынальнік. Да 140-й гадавіны з дня нараджэння Ядвігіна Ш. / У. Содаль // Полымя. – 2009. – № 1. – С. 181–182.

11. Ткачова, П. Жанравая спецыфіка твораў Ядвігіна Ш. / П. Ткачова // Беларуская мова і літартура. – 2007. – № 2. – С. 48.

12. Тычына, М. Карані і крона: фальклор і нацыянальная спецыфіка літаратуры / М. Тычына. – Мінск, 1991. – С. 67–68, 81–82.

## «СМЕРЦІ Ў ПАЭТА НЯМА...»
## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
## (1891–1917)

Бо як ёсць у народа такія –
Не загіне давеку народ.
*У. Караткевіч*

1. Шлях М. Багдановіча ў беларускую літаратуру. Вытокі духоўнай глыбіні творчасці М. Багдановіча. Адзінства паэзіі і лёсу. Гісторыя багдановічазнаўства.

2. Кніга паэзіі «Вянок» – узор гармоніі, цэласнасці і мастацкай дасканаласці. Творчая гісторыя «Вянка», кампазіцыйная пабудова зборніка, спробы канцэптуальнага літаратуразнаўчага прачытання «Вянка» як паэтычнай кнігі.

3. Мастацкі свет паэта, акрыленага ідэяй нацыянальнага Адраджэння (па зборніку «Вянок»):

а) адраджэнне «зачараванага царства» народных міфаў, паданняў, песень і вечнае дыялектычнае абнаўленне прыроды, жыцця (цыклы «У зачарованым царстве», «Згукі бацькаўшчыны»);
б) адраджэнне роднага краю, яго гісторыі, культуры, мастацтва («Старая Беларусь», «Места», «Думы»);
в) увасабленне імгненняў быцця і непаўторных зрухаў душы ў мастацтве («Вольныя думы», «Старая спадчына»);
г) вобраз Мадонны як ідэал, вянец Адраджэння.

* Вырашэнне праблемы жыцця і смерці ў паэзіі М.Багдановіча і рускіх сімвалістаў А. Салагуба, К. Бальмонта, Белага і інш.

4. Паслявянковы перыяд М. Багдановіча. Два этапы ідэйна-творчай эвалюцыі паэта. Адметнасці першых крокаў М. Багдановіча па аб’яўленым ім «забытым шляху» беларускай народнай традыцыі. Што дало права аўтару артыкула «Забыты шлях» сцвярджаць: «Беларускіх вершаў у нас яшчэ не было – былі толькі вершы пісаныя беларускай мовай»? Лірыка М. Багдановіча апошніх дзён яго жыцця. Яе глыбокі філасафізм, гуманістычны, жыццялюбівы пафас. «Пагоня» – вяршыня патрыятычнай лірыкі паэта.

«Страцім-лебедзь». Жанр твора. Паэтызацыя апакрыфічнай легенды. Чаму М. Багдановіч, рынуўшыся «ў бой з жыццём», сваім ідэалам выбраў непакорнага Страцім-лебедзя?

5. Плённы шлях М. Багдановіча-празаіка. Эстэтычнае крэда пісьменніка. Тэма адухоўленай красы, самаадданага служэння мастака народу і яе вырашэнне ў апавяданнях «Музыка», «Шаман», «Сон-трава», «Апокрыф», «Мадонна...». Зварот да традыцыі старажытнай пісьменнасці, да апакрыфічнай формы.

Замацаванне ў беларускай прозе інтэлектуальнага пачатку. Роля споведзі, спрэчак, гутарак філасофскага зместу ў апавяданнях М. Багдановіча. Высокае майстэрства празаіка ў адлюстраванні жыцця і побыту гараджан, іх заняткаў, звычаяў («Гарадок», «Сярод глухой пушчы...»). Гуманізм пісьменніка ў паказе душэўных пакут людзей, скрыўджаных жыццём у вырашэнні праблемы дабра і зла, у асвятленні тэмы дзяцінства («Колька», «Преступление» і інш.). Роля вобразна-выяўленчых сродкаў у раскрыцці аўтарскай задумы. Жанравая разнастайнасць прозы: апавяданні, мініяцюры, сцэнкі з натуры, падарожны нарыс, кароткія эцюды.

6. М. Багдановіч – майстар мастацкага перакладу. Высокая выканаўчая манера перакладчыка, прадуманасць у адборы твораў. Імкненне ўзняць беларускую літаратуру да ўзроўню духоўных дасягненняў сусветнай культуры. Стаўленне М. Багдановіча да літаратурнага перакладу.

* Пераклады з нямецкай, французскай, славянскіх моў.

7. Талент М. Багдановіча-вучонага. Стварэнне літаратуразнаўцам навукова абгрунтаванай канцэпцыі развіцця беларускай літаратуры ад стара-

жытнасці да пачатку XX стагоддзя («Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «За сто лет», «Белорусское возрождение» і інш.).

8. Аблічча М. Багдановіча як беларускага крытыка, роздум аб развіцці нацыянальнай паэзіі, лёсе беларускай культуры, яе будучыні («Забыты шлях», «Глыбы і слаі», «За тры гады» і інш.).

* Літаратуразнаўчыя працы М. Багдановіча, яго рэцэнзіі, водгукі на творчасць украінскіх і рускіх мастакоў слова – цікавая старонка творчых сувязей беларускай і ўкраінскай, беларускай і рускай літаратур.

9. Паслядоўнікі М. Багдановіча. «У вянок паэту» – аналіз твораў, прысвечаных паэту-гуманісту.

## Літаратура


1. Багдановіч, М. Зб. тв.: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1991–1993.
2. Багдановіч, М. Выбраныя творы / Максім Багдановіч; уклад. і камент. С. Забродскай [і інш.]; уступ. словы Н. Гілевіча, А. Бяляцкага. – Мінск: Міжнар. фонд «Беларус. кнігазбор», 1996. – 494 с. – (Беларускі кнігазбор. Серыя 1. Мастацкая літаратура.)
3. Максім Багдановіч // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіна. – Мінск: Бел. энцыкл., 1992. – Т. 1. – С. 156–178.
4. Багдановіч, І. Пакліканы Адраджэннем / І. Багдановіч // Багдановіч Максім: поўны зб. тв.: у 3 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – Т. 1. – С. 519–539.
5. Борсук, Н. М. Багдановіч і Г. Гейне. Пераклады беларускага паэта-наватара з творчасці Г. Гейне / Н. Борсук // Жыццём слугуючы Айчыне: зб. матэрыялаў канферэнцыі да 80-х угодкаў праф. Ф. Янкоўскага / БрДУ. – Брэст, 1999. – С. 329–335.
6. Вабішчэвіч, Т. Лірыка М. Багдановіча ў масавым чытацкім асяроддзі нашаніўскага перыяду / Т. Вабішчэвіч // Роднае слова. – № 12. – 2010. – С.16–19.
7. Гніламёдаў, Ул. Яго жыццёвая сіла / Ул. Гніламёдаў // Полымя. – 1992. – № 4. – С. 226–234.
8. Голуб, Т. Іх яднала Бацькаўшчына (аб М. Багдановічу і М. Гарэцкім) / Т. Голуб // Полымя. – 1993. – № 5. – С. 249–253.
9. Грынчык, М. Вацлаў Ластоўскі і М. Багдановіч / М. Грынчык. – Мінск, 1995. – С. 340–345. – (Беларусіка. Кн. 4.)
10. Грынчык, М. На магістралях вершатворчасці. Нацыянальнае вершаскладанне ў 2-ой палове XX ст. / М. Грынчык // Полымя. – 1993. – № 10. – С. 225–229.

11. Дышыневіч, В. Хрысціянскія матывы ў творчасці М. Багдановіча / В. Дышыневіч // Роднае слова. – 1993. – № 6. – С. 21–26.

12. Замоцін, І. М. Багдановіч: крытыка-біяграфічны нарыс / І. Замоцін // Творы: літаратурна-крытычныя артыкулы / склад. Я.М. Гаварушка. – Мінск: Маст. літ., 1991. – С. 52–149.

13. Зубараў, Л. Максім Багдановіч / Л. Зубараў. – Мінск, 1989.

14. Івашын, В. У пошуках красы і гармоніі / В. Івашын // Полымя. – 1993. – № 9. – С. 234–244.

15. Кабаковіч, А. «Я хацеў бы спаткацца з вамі...» / А. Кабаковіч // Пасеянае ўзыдзе. Вершы. Пераклады. Літ.-крыт. арт. – Мінск, 1991. – С. 84–90.

16. Каваленка, В. М. Багдановіч і Бунін. Некаторыя аспекты тыпалагічнай блізкасці / В. Каваленка // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. – 1991. – № 3. – С. 101–109.

17. Казыра, Л. Перакладчыцкая спадчына М. Багдановіча / Л. Казыра // Багдановіч М.: поўны зб. тв.: у 3 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванне, чарнавыя накіды. – С. 540–563.

18. Калеснік, Ул. «Імя яго задумнае – Максім» / Ул. Калеснік // Заря. – 1991. – 7 декабря.

19. Каханоўскі, Г. А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю. З біяграфіі Багдановіча / Г. Каханоўскі. – Мінск, 1991.

20. Качаткова, П. Міфалагічныя вобразы ў ранняй творчасці М. Багдановіча / П. Качаткова // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 7–8. – С. 80–82.

21. Клышка, А. «Здароў, марозны, звонкі вечар!» Паэтыка верша Максіма Багдановіча / А. Клышка // Роднае слова. – 2010. – № 4.– С. 21–22.

22. Конан, Ул. Святло паэзіі і цені жыцця. Лірыка М. Багдановіча / Ул. Конан. – Мінск, 1991.

23. Лёсік, Я. Асноўны матыў у творчасці М. Багдановіча / Я. Лёсік // Полымя. – 1991. – № 12. – С. 177–192.

24. Лойка, А. Паэт нараджаецца не аднойчы / А. Лойка. // Багдановіч М.: поўны зб. тв.: у 3 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванне, чарнавыя накіды.– С. 7–49.

25. Лыч, Л. М. Багдановіч і беларускае адраджэнне / Л. Лыч // Беларуская нацыя і мова. – Мінск, 1994. – С. 137–165.

26. Лявонава, Е. Верш «Мы доўга плылі ў бурным моры…» М. Багдановіча ў падзейна-культурным кантэксце пачатку ХХ ст. / Е. Лявонава // Роднае слова. – № 2. – 2011. – С. 8–12.

27. Майсейчык, А. Пявучых гукаў сіла... Пытанні вершаскладання пры вывучэнні паэзіі М. Багдановіча / А. Майсейчык // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 5. – С. 12–16.

28. Майсейчык, А. А. Пушкін у паэтычным свеце М. Багдановіча / А.А. Майсейчык // Роднае слова. – 1994. – № 6.

29. Міклашэўскі, Я. Каханне і смерць, або лёс М. Багдановіча: раман-даследаванне / Я. Міклашэўскі. – Мінск, 1995.

30. Мушынскі, М. Спадчына Багдановіча-празаіка / М. Мушынскі // Багдановіч М.: поўны зб. тв.: у 3 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванне, чарнавыя накіды. – С. 430–445.

31. Навуменка, І. Максім Багдановіч / І. Навуменка. – Мінск, 1997.

32. Сініла, Г. М. Багдановіч як перакладчык заходнееўрапейскай паэзіі / Г. Сініла // Весн. Белар. універс. Сер. 4. Філалогія. – 1991. – № 3. – С. 3–9.

33. Сініла, Г. Цвёрдыя рамансавыя формы ў кантэксце лірыкі М. Багдановіча / Г. Сініла // Лёс нацыянальнай культуры на паваротах гісторыі: зб. дакладаў. – Мінск, 1995. – С. 47–63.

34. Скуратовіч, А. У сінюю даль: колеры паэзіі М. Багдановіча / А. Скуратовіч // Першацвет. – 1995. – № 8. – С. 125–131.

35. Тарасюк, Л. Пад зоркай Венеры. Лірыка кахання ў паэзіі М. Багдановіча / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 1997. – № 4. – С. 34–37.

36. Хальпукова, К. Міфапаэтыка часава-прасторавага, кантынууму ў лірыцы Янкі Купалы і Максіма Багдановіча / К. Хальпукова // Роднае слова. – № 7. – 2009. – С. 4–6.

37. Чабан, Т. Космас «Вянка»: літаратурны каментарый да «Вянка» М. Багдановіча / Т. Чабан // Багдановіч М.: поўны зб. тв.: у 3 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванне, чарнавыя накіды. – С. 463–518.

38. Шаладонаў, І. Мінулае ў мастацкай канцэпцыі часу паэзіі Максіма Багдановіча / І. Шаладонаў // Роднае слова. – 2010. – № 10. – С. 12–13.

## Для завучвання на памяць
(на выбар)

«Пагоня», «Змяіны цар», «Цёплы вечар, ціхі вечар, свежы стог», «Зорка Венера ўзышла над зямлёю», «Не кувай ты, шэрая зязюля», «Слуцкія ткачыхі», «Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя», «Зразаюць галіны таполі адну за адной...», «Жывеш не вечна, чалавек», санет «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі», «На цёмнай гладзі сонных луж балота», трыялет «Я птушка ў гібкіх трасніках», рандо «Узор прыгожы пекных зор», актава «Як моцны рэактыў...», тэрцыны «Ёсць чары ў забытым, старадаўнім», «Да вагітнай», «Астры», «На чужыне», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы», «Цёмнай ноччу лучына дагарала», «Набягае яно», паэма «Страцім-лебедзь...».

1. Бураўкін, Г. Развітанне з Веранікай / Г. Бураўкін // Сінія арэлі: вершы. – Мінск, 1987. – С. 115.
2. Грахоўскі, С. Сузор'е лебедзя / С. Грахоўскі // ЛіМ. – 1991. – 20 вер. – С. 8.
3. Грачанікаў, А. М. Багдановічу / А. Грачанікаў // Выбранае. – Мінск, 1988. – С. 186–187.
4. Дранько-Майсюк, Л. «Багдановіч, ратуй...» / Л. Дранько-Майсюк // Заря. – 1991. – 5 февр.
5. Жуковіч, В. М. Багдановіч / В. Жуковіч // Цана цішыні: вершы. – Мінск, 1985. – С. 43.
6. Законнікаў, С. Вочы Максіма / С. Законнікаў // ЛіМ. – 1991. – 6 снеж. – С. 1.
7. Каско, А. Багдановічу / А. Каско // Набліжэнне: вершы. – Мінск, 1989. – С. 56–57.
8. Някляеў, У. Перачытваючы Багдановіча / У. Някляеў // Галубіная пошта: вершы. – Мінск, 1987. – С. 59.
9. Рудкоўскі, М. Апошняя малітва М. Багдановіча / М. Рудкоўскі // Засцярога. – Мінск, 1984.
10. Скобла, М. М. Багдановічу / М. Скобла // Дзень паэзіі. – Мінск, 1988. – С. 128.

## ПАДНІМІСЯ З НІЗІН, САКАЛІНА СЯМ'Я!
## ЯНКА КУПАЛА
## (1882–1942)

Перачытайце кнігі, – там
Я паказаў шляхі і зоры,
Я ўсё сказаў маім сынам.
*Я. Купала*

1. Біяграфія Купалы. Літаратурныя настаўнікі. Віленскі і Пецярбургскі перыяды жыцця. Грамадска-асветніцкая і творчая дзейнасць 20–40-х гадоў. Трагізм лёсу. Значэнне спадчыны. Купалазнаўства.
2. Зборнік «Жалейка» (1906) паэтычнае адкрыццё Беларусі, увасабленне годнасці і духоўнай сутнасці беларускага народа. Аналіз вершаў «З песень аб сваёй старонцы», «З песень нядолі», «Песня жней», «Саха», «З песень беларускага мужыка», «Я не сокал», «З пралётных дум», «Спрасоння», «Гэта крык, што жыве Беларусь», «А хто там ідзе?», «Над сваёй Айчынай», «Я відзеў душы сільныя», «Я не паэта», «Зашумеў лес разгуканы», «Там», «Воля», «Ворагам беларушчыны».

- Жанравая разнастайнасць першай паэтавай кнігі (грамадзянская, пейзажная, медытатыўная, інтымная лірыка; сацыяльна і нацыянальна-вызваленчыя матывы; вершы-элегіі, балады, песні, пасланні).

3. Асуджэнне бяспраўя, прыгнёту, грамадскага зла ў ранніх паэмах «Зімою», «Нікому», «Адпалата кахання», «Калека», «У піліпаўку». Асэнсаванне «вечных праблем» наканаванасці, лёсу. Рамантызм і філасафічнасць паэм.

4. Сацыяльна-філасофскі змест паэмы «Адвечная песня» (1908, 1910). Універсальнасць вобраза Мужыка і праблема сэнсу жыцця, сацыяльнай абумоўленасці чалавечага лёсу. Увасабленне агульнагуманістычных ідэй. Кампазіцыйна-вобразная структура твора.

5. Канцэпцыя паэта-прарока, мастака і народа ў зборніку «Гусляр» (1910). Вершы «Я нясу вам дар», «Сон», «Адгукніся, душа», «Гусляр», «Песня і сіла», «К зорам», «Шчаслівасць», «Адцвітанне», «За годам год», «Кругаварот», «Дзяўчынцы», «Ужо днее», «Перад вісельняй», «Песня званара», «Матцы», «З мінуўшых дзён», «Пакахай мяне, дзяўчына» і інш. Нацыянальна-вызваленчая праблематыка зборніка. Купалаўскі рамантызм, тытанізм.

6. Фальклорна-рамантычныя паэмы «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва». Увасабленне лепшых рыс народнага характару і духоўнага ідэалу паэта. Тытанізм свабоднай асобы.

7. Алегарычна-сімвалісцкі стыль паэмы «Сон на кургане» (1910). Сюжэт і кампазіцыя твора. Вобраз Сама – адлюстраванне пакутлівага лёсу беларускага народа на шляху да сацыяльна-духоўнага адраджэння. Вобразы Чорнага, відмаў, Старца і іншых і іх абагульнена-сімвалічнае значэнне.

8. Зборнік «Шляхам жыцця» (1913) і ўвасабленне адраджэнцка-нацыянальных ідэалаў паэта. Вершы «Маладая Беларусь», «Мая думка», «Жняя», «Чым хата багата», «Не для вас», «З кутка жаданняў», «Сваякам па гутарцы», «Папросту», «Забраны край», «Чужым», «Выйдзі», «Гэй, наперад!», «Прарок», «Чорны бог», «Хохлік», «Даўгажданая», «Абдымі», «Не праспі» (Нізка вершаў «Для Яе»), «Над Нёманам».

9. Узнаўленне гарманічнага сялянска-патрыярхальнага ўніверсальнага жыцця ў паэме-ідыліі, «пастаральным рамане» (У. Гніламёдаў) «Яна і я» (1913). Паэтызацыя жыцця і працы чалавека на зямлі, узаемнага кахання, хараства прыроды. Трывога Купалы, каб людзі не здрадзілі зямлі, якая дадзена для шчасця і жыцця.

10. Жарт-вадэвіль «Прымакі» (1913) і асуджэнне сацыяльных і маральных заган (п’янства, абмежаванасць, абыякавасць да жыцця).

11. Маладая і старая Беларусь у п’есе «Паўлінка» (1913). Увасабленне сямейна-бытавых і грамадскіх канфліктаў, канфліктаў пакаленняў.

Вобразы Паўлінкі і Якіма Сарокі як сцверджанне новага ў жыцці. Жанравыя асаблівасці твора.

12. Сацыяльна-філасофская драма «Раскіданае гняздо» (1913) і праблема вызвалення чалавека з-пад сацыяльнай і духоўнай несвабоды. Трагедыя сям'і Зяблікаў і пошукі кожнага з іх. Сямейны і агульначалавечы планы ў творы. Аўтабіяграфізм.

13. Купала і «Наша ніва». Дыскусія 1913 года. Артыкул «Аднаго з «парнасцаў» (Я. Купалы) «Чаму плача песня наша?».

14. Зборнік паэзіі «Спадчына» (1922) і ўвасабленне гісторыі жыцця паэта і Бацькаўшчыны ў гады цяжкіх выпрабаванняў («кардыяграма адраджэння» – У. Гніламёдаў). Кампазіцыя і тэматыка «Спадчыны»: вершы пра вайну, сялянская тэма, філасофскія санеты, грамадзянская і палітычная лірыка, лірыка кахання.

- Вершы «Час», «Свайму народу», «Спадчына», «Для бацькаўшчыны», «Паязджане», «На сход», «У вырай», «Пчолы», «Сон», «Званы», «Забытая карчма», «Наша гаспадарка», «Млечны шлях», «На нашым полі», «Мая навука», «З павяўшай славы», «Не шукай...», «Мой цень», «Беларускія сыны». Вера паэта ў гістарычную справядлівасць і вольную Беларусь.

15. Увасабленне Купалавых адраджэнцкіх ідэалаў і канцэпцыя будаўніцтва беларускай дзяржавы ў публіцыстыцы 1919–1920 гг.: «Адбудова Беларусі», «Зямельная спекуляцыя», «Торжышча», «Беларускае войска», «Больш самачыннасці!», «Антанта», «Маленькі фельетон», «Моладзь ідзе!», «Незалежная дзяржава і яе народы», «Справа беларускага нацыянальнага гімна», «Незалежнасць», «Справа незалежнасці Беларусі за апошні год».

16. П'еса «Тутэйшыя» (1922). Жанр твора. Палітычныя абвінавачванні аўтара і твора. Сцэнічная гісторыя.

- Беларусь, яе народ і інтэлігенцыя ў творы. Вобразы Мікіты Зносака, Янкі Здольніка, Аленкі і Лявона Гарошкаў, Ганулі Зношчыхі.
- Асуджэнне «тутэйшасці» – здрадніцтва і прыстасаванства, страты гістарычнай памяці, абыякавасці да гістарычнага лёсу. Заходні і Усходні вучоныя, Спічыні і інш.
- Роля сімвалаў, абагульненняў, алегорый.

17. Патрыятычная лірыка Купалы пач. 20-х гадоў. Вершы «На смерць Сцяпана Булата», «Арлянятам», «Паўстань...», «Жыды», «Перад будучыняй», «Пазвалі вас», «О так! Я – пралетар?».

- Праблематыка і вобразы паэмы «На куццю».
- Шматгалоссе і скіраванасць у будучыню паэмы «Безназоўнае» (1924). Сэнс назвы і ідэйны змест твора. Вобраз Беларусі. Сродкі

абагульнення традыцыйнай народна-песеннай паэтыкі, алегорыі і сімвалы ў паэме.

18. Праблема мастака і народа, абавязку пісьменніка перад народам і часам у творчасці сярэдзіны 20-х гадоў. Вершы «На Даўгінаўскім гасцінцы», «І прыйдзе...», «За ўсё», «Царскія дары», «У лесе», «Вецер», «Маладая ачуняла», «На паграніччы», «Каб...», «Акоў паломаных жандар...», «Ёсць жа яшчэ...».

- Матывы расчаравання, вобраз абсурднага, штучнага раю ў паэме «З угодкавых настрояў» (1927).

19. Творчасць Купалы канца 20-х – пачатку 30-х гадоў і «рэальны вопыт сацыялістычнага будаўніцтва». Рытарычнасць, дэкларацыйнасць вершаў «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Дыктатура працы», «Песня будаўніцтва», «Настане такая часіна» і іх падтэкст. Артыкул Л. Бэндэ «Шляхам паэта», ідэалагічныя абвінавачванні.

20. «Ляўкоўскія» вершы Купалы і іх ацэнка сучасным літаратуразнаўствам: «Здаецца, было гэта ўчора...», «Сонцу», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Лён», «Вечарынка», «Сыны», «Старыя акопы», «Партызаны», «Госці», «Дарогі», «Сосны», «Дзве дзяўчыны», «Беларусі ардэнаноснай», «Як я молада была...». Паэтава шчырасць і палітычная апалагетыка.

21. Творы Купалы, напісаныя ў рэчышчы «прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму». Паэмы «Над ракой Арэсай», «Барысаў», «Тарасова доля» і іх канкрэтны сацыяльна-грамадскі змест. Ілюстрацыйнасць, публіцыстычнасць і дакументалізм. Услаўленне працы народа. Высакароднасць і патрыятызм аўтара.

22. Татальная эстэтызацыя і ідэалізацыя рэчаіснасці ў зборніках Купалы «Песня будаўніцтву», «Беларусі ардэнаноснай», «Ад сэрца».

23. Публіцыстыка і вершы Купалы часу Вялікай Айчыннай вайны. Артыкулы «Кліч беларускага народу», «Народ-мсцівец», «Партызанскі ўдар» і інш. Вершы «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Беларускім партызанам», «Хлопчык і лётчык на вайне», «Грабежнік», «Дзесяць асінавых колляў», «Паўстаў народ».

* Купала – перакладчык твораў рускіх і украінскіх паэтаў.

- «Слова аб палку Ігаравым». Купала і руская, польская літаратуры.

**Літаратура**

1. Купала, Янка. Поўны збор твораў: у 9 т. / Янка Купала; падрыхт. тэкстаў Г.В. Якаўлевай; камент. С.В. Забродскай [і інш.]. – Мінск: выд. рэсп. унітар. прадпрыемства «Маст. літ.», 2002.
2. Купала, Я. Жыве Беларусь / Я. Купала. – Мінск, 1993.

3. Янка Купала і «Наша Ніва»: Міжнар. навук. канф., 7–8 кастр. 1996, Мінск: да 90-годдзя выд. газ. «Наша Ніва» / склад. С. Панізнік. – Мінск: Бел. выд. т-ва «Хата», 1997. – 197 с.

4. Янка Купала – публіцыст: III Міжнар. Купал. чытанні, 20–21 кастр. 1997, Мінск. / уклад. С. Панізнік; рэд. рада: Ж. Дапкюнас [і інш.]. – Мінск: МФ «Бел. кнігазбор», 1998. – 222 с.

5. Купала, Янка. Выбраныя творы / Янка Купала; уклад. У. Гніламёдава, А. Шамякінай; прадм. Н. Гілевіча; камент. А. Шамякінай. – Мінск: МГА «Бел. кнігазбор», 2002. – 638 с. – (Беларускі кнігазбор: БК. Серыя 1. Мастацкая літаратура.)

6. Янка Купала // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіна. – Мінск: БелЭн., 1994. – Т. 3. – С. 489.

7. Васючэнка, П. Драматургія і час / П. Васючэнка. – Мінск, 1991.

8. Васючэнка, П. Драматургічная спадчына Купалы / П. Васючэнка. – Мінск, 1994.

9. Гапава, В. Перачытваючы «Спадчыну» Янкі Купалы / В. Гапава. – Мінск, 1993.

10. Гілевіч, Н. Прарок народа, сімвал нацыі / Н. Гілевіч // Наст. газ. – 1992. – 11 ліпеня.

11. Гніламёдаў, У. Там чутна Беларусь, там – незалежнасць / У. Гніламёдаў // Звязда. – 1993. – 3 жніўня.

12. Гніламёдаў, У. Цяпер беларускай я песні ўладар / У. Гніламёдаў // Беларуская думка. – 1993. – № 9.

13. Гніламёдаў, У. Янка Купала. Новы погляд / У. Гніламёдаў. – Мінск, 1995.

14. Гніламёдаў, У. Янка Купала: жыццё і творчасць / У. Гніламёдаў; навук. рэд. В.П. Жураўлёў; Нац. акад. навук Беларусі, Дзярж. навук. установа «Ін-т літ. імя Я. Купалы». – Мінск: Бел. навука, 2002. – 237 с.

15. Гніламёдаў, У. Янка Купала: вястун нацыянальнай ідэі: выступленне на вечарыне ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння паэта / У. Гніламёдаў // Роднае слова: штомес. навук.-метад. часоп. / Заснав.: М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – 2007. – № 12. – С. 18–20.

16. Грахоўскі, С. З Купалам у сэрцы / С. Грахоўскі // Беларуская думка. – 1995. – № 7.

17. Дэконская, В. Роздум над купалаўскім рукапісам (аб зборніку «Шляхам жыцця») / В. Дэконская // Маладосць. – 1992. – № 7.

18. Каўка, А. Застаючыся сабою: «Усход» і «Захад» у мастацкім светабачанні Купалы / А. Каўка // Голас Радзімы. – 1995. – № 40.

19. Ластоўскі, В. Успаміны аб Янку Купалу. Шляхам гадоў / В. Ластоўскі. – Мінск, 1992.

20. Лойка, А. Як агонь, як вада... / А. Лойка. – Мінск, 1992.

21. Марціновіч, А. Думаў пра шчасце Беларусі / А. Марціновіч // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 10.

22. Мішчанчук, М.І. Вобраз-канцэпт беларуса ў творчасці Янкі Купалы / М.І. Мішчанчук // Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс XX стагоддзя: манаграфія. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2009. – С. 32–44.

23. Мішчанчук, М.І. Янка Купала – лідэр нацыі: эвалюцыя зместу і формы творчасці (на прыкладзе зборніка «Спадчына») / М.І. Мішчанчук // Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс XX стагоддзя: манаграфія. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2009. – С. 5–18.

24. Мішчанчук, М.І. Янка Купала і традыцыі філасофскай лірыкі / М.І. Мішчанчук // Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс XX стагоддзя: манаграфія. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2009. – С. 18–23.

25. Навуменка, Я. Духоўны воблік героя. Янка Купала / Я. Навуменка. – Мінск, 1992.

26. Платонаў, Р. Зноў пра тутэйшых / Р. Платонаў // ЛіМ. – 1995. – 10 лістапада.

27. Протько, Т. Трагический тридцатый / Т. Протько, П. Лапец, Т. Антонович // Нёман. – 1990. – № 10.

28. Рагойша, В. Бацька нацыі / В. Рагойша // Полымя. – 1992. – № 6 – С. 7.

29. Рагойша, В. Несмяротная душа Беларусі / В. Рагойша // Я. Купала. Жыве Беларусь: вершы, артыкулы / уклад. прадм., камент. В. Рагойшы. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 477 с.

30. Раманоўская, Я. Акопы – творчая калыска Купалы / Я. Раманоўская // Маладосць. – 2010. – № 7. – С. 84–92.

31. Сачанка, Б. Загадка смерці Купалы / Б. Сачанка // Сняцца сны аб Беларусі: літ.-крытычн. арт., інтэрв'ю / Б. Сачанка. – Мінск: Маст. літ., 1990.

32. Сачанка, Б. Бэндэ. 30-я ў абліччах і дакументах / Б. Сачанка // Сняцца сны аб Беларусі: літ.-крытычн. арт., інтэрв'ю / Б. Сачанка. – Мінск: Маст. літ., 1990.

33. Сцяжко, Н. Абразліва звацца «тутэйшымі» / Н. Сцяжко // ЛіМ. – 1990. – 13 ліпеня.

34. Шчаглоў, М. (Куліковіч) Мае ўспаміны / М. Шчаглоў // Маладосць. – 1992. – № 7.

35. Успаміны эмігрантаў пра Янку Купалу // Маладосць. – 1992. – № 6.

36. Ярош, М. Драматургія Янкі Купалы / М. Ярош. – Мінск, 1991.

**Для завучвання на памяць**

«А хто там ідзе?», «Ворагам Беларушчыны», «Перад вісельняй», «Матцы», «Пакахай мяне, дзяўчына», «Паўстань», «Не шукай», «Спадчына», «Не праспі», «Выйдзі», «Моладзі», «Прарок», «Я ад вас далёка», «Ужо днее», «Пакіньма напуста на лёс наракаць», «Воля», «Песня званара», «Над Нёманам», «З мінуўшых дзён».

## НАРОДНЫ ПЯСНЯР
## ЯКУБ КОЛАС
## (1882–1956)

«О, край мой мілы! Усёй душою
Хачу злучыцца я з табою...»

1. Жыццёвы і творчы шлях Я. Коласа. Значэнне творчасці нацыянальнага класіка.
2. Станаўленне і развіццё мастацкай індывідуальнасці Коласа-лірыка. Ранняя паэзія (зборнік «Песні жальбы»), яе тэматыка, рысы стылю. Адметнасці паэтычных твораў савецкага часу («Цені-страхі», «Звон шыбаў», «Покліч», «Голас зямлі», «У родных мясцінах» і інш.).
3. Станаўленне і развіццё творчай індывідуальнасці Коласа-празаіка. Апавяданні рэаліста і сатырыка дарэвалюцыйнага перыяду («Нёманаў дар», «Васіль Чурыла», «Соцкі падвёў», «Тоўстае палена», «Малады дубок», «Пісаравы імяніны» і інш.) і савецкага часу («Дачакаўся», «Крывавы вір», «Сяргей Карага», «Пракурор» і інш.).
4. Маральна-філасофская праблематыка алегарычных навел Я. Коласа «Казкі жыцця». Тэмы, вобразы, мастацкія асаблівасці.
5. Паэма «Новая зямля» як твор нацыянальнага эпасу:
   а) гісторыя напісання паэмы; дакажыце, што «Новая зямля» – энцыклапедыя сялянскага жыцця канца XIX – пачатку XX стагоддзяў;
   б) праблема зямлі як цэнтральная праблема твора, яе шматзначнасць; ці ўласцівы аўтарскай канцэпцыі трагізм яе вырашэння ў дачыненні да лёсу Міхала;
   в) паэтызацыя сялянскай працы і беларуса-гаспадара (вобраз Антося);
   г) беларуская сям’я ў творы; народны побыт, звычаі, святы, мараль;
   д) асаблівасці кампазіцыі, мастацкая роля пейзажных замалёвак, лірычных адступленняў;
   е) пытанне аб жанры паэмы ў літаратуразнаўстве.

- Сродкі прыроднага жывапісу ў паэме «Новая зямля». Як вырашае Я. Колас пытанне суадносінаў самадзейнага, аматарскага масавага мастацтва і сапраўднага, класічнага мастацтва ў паэме «Сымон-музыка»?

6. Паэма «Сымон-музыка»:
   а) гісторыя стварэння паэмы; эстэтычныя і філасофскія праблемы твора;
   б) тэма нацыянальнага мастака і мастацтва, вобраз Сымона;
   в) роля другарадных вобразаў (дзеда Курылы, дзеда Данілы, Яхіма, жабрака, князя і інш.) у раскрыцці сэнсу твора; вобраз Ганны і яго значэнне ў паэме;
   г) асаблівасці жанру і кампазіцыі, роля ўстаўных элементаў, пейзажных малюнкаў, лірычных адступленняў; рамантычная сімволіка і алегорыя ў паэме.
7. Трылогія Я. Коласа «На ростанях»:
   а) творчая гісторыя трылогіі, канкрэтна-гістарычнае і агульначалавечае ў творы (ці можна лічыць трылогію класічным творам?);
   б) духоўныя пошукі Андрэя Лабановіча;
   в) народ у трылогіі, Палессе ў паказе Я. Коласа;
   г) свет кахання ў творы, вобраз Ядвісі (роля вобразаў Людмілы, Марыны);
   д) праблема служэння нацыянальнай інтэлігенцыі народу (вобразы Андросавай, Тукалы, Садовіча, Турсевіча і інш.);
   е) паказ працэсу дэградацыі і дэнацыяналізацыі часткі інтэлігенцыі; чыноўнікі і духавенства ў творы (чым абумоўлены выбар сатырычных сродкаў у стварэнні вобразаў?), адметнасць коласаўскага гумару;
   ж) асаблівасці кампазіцыі і стылю трылогіі, роля пазасюжэтных элементаў, сэнс назваў аповесці і трылогіі ў цэлым; у чым наватарства Коласа на погляд савецкіх і сучасных даследчыкаў.
8. Праўда жыцця і ідэалагічная зададзенасць у аповесцях «На прасторах жыцця», «Адшчапенец» і некаторых творах 30–50-х гадоў.

- Вызначце мастацкую ролю гістарычных фактаў (руска-японскай вайны, падзей рэвалюцыі 1905 года, дзейнасці палітычных партый, Дзяржаўнай Думы і г.д.) у трылогіі «На ростанях».

**Літаратура**

1. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск, 1978.
2. Якуб Колас // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіна. – Мінск: БелЭн., 1994. – Т. 3. – С. 299, 370.

3. Жураўлёў, В. Відушчая сіла сумлення / В. Жураўлёў // Полымя. – 1992. – № 11.

4. Жураўлёў, В. Хто ж ты такі, селянін? (новае прачытанне аповесці «Адшчапенец» Я. Коласа) / В. Жураўлёў // ЛіМ. – 1992. – 30 кастрычніка.

5. Жураўлёў, В.П. Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана / В.П. Жураўлёў; навук. рэд. У.В. Гніламедаў; Нац. акад. навук Беларусі, Дзярж. навук. установа «Ін-т літ. імя Я. Купалы». – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 204 с.

6. Казбярук, У. А праўда мне ўсяго дарожай: перачытваючы «Новую зямлю» / У. Казбярук // Роднае слова. – 1995. – № 8, 9, 10.

7. Конан, У. Беларускі музыка – Арфей / У. Конан // Полымя. – 1992. – № 11.

8. Лойка, А. «Новая зямля». Вытокі, веліч, хараство / А. Лойка. – Мінск, 1961.

9. Ляшук, В. Вывучэнне ў школе трылогіі Я. Коласа «На ростанях» / В. Ляшук. – Мінск, 1996.

10. Марчанка, А. Колеравая карціна свету ў апавяданнях Якуба Коласа нашаніўскага перыяду / А. Марчанка // Роднае слова. – 2010. – № 2. – С. 9.

11. Міхневіч, А.Я. Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца... (выбр. выслоўі нар. песняра) / А.Я. Міхневіч. – Мінск: Бел. дзярж. ін-т праблем культуры, 2002. – 105 с.

12. Мішчанчук, М.І. Якуб Колас і традыцыі беларускай лірыка-філасофскай прозы / М.І. Мішчанчук // Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс XX стагоддзя: манаграфія. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2009. – С. 53–57.

13. Мушынскі, М. Якуб Колас у стасунках з грамадска-палітычнымі дзеячамі Беларусі / М. Мушынскі // Полымя. – 2010. – № 3. – С. 157.

14. Навуменка, І. Якуб Колас: нарыс жыцця і творчасці / І. Навуменка. – Мінск: Нар. асвета, 2003. – 205 с.

15. Шаладонаў, І. Станаўленне асобы і канфлікты эпохі ў ранніх апавяданнях Якуба Коласа / І. Шаладонаў // Полымя. – 2008. – № 10. – С. 169–173.

16. Шаладонава, Ж. «Зямля дасць волі, дасць і сілы...» (вырашэнне праблемы «зямля – селянін» у паэме Я. Коласа «Новая зямля» ў кантэксце часу) / Ж. Шаладонава // Роднае слова. – 1995. – № 10.

## Для завучвання на памяць

«Мужык», «Песняру», «Родныя вобразы», «Голас зямлі», урыўкі з паэм «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогіі «На ростанях».

# «БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ...» МАКСІМ ГАРЭЦКІ (1893–1938)

> Усё жыццё праляцела, як адзін дзень... Цану рэчам пазнаў. Людзей да самых глыбінь уведаў. Жыццём даражыць навучыўся. І да смерці сябе рыхтаваць я ўмею. Каб прыняць яе меч хоць калі, і без пары, і без усякай патрэбы. Дык слава жыццю! Слава і смерці!
>
> ........................................................
>
> Годзе аплакваць прайграныя баі! Рыхтуйся на новыя!..
>
> *М. Гарэцкі*

1. Біяграфія М. Гарэцкага. Трагізм лёсу пісьменніка. Узбагачэнне ім грамадска-сацыяльнага, інтэлектуальна-філасофскага зместу беларускай прозы. Новыя даследаванні лёсу і творчасці Гарэцкага.
2. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Зборнік апавяданняў «Рунь» (Вільня, 1914). Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў «Рунь», «У лазні», «Атрута», «Роднае карэнне», «Страхаццё», «Красаваў язмін», «У панскім лесе», «Лірныя спевы», «Што яно?», «У чым яго крыўда?»:
   а) праблемнасць, напружанне філасофскай думкі. Даследаванне бунтарскіх, супярэчлівых характараў. Вобраз героя-інтэлігента.
3. Публіцыстыка Гарэцкага. Пісьменнік аб маральнай адказнасці беларускай інтэлігенцыі перад народам. Артыкул «Развагі і думкі»: аб сапраўдных прычынах цемнаты і адсталасці беларускага селяніна; ідэя «народнай кніжкі» і бескарыслівай працы на ніве народнай асветы; аб сацыяльна-грамадскіх вытоках беларускага нацыянальна-вызваленчага руху; аб выхаванні ў народным асяроддзі пачуцця самапавагі:
   а) артыкул «Наш тэатр»: абарона правоў беларускага народа на сваю культуру, родную мову; роздум аб шляхах развіцця беларускай літаратуры, драматургіі.
4. Антываенныя творы Гарэцкага. Праблематыка і героі апавяданняў «Літоўскі хутарок», «Рускі», «Генерал», «Уцекачы», «Пакінутыя хаты» і інш. Адлюстраванне складаных падзей ваеннага часу ў дакументальных запісках «На імперыялістычнай вайне». Вобраз Лявона Задумы. Мастацкае паглыбленне ў псіхалогію чалавека. Асуджэнне кровепраліцця і братазабойства на вайне. На якіх падставах даследчыкі параўноўваюць антываен-

ныя творы Гарэцкага з творамі А. Барбюса, Э.М. Рэмарка? Прыгадайце гістарычныя падзеі, у якіх дзейнічае аўтабіяграфічны герой Гарэцкага.

5. Мастацкае асваенне гістарычнай тэмы. Праблематыка апавяданняў «Войт», «Князёўна», «Панская сучка», «Скарб», «Сасна», «Страшная музыкава песня», «Руіны», «У панскай кухні», «Смачны заяц», «Багатая пчэльня» і інш. Актуальнасць звароту пісьменніка да часоў прыгону. Майстэрства псіхалагічнага аналізу. Увасабленне праблем нацыянальнага адраджэння на Беларусі ў аповесці «Дзве душы» (1919). Гісторыя Ігната Абдзіраловіча. Грамадска-духоўныя пошукі героя. Душэўныя пакуты бальшавіка Васіля.

а) інтэлігенцыя і пошукі Бацькаўшчыны. Абдзіраловіч і інтэлігенты-адраджэнцы: Іра Сакавічанка, Мікола Канцавы, Сухавей;
б) асуджэнне крывавай сутнасці бальшавізму. Вобразы Гаршка і Гарэшкі;
в) канцэпцыя нацыянальнага характару ў творы;
г) асаблівасці кампазіцыі і стылю твора;
д) параўнайце гістарычныя падзеі таго часу з іх адлюстраваннем у аповесці.

6. Драматургія Гарэцкага. Лёс беларускага сялянства, яго духоўны патэнцыял і пошукі выйсця з сацыяльнага тупіка ў драматычнай аповесці «Антон». Мастацкі вобраз Антона Жабанёнка і ідэйна-эстэтычны змест твора. Крызіс асобы як выяўленне псіхалагічна-філасофскай скіраванасці канфлікту. Аўтарскае асуджэнне «згубнага свету»:

а) драма «Чырвоныя ружы» – асуджэнне трагічнай традыцыі людскога кровепраліцця. Вобраз пана Нявольскага і яго адносіны да права беларусаў на самавызначэнне. Тэма адплаты. Вобраз Марыні Нявольскай. Вобразы сялян. Асуджэнне стыхіі разбурэння, гвалту. Філасофскі роздум аб гарманічным уладкаванні жыцця пісьменніка-гуманіста;
б) п’еса «Жартаўлівы Пісарэвіч». Тэма выгнання беларусаў з роднай зямлі. Вобраз Пісарэвіча – нацыянальны тып. Даследаванне духоўных, маральных магчымасцей чалавека ў цяжкіх абставінах. Урокі маральнасці, высакароднасці, годнасці і самапавагі, якія даў Пісарэвіч чэрствым людзям і лёсу;
в) праблемна-вобразны аналіз драматычных абразкоў «Атрута», «Гапон і Любачка», «Мутэрка», «Свецкі чалавек», «Жалобная камедыя», «Каменацёс».

7. «Сібірскія абразкі» як мастацкае даследаванне гістарычнага лёсу беларусаў.

8. Аповесць «У чым яго крыўда?». Гісторыя духоўнага станаўлення асветніка-інтэлігента, рамантыка-максімаліста – скразнога героя творчасці

Гарэцкага. Лявон Задума і цёмналесцы. Канфлікт з асяроддзем. Адлюстраванне сацыяльна-грамадскіх супярэчнасцей часу. Асабістая драма шчырага героя. Каларытнасць бытавых малюнкаў, сцэн жыцця беларускай вёскі, іншых слаёў грамадства.

9. Далейшая эвалюцыя героя ў аповесці «Меланхолія». Паглыбленне вобраза Лявона Задумы. Жыццёвыя, духоўна-філасофскія пошукі героя, пакутлівыя сумненні і расчараванні, выпрабаванні характару на трываласць. Пошукі Беларусі. Роднае Цёмналессе і ідэйна-маральнае абнаўленне героя, пераадоленне ўнутранага крызісу:

а) аптымістычны пафас аповесці, жыццесцвярджальная філасофія твора. Малюнкі сялянскага жыцця, паэтычнае апісанне прыроды. Успаміны пра незабыўнае маленства, мужная вера ў будучыню;
б) станаўленне пісьменніцкага майстэрства Гарэцкага ў адлюстраванні народнага жыцця і паглыбленага псіхалагізму характараў.

10. Роздум аб мінулым і будучым беларускага народа ў аповесці «Ціхая плынь». Антываенны пафас твора. Матыў «вялікага шляху» продкаў, сучаснага гістарычнага выбару, нацыянальнага і дзяржаўнага самавызначэння:

а) жыццёвая гісторыя Хомкі Шпака. Трагізм яго лёсу. Пратэст супраць русіфікацыі, духоўнага і фізічнага падаўлення асобы. Рэалістычна-праўдзівы вобраз беларускай вёскі;
б) аўтарская пазіцыя практычнага асветніцтва. Гуманістычнае гучанне твора. Роля лірыка-філасофскіх пазасюжэтных элементаў кампазіцыі.

11. Раман-хроніка «Віленскія камунары» (1931–1933) як адлюстраванне выспявання бунтарскай самасвядомасці і актыўнай гістарычнай дзейнасці працоўнага народа. Асэнсаванне гісторыі як складанага заканамернага працэсу. Кароткая характарыстыка гістарычных падзей, на фоне якіх разгортваюцца асноўныя падзеі твора:

а) гістарычная біяграфія і радавод Мышкаў, іх прага да волі. Велічна-трагічны вобраз Антося Мышкі. Канфлікт з панам Хвастуноўскім;
б) вобраз Міхася Мышкі. Бунтарскі характар Мацея Мышкі. Вобразы яго аднадумцаў;
в) сацыяльна-класавыя кантрасты жыцця губернскага горада: паразітызм пануючых слаёў, беднасць, палітычнае бяспраўе працоўных;
г) героі-камуністы Ром, Тарас, Ракоўскі, Кунігас-Ляўданскі, Вяржбіцкі, Шымілевіч;
д) ідэйна-мастацкая функцыя эпіграфаў (Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Багушэвіча, Цёткі, Ц. Гартнага, М. Чарота і інш.). Месца

рамана ў нацыянальнай літаратурнай класіцы. Умовы напісання твора. З якімі творамі хранікальнага жанру з іншых літаратур можна параўнаць раман «Віленскія камунары»?

12. Творчая задума і гісторыя напісання «Камароўскай хронікі» (1934–1935) – «памінальніцы», «тужыкаў», дзённіка-эпапеі (М. Мушынскі):

а) гістарычны кантэкст жыцця Камароўкі. Рух часу праз лёс пакаленняў. Народная духоўнасць, маральны вопыт, паэтычна-моўнае багацце беларускага працоўнага сялянства ў творы. Побыт вёскі;

б) сялянскія радаводы, сямейныя легенды. Тыповасць лёсаў Задумы-Батуры. Нараджэнне вясковай інтэлігенцыі (Кузьма, Лаўрык, Марынка). Увасабленне жыцця і эпохі. Уплыў значных сацыяльна-гістарычных падзей на чалавечыя лёсы;

в) «Камароўская хроніка» – «апошні паклон вёсцы, з якой выйшаў сам пісьменнік» (А. Адамовіч).

13. Гарэцкі і беларускае літаратуразнаўства:

а) «Што гэта ёсць – літаратура?» (арт. «Развагі і думкі»);

б) беларуская літаратура пач. XX стагоддзя і крытэрыі мастацкасці Гарэцкага («Нашаніўскі перыяд у беларускай літаратуры», «Збіранне і апрацоўка фальклору», «Творчасць Міхася Чарота», «Творчасць Янкі Нёманскага», «Беларуская літаратура пасля «Нашай нівы», «Аркадзь Моркаўка», «Сымон Баранаў», «Ілары Барашка», «Платон Галавач», «Лявон Гмырак», «Беларускае драматычнае пісьменства», «На ўгодкі па Максіму Багдановічу», «Вінцук Дунін-Марцінкевіч», «Уладзіслаў Галубок», «Маладняк» за пяць гадоў);

в) Гарэцкі – аўтар першай «Гісторыі беларускае літаратуры» (Вільня, 1920). Навуковае асэнсаванне шматвяковага шляху беларускай літаратуры, культуры. Перыядызацыя і сістэматызацыя літаратурнага працэсу (тры раздзелы), фарміраванне літаратурнай мовы, перыяды яе росквіту і заняпаду. Роля Гарэцкага ў актывізацыі і развіцці навуковай гісторыка-літаратурнай думкі.

14. «Скарбы жыцця» Гарэцкага. Асэнсаванне ўласнага лёсу, лёсу беларускай інтэлігенцыі, народа, Бацькаўшчыны ў дзённікавых запісах. Увасабленне трагізму эпохі. Алегарызм. Змястоўнасць сімвалічных вобразаў.

## Літаратура

1. Гарэцкі, М. Збор твораў: у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск, 1984–1992.
2. Гарэцкі, М. Творы / М. Гарэцкі. – Мінск, 1990.

3. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск, 1992.

4. Гарэцкі, М. Скарбы жыцця: недрукаваныя творы з літаратурнай спадчыны / М. Гарэцкі // Полымя. – 1993. – № 2.

5. Гарэцкі, М. Успаміны, артыкулы, дакументы / М. Гарэцкі. – Мінск, 1984.

6. Гарэцкі, М. Тэзісы дакладаў і паведамленняў / М. Гарэцкі. – Горкі, 1993.

7. Гарэцкі, Р. Радавод Максіма Гарэцкага / Р. Гарэцкі // Роднае слова. – 1994. – № 2.

8. Гарэцкі, Р. Расстрэл Максіма Гарэцкага / Р. Гарэцкі // ЛіМ. – 1992. – 9 кастрычіка, 16 кастрычніка.

9. Губская, В. Творчыя пошукі М. Гарэцкага на шляху фарміравання беларускай літаратуры / В. Губская // Роднае слова. – 2008. – № 2. – С. 12–14.

10. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю / А. Адамовіч. – Мінск, 1980.

11. Бугаёў, Дз. Пошукі вышэйшага сэнсу / Дз. Бугаёў // Рунь. Апавяданні: рэпрынтнае выданне / М. Гарэцкі. – Мінск, 1994.

12. Бугаёў, Дз. Максім Гарэцкі / Дз. Бугаёў. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 237 с.

13. Вабішчэвіч, В. Погляды Максіма Гарэцкага на гісторыю Беларусі / В. Вабішчэвіч // Роднае слова. – 1994. – № 7, № 8. – 1995. – № 9.

14. Васючэнка П. Дыялектыка душы / П. Васючэнка // Творы / М. Гарэцкі. – Мінск, 1990.

15. Васючэнка, П. Загараванасць «патаемным»: Максім Гарэцкі і сімвалізм / П. Васючэнка // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 13.

16. Далідовіч Г. Чалавек і Майстар / Г. Далідовіч // Маладосць. – 1993. – № 2.

17. Дасаева, Т.М. Максім Гарэцкі і Янка Брыль: тыпалогія малых жанраў / Т.М. Дасаева. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2004. – 113 с.

18. Запартыка, Г. Максім Гарэцкі, 1923 год. Хроніка адной падзеі: на старонках архіўных крыніц / Г. Запартыка // Полымя. – 2008. – № 2. – С. 136–143.

19. Казбярук У. У разгары падзей / У. Казбярук // Полымя. – 1995. – № 10.

20. Кенька, М. Дакументалізм прозы / М. Кенька // Роднае слова. – 1998. – № 6.

21. Кенька, М. Вяртанне да спадчыны / М. Кенька // Роднае слова. – 1993. – № 2.

22. Конан, У. У містычных сферах быцця / У. Конан // Полымя. – 1997. – № 3.

23. Лявонава, Е. Творчасць Максіма Гарэцкага ў кантэксце заходнееўрапейскай літаратуры аб першай сусветнай вайне / Е. Лявонава // Веснік БДУ. – 1996. – № 1.

24. Максім і Гаўрыла Гарэцкія і іх грамадска-культурнае і навуковатворчае асяроддзе: XV Гарэцкія чытанні, Мінск, 7 чэрвеня 2007 г. / рэдкалегія: Р. Гарэцкі (адказны рэдактар) [і інш.]. – Мінск, 2008. – 115 с.

25. Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (да 115-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага): XVI Гарэцкія чытанні: матэрыялы чытанняў, Мінск, 15 лютага 2008 г. / рэдкалегія: Р. Гарэцкі (адказны рэдактар) [і інш.]. – Мінск: Інстытут геахіміі і геафізікі, 2008. – 153 с.

26. Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць: XVII Гарэцкія чытанні: матэрыялы чытанняў, Мінск, 9 красавіка 2009 г.: (прысвячаюцца Году роднай зямлі) / рэдкалегія: Р. Гарэцкі (адказны рэдактар) [і інш.]. – Мінск: [б. в.], 2009. – 199 с.

27. Магульская, С. Духоўнае аблічча інтэлігента ў творах М. Гарэцкага і М. Гогаля / С. Магульская // Весці АН РБ. – 1997.

28. Максімовіч, В. Шляхам служэння Беларусі: старонкі творчасці М. Гарэцкага / В. Максімовіч // Роднае слова. – 2011. – № 3. – С. 10–14.

29. Максімовіч, В. Канцэпцыя асобы ў творчасці М. Гарэцкага / В. Максімовіч // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку ХХ ст. – Мінск, 2000. – 156 с.

30. Марціновіч, А. Тэатр як храм нацыянальнага адраджэння / А. Марціновіч // Сувязь: літ.-крытычн. артыкулы. – Мінск: Маст. літ., 1994.

31. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі: перыяды творчасці / М. Мушынскі // Полымя. – 1998. – № 5.

32. Мушынскі, М. Ахвярую сваім «я»... / М. Мушынскі // Творы / М. Гарэцкі. – Мінск, 1990. – С. 509.

33. Мушынскі, М. Шукайце свайму брату дарогу да праўды. / М. Мушынскі // Творы / М. Гарэцкі. – Мінск, 1990. – С. 482.

34. Мушынскі, М. На пераломе эпох. / М. Мушынскі // Творы / М. Гарэцкі. – Мінск, 1990. – С. 475.

35. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі: перыяды творчасці / М. Мушынскі // Полымя, 2000. – № 10. – С. 172.

36. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі і Якуб Колас: творчыя ўзаемадачыненні ў 20-я гады / М. Мушынскі // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць: XVII Гарэцкія чытанні: матэрыялы чытанняў, Мінск, 9 красавіка 2009 г.: прысвячаюцца Году роднай зямлі / рэдкалегія: Р. Гарэцкі (адказны рэдактар) [і інш.] – С. 29–43.

37. Мушынская, Т. «Ва імя святога адраджэння...» / Т. Мушынская // Роднае слова. – 1993. – № 2.

38. Мяснікоў, А.Ф. Максім Гарэцкі: лёс і таргедыя / А.Ф. Мяснікоў // Вестник Белорусской государственной сельскохозяйственной академии Bulletin of the Belarussian state agricultural academy: научно-методический журнал. – 2010. – № 1. – С. 213–216.

39. Рагойша В. Каб жыць у эпохах / В. Рагойша // Роднае слова. – 1997. – № 6.

40. «Словам адраджаць чалавека»: да 100-годдзя з дня нараджэння М Гарэцкага: тэзісы дакладаў і паведамл. навук. канф., Брэст, 24 сакавіка 1993 г. / БрДУ. – Брэст, 1993. – Ч. 2. – 40 с.

41. Тарасава, Т. Максім Гарэцкі «Дзве душы»: канфлікт экзістэнцыяльнага чалавека і сацыяльнай асобы ў адным лёсе / Т. Тарасава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія і іх грамадска-культурнае і навукова-творчае асяроддзе: XV Гарэцкія чытанні, Мінск, 7 чэрвеня 2007 г. / рэдкалегія: Р. Гарэцкі (адказны рэдактар) [і інш.]. – С. 102–106.

42. Тычына, М. На выспе Патмас / М. Тычына // Роднае слова. – 1993. – № 2.

43. Чыгрын, І. «Віленскія камунары» ці Мацей Мышка і яго родапачынальнікі / І. Чыгрын // Маладосць. – 1994. – № 10.

44. Чыгрын, І. Паміж былым і будучым / І. Чыгрын. – Мінск, 1994.

45. Ярмоленка, А. Максім Гарэцкі і вусная народная творчасць / А. Ярмоленка // Роднае слова. – 2008. – № 8. – С. 105–106.

## «ЗВАНАР НАЦЫІ»
## ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ
## (1883–1938)

«...Быў са мной... дух змагання Беларусі»
*В. Ластоўскі*

1. Жыццёвы і творчы шлях. Грамадска-палітычная і асветніцкая дзейнасць аднаго з вядомых пачынальнікаў нацыянальнага адраджэння.

2. Тэма і матывы паэзіі Власта (вершы «Наперад, замагарна наперад!», цыкл «Конадні», «Рэйнскі вадапад», «Генуэзскі рынак», «Паэт, ты вольнага Пегаса...», «На Смаленскіх сценах», «Пакутнік», «Пішы», «Зорнік», «На каляды», «О Крыўская зямля», «Чытаючы Гамера» і інш.). Патрыятычна-адраджэнскі пафас і філасофская напоўненасць твораў. Адметнасць паэтыкі.

3. Імпрэсіі, апавяданні, легенды і казкі («Нарадзіны», «Слёзы», «Ёсць боль», «Мары», «Лебядзіная песня», «Голад», «Хрыстос нарадзіўся!», «Дзень ружавай кветкі», «Каменная труна», «Троцкі замак», «Брацкія кнігі», «Сож і Дняпро», «Беларускі радавод», «Князёўна Рагнеда», «Узяслаў»,

«Усяслаў», «Юга і Грамавік» і інш.). Тэмы, вобразы, адметнасці мастацкага стылю, асаблівасці мовы пісьменніка.

4. Нацыянальная гісторыя і міфалогія ў кантэксце сусветнай міфалогіі і тэасофіі ў аповесці «Лабірынты». Вобразы інтэлігентаў у творы, іх духоўна-філасофскія пошукі. Рысы жанру філасофска-прыгодніцкай аповесці.

5. Эстэтычныя погляды Ластоўскага-крытыка (артыкулы Юркі Верашчакі «Сплачывайце доўг», «Па сваім шляху» і інш.). В. Ластоўскі як гісторык, мовавед і публіцыст.

* Навуковае значэнне «Кароткай гісторыі Беларусі», самай буйной працы Ластоўскага «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі».

### Літаратура

1. Ластоўскі, В. Творы / В. Ластоўскі. – Мінск, 1997.

2. Вацлаў Ластоўскі // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіна. – Мінск: БелЭн., 1994. – Т. 4. – С. 16–20.

3. Беларусіка Albaruthenica / Міжнар. асац. беларусістаў, Нац. навук.-асвет. цэнтр. імя Ф. Скарыны; рэд. В. Рагойша [і інш.]. – Кн. 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння. – 382 с.

4. Васючэнка, П. Захоплены Лабірынтам: таямніцы творчасці Вацлава Ластоўскага / П. Васючэнка // Роднае слова. – 2008. – № 11. – С. 3–6.

5. Іофе, Э. «Галоўнае – свабода працы» (аб жыцці і творчасці В. Ластоўскага) / Э. Іофе // ЛіМ. – 1991. – 29 сакавіка.

6. Лецка, Я. Валадар слова і духу / Я. Лецка // Маладосць. – 1991. – № 1.

7. Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Шляхамі Вацлава Ластоўскага»: да 125-годдзя з дня нараджэння гісторыка, пісьменніка, акадэміка АН Беларусі, Маладзечна, 4 верасня 2008 г. / падрыхтоўка тэксту і ўкладанне М. Казлоўскага. – Маладзечна: Перамога, 2008. – 45 с.

8. Праневіч, Г. Волата-крывіцкая тэорыя паходжання беларусаў у навуковай мастацкай спадчыне В. Ластоўскага / Г. Праневіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – 2005. – № 1. – С. 36.

9. Снапкоўская, С. «Сыном маладой Беларусі...» (аб педагагічнай спадчыне В. Ластоўскага) / С. Снапкоўская // Роднае слова. – 1993. – № 10.

10. Шадурскі, М. Анталагізацыя утапічнага светапогляду ў «Лабірынтах» В. Ластоўскага / М. Шадурскі // V рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні: матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, прысвечаныя 10-годдзю з дня смерці У.А. Калесніка, г. Брэст, 24–26 кастрычніка 2005 / пад агульнай рэдакцыяй З.П. Мельнікавай. – Брэст: Акадэмія, 2005. – С. 288–294.

11. Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар адраджэння / Я. Янушкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 68 с.

12. Янушкевіч, Я. «Работу беларускую можна рабіць толькі на беларускім грунце...» (лісты В. Ластоўскага да Зоські Верас) / Я. Янушкевіч // Маладосць. – 1997. – № 9.

**Для завучвання на памяць**

«О Крыўская зямля...», «Пакутнік», «Пішы».

## НА ГОРНЕ ДУШЫ
## ЗМІТРОК БЯДУЛЯ
## (1886–1941)

> На шмат крыжах ужо мучылася сэрца маё акрываўленае... Шмат разоў душа мая поўнілася смагай, піла горкі напітак атручанай несправядлівасці... Шмат магілак выкапаў я для невыпаўненых маладых жаданняў...
> .....................................................................
> Кожнае слова маё – шчыры ўспамін убогай вёскі. Кожны радок маёй песні – малюнак перажыванняў гаротнага, простага беларуса.
>
> *З. Бядуля*

1. Звесткі з біяграфіі. Агляд літаратурнай творчасці, навуковай і грамадскай дзейнасці пісьменніка. Арыгінальнасць таленту і ўкладу Бядулі ў беларускую літаратуру. Спадчына Бядулі ў ацэнках літаратуразнаўства.

2. Тэматыка і асаблівасці ранняй лірыкі. Нізкі вершаў «Сілуэты», «Настроі». Эмацыянальная змястоўнасць пейзажных малюнкаў, душэўнага стану лірычнага героя-рамантыка.

- З лірыкай якіх паэтаў рускай і іншых літаратур можна параўнаць паэзію Бядулі гэтага часу? Чым сугучна іх творчасць?

3. Рамантызм скразнога лірычнага героя зборніка «Абразкі» (1913):

   а) сінтэз рэалістычнага, рамантычнага і імпрэсіяніскага стыляў. Аналіз лірычных імпрэсій «Пяюць начлежнікі», «Ратай», «Плач пралескаў», «Нуда мая», «Як памру...», «Не бяжы за кветкай...», «Араты», «Снілася мне казка...», «Загадка», «Нашто мне...».

4. Творчасць Бядулі перыяду імперыялістычнай вайны. Крытычнае пераасэнсаванне ранейшых каштоўнасцей. Гуманістычны пафас асуджэння вайны, боль за лёс чалавека і чалавецтва. Вершы «Мяцежнік», «Ад крыві

чырвонай», «Арліхі», «Вавілон», «Юда жэніцца», «Шатан смерці», «Ты слязамі і крыжамі...». Элементы экспрэсіянісцкага жыццеадчування лірычнага героя.

5. Рэалістычна-бытавыя апавяданні «Пяць лыжак заціркі», «Умарыўся», «Тулягі», «Малыя дрывасекі», «Ашчасліўіла», «Дванаццацігоднікі», «Летапісцы», «Злодзей», «Велікодныя яйкі», «Сымон», «Сон Анупрэя», «На каляды к сыну» і інш. Вострапраблемнасць твораў. Асаблівасці характараў герояў.

6. Літаратурная і культурна-асветніцкая праца Бядулі 1916–1920 гадоў. Публікацыі «Беларускі шлях», «Польская тэорыя», «У бальшавізіі», «Дзесяць прыказанняў для памяці», «Прытчы беларускіх сялян аб бальшавіках», «Народ і інтэлігенцыя», «Да беларускага студэнцтва», «На дарозе да сваёй бацькаўшчыны», «Дзесяць прыказанняў для беларускага жаўнера»:

а) асуджэнне братазабойчай грамадзянскай вайны («Плач Волі», «Вайна», «Антанта» і інш.);
б) тэма Заходняй Беларусі ў творчасці Бядулі гэтага часу («Партызанскі рух у Заходняй Беларусі», «Беларусам пад панскай Польшчай», «Панская ласка», «Кажы, дзе твой сын?», «На балоце», «Воўк», «Хлопчык з-пад Гродна».

7. «Маладнякоўскія» творы Бядулі. Паэмы «Дзед», «З сказаў буры і віхораў», «Госць», «Адплата пану», «Чырвона-чорная жалоба», «У Ясных Крушнях», «Беларусь». Сцвярджэнне і праслаўленне «новага жыцця». Пошукі мастацкай формы, арыгінальнасць метафар, майстэрства ўвасаблення аўтарскай задумы.

8. Творчасць Бядулі перыяду «Узвышша»:

а) праблематыка і героі апавяданняў «Рунь», «Дзед Арцём», «Дэлегатка», «Тры крыжыкі», «Шрам», «Дзве ночы», «Маці»;
б) грамадска-філасофскі змест аповесці «Салавей» як рэакцыя мастака на антыбеларусізацыю. Крытыкі «Узвышша» А. Адамовіч і А. Бабарэка аб праблематыцы твора і сродках рэалізацыі аўтарскай задумы. Сугучнасць твора з тагачасным грамадска-культурным жыццём;
в) вобраз «мужыцкага бога» Сымона-Салаўя. Драматызм лёсу мастака і мастацтва ва ўмовах сацыяльнага і духоўна-нацыянальнага ўціску;
г) Антон Мурашка і іншыя і ідэя народнай волі. Абагульнены вобраз вольналюбівага і таленавітага беларускага народа;
д) глумленне з беларушчыны. Вобразы духоўных катаў: паноў Вашамірскіх, ксяндзоў Марцэвіча і Курачкевіча.

9. Праблема свабоды чалавека, мастака ў аповесці «Тры пальцы». Вобразы скрыпача Тамаша Лукшы і яго антыпода гміннага ката Шпулькі. Ідэя абароны чалавечай годнасці, права асобы жыць сумленна.

10. Пошукі новага станоўчага героя-сучасніка ў аповесці «Таварыш Мінкін». Дакладная мастацкая характарыстыка эпохі «партчыстак». Вобраз Гарбрулёва як увасабленне драматычнага лёсу пераможанага класа, старых спецыялістаў.

11. Раман-гратэск «Язэп Крушынскі». Ацэнкі твора вульгарызатарскай крытыкай (С. Левін, Л. Бэндэ) і сучасным літаратуразнаўствам (В. Каваленка, М. Мушынскі, А. Лысенка):

а) вобразы савецкіх чыноўнікаў, «людзей-партфеляў» як сімвалы абсурднага часу, эпохі ўсеагульнай мімікрыі;

б) беларуская вёска напярэдадні і ў час калектывізацыі. Вобразы-тыпы: Цыпрук Ярэмчык, «Леў Талстой» – Мірон Гарбочык. Дразды і дзятлы. Шчырасць і дасціпнасць сялян.

- Адлюстраванне супярэчлівых адносін беларускай вёскі да новага жыцця. «Калектывізатары» Мікола Ярэмчык і Антось Драчык. Трагізм раскулачвання (Сухарукі, Лейзар):

в) прыстасаванцы браты Крушынскія. «Савецкая маска» Язэпа Крушынскага. «Пралетарскі паэт» Антон Цярэшка, «марксісцкі крытык» Гайдач, айцец Дзмітрый.

- Праўдзівасць і пераканальнасць пісьменніка ў перадачы хаatrapa-віта-супярэчлівай эпохі. Горкае прароцтва мастака і маральна-этычныя дэфармацыі грамадства.
- На якіх падставах можна параўноўваць гэты твор Бядулі з «Запіскамі Самсона Самасуя» А. Мрыя? У чым арыгінальнасць кожнага пісьменніка?

12. Біяграфічныя аповесці «Набліжэнне», «У дрымучых лясах». Гісторыя духоўна-светапогляднага пасталення і станаўлення аўтабіяграфічнага героя. Сацыяльна-побытавае аблічча часу. Дружба працоўных яўрэяў і беларусаў.

13. Аповесць-казка «Сярэбраная табакерка». Філасафізм і актуальнасць зместу. Творчае выкарыстанне палескага фальклору. Пастаноўка ў творы праблем жыцця і смерці, шчасця, сэнсу жыцця чалавека. Казачна-фантастычная форма твора:

а) услаўленне лепшых чалавечых якасцей – смеласці, працавітасці, самаахвярнасці. Вобразы абаронцаў жыцця Дзіда-дзеда Зайца, Люсенькі, Юркі Дратвы, аптэкара Савіцкага. Іх талент, кемлівасць, вынаходлівасць;

б) рыцары смерці – кардынал Баніфацы, пані Сарачынская і інш.

14. Бядуля-фальклярыст, літаратурны крытык і краязнаўца. Артыкулы «Не адным хлебам...», «Купальская ноч», «Жыла, жыве і будзе жыць!», «Ад кустарніцтва да мастацкай творчасці», «Моладзь і краязнаўства», «Класавыя матывы ў беларускай народнай творчасці», «Тэатр і мастацтва», «Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных казках» і інш.

**Літаратура**


1. Бядуля, З. Збор твораў: у 5 т. / З. Бядуля. – Мінск, 1985–1989.
2. Бахановіч, Н.Л. Канцэпцыя творчай асобы ў лірычнай прозе З. Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Весці нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2011. – № 1. – С. 88–93.
3. Гарэцкі, М. Змітрок Бядуля – Ясакар / М. Гарэцкі // Гісторыя белар. літаратуры. – Мінск, 1992.
4. Жыбуль, В. «Нібы камусьці наігрываў сакрэт»: штрыхі да партрэта Хаіма Плаўніка і радаводу З. Бядулі / В. Жыбуль // Полымя. – 2011. – № 4. – С. 3–7.
5. Зуборев, Л. Змитрок Бядуля – белорусский еврей: литературоведческий очерк / Л. Зуборев. – Минск: Книгосбор, 2006. – 150 с.
6. Каваленка, В. Згублены класік / В. Каваленка // ЛіМ. – 1994. – 23 снежня.
7. Каваленка, В. Самаразбурэнне, ці скалечаны лёс (аб часе «пералому» ў творчасці З. Бядулі) / В. Каваленка // Маладосць. – 1995. – № 10.
8. Казека, Я. З далечы гадоў / Я. Казека // Падарожжа ў маладосць: артыкулы, літ. партрэты, успаміны. – Мінск: Маст. літ., 1984.
9. Кульбянкова, І.М. Змітрок Бядуля – майстар «малой прозы»: вучэб. дапам. / І.М. Кульбянкова; Магілёўс. дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова. – Магілёў: Выд-ва МДУ, 2000. – 45 с.
10. Марціновіч, А. Бядуля – зусім не хрэстаматыйны... / А. Марціновіч // ЛіМ. – 1996. – 31 мая.
11. Мельнікава, З. Творчасць Змітрака Бядулі 20–30-х гадоў / З. Мельнікава // Беларуская літаратура. У святле новых фактаў і назіранняў. – Брэст, 1996.
12. Мельнікава, З. «На горне душы…»: забытыя старонкі творчасці Змітрака Бядулі / З. Мельнікава // Тэрмапілы. – 2008. – № 12. – С. 203.
13. Мельнікава, З. «Сярэбраная табакерка» Змітрака Бядулі – духоўны тастамент нашчадкам / З. Мельнікава // Имя и слово: сборник науч. и учеб.-метод. трудов; под ред В.И. Сенкевича. – Брест: БрГУ имени А.С. Пушкина, 2003. – Вып. 1. – С. 132–147.
14. Мельнікава, З.П. Праблематыка рамана З. Бядулі «Язэп Крушынскі»: патэнцыял метакамунікатыўнасці твора / З.П. Мельнікава // Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучасны стан,

перспектывы: мат. міжнар. навук. канф., 18–19 снежня 2003 г.: у 2 ч. – Брэст: БрДу імя А.С. Пушкіна, 2004. – Ч. 1. – С. 144–147.

15. Мельнікава, З. «На горне душы…»: творчасць З. Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX ст.: манаграфія / З. Мельнікава. – Брэст: БрДу імя А.С. Пушкіна, 2001. – 222 с.

16. Навуменка, І. На струнах душы: жыццё і творчасць З. Бядулі / І. Навуменка // Роднае слова. – 1996. – № 4.

17. Навуменка, І. Ранні Бядуля / І. Навуменка // Полымя. – 1994. – № 11.

18. Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 226 с.

19. Шымановіч, В. «Клічу вас к жыццю!..»: публіцыстычнае слова З. Бядулі ў «Нашай ніве» / В. Шымановіч // Роднае слова. – 1996. – № 4.

20. Шымановіч, В. «Мы з табою вечна жыць будзем» / В. Шымановіч // Роднае слова. – 1995. – № 4–5.

## ДАР ПАЭТА
## АЛЕСЬ ГАРУН
## (1887–1920)

Аккорды будуць жыць – твой дар, паэт, – на волі,
А з імі будзе жыць, хто плакаў і стагнаў...

*М. Чарот*

1. Цярністы шлях А. Гаруна – выгнанніка і катаржаніна. Вяртанне творчай спадчыны паэта, празаіка, драматурга, крытыка. Вытокі, аснова і пафас творчасці А. Гаруна. Першыя яго паэтычныя спробы. Рост чалавечай і нацыянальнай свядомасці ў душы падлетка (па паэме «Мае коляды»).

2. Сібірскі перыяд жыцця і творчасці А. Гаруна. Супрацоўніцтва з газетай «Наша Ніва». Зборнік «Матчын дар». Наватарства зборніка, асаблівасці яго кампазіцыі. Жанрава-тэматычная адметнасць кожнага з трох раздзелаў. Схільнасць паэта да філасофскіх разважанняў, містыкі. Роля пейзажных замалёвак. Сувязь інтымнай лірыкі з агульным пафасам беларускай дэмакратычнай паэзіі.

3. Паглыбленне грамадзянскіх, філасофскіх, інтымных матываў у вершах, напісаных пасля звароту А. Гаруна з Сібіры. Высокая паэтычная культура твораў А. Гаруна, наследаванне традыцыям Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Спалучэнне публіцыстычнасці з алегарычнай вобразнасцю. Зварот да жанраў «высокай паэзіі». Сувязь паэзіі А. Гаруна з вуснай народнай творчасцю.

- Сугучнасць матываў трагічнай сутнасці адвечнага канфлікту паміж асобай і грамадствам у паэзіі М. Лермантава і А. Гаруна.

4. Творчыя пошукі А. Гаруна ў галіне прозы. Пашырэнне пісьменнікам ідэйна-тэматычных абсягаў беларускай літаратуры. Роздум А. Гаруна аб лёсе, будучыні беларускага народа («У Панасавым сяле», «Пан Шабуневіч»), аб узаемаадносінах паміж мужчынам і жанчынай («П'ера і Каламбіна»), аб сіле і глыбіні пачуццяў, што бяруць верх над розумам («Маладое»), аб жыцці карэнных сібіракоў і палітычнага пасяленца, выхадца з Беларусі, у Сібіры («Свята»). Узбагачэнне беларускай прозы новымі жанрамі. Празаічны трыпціх («П'ер і Каламбіна»). Прыём фантастыкі ў раскрыцці ідэйна-мастацкай канцэпцыі твора («Маладое», «У Панасавым сяле»).

5. Дар драматурга. Свет дзіцячых уяўленняў у п'есах А. Гаруна. Услаўленне маральных прынцыпаў справядлівасці, непрымірымасці да падману, пачуцця спагадлівасці людзям. Шматграннасць таленту аўтара п'есы «Хлопчык у лесе». Нетрадыцыйная трактоўка вобраза жабрачкі («Шчаслівы чырвонец»). Арганічнае спалучэнне народнай казачнай фантастыкі і багацця творчай фантазіі драматурга («Дзіўны лапаць»).

6. Роля А. Гаруна ў развіцці беларускай літаратуры, ацэнка яе сучаснікамі паэта і нашчадкамі. Якая думка аб'ядноўвае вершы А. Сыса, М. Чарота, А. Аркуша, прысвечаныя памяці А. Гаруна?

## Літаратура


1. Гарун, А. Матчын дар / А. Гарун. – Мінск, 1988.
2. Гарун, А. Сэрцам пачуты звон / А. Гарун. – Мінск, 1991.
3. Аўсянік, А. Успаміны аб Алесю Гаруну / А. Аўсянік, А. Будзька // На суд гісторыі. Успаміны. Дыялогі / А. Аўсянік [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 39–60.
4. Багдановіч, І. Кола паплечнікаў і паслядоўнікаў (Алесь Гарун) / І. Багдановіч // Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. – Мінск, 2001. – 204 с.
5. Алесь Гарун // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіна. – Мінск: БелЭн., 1993 – Т. 2. – С. 142–146.
6. Гарбінскі, Ю. «Народу на алтар свой дыямент прынёс...» / Ю. Гарбінскі // Вяртання маўклівая споведзь. – Мінск, 1994. – С. 122–158.
7. Гарбінскі, Ю. Публіцыстыка А. Гаруна / Ю. Гарбінскі // Спадчына. – 1991. – № 1. – С. 25–26.
8. Гарбінскі, Ю. «Жыцця недапісаны ліст...»: з новых матэрыялаў пра А. Гаруна / Ю. Гарбінскі, В. Скалабан // Шляхам гадоў: гіст.-літ. зб. / уклад. У. Мархель. – Мінск, 1994. – С. 195–211.
9. Гарбінскі, Ю. Сібірскія дарогі беларускай гісторыі (знаходкі ў архіве пра лёс літаратараў Я. Лёсіка, А. Прушынскага) / Ю. Гарбінскі, А. Жынкін // Маладосць. – 1992. – № 3. – С. 139–145.

10. Гарбінскі, Ю. Дар А. Гаруна / Ю. Гарбінскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 11. – С. 48–55.

11. Грамадчанка, Т. Радкі з любві народжаных слоў (лёс і творчыя набыткі А. Гаруна) / Т. Грамадчанка // Роднае слова. – 2002. – № 3. – С. 7.

12. Казбярук, У. «Вызваль дух свой, рабскі люд!» Жыццёвы і творчы шлях А. Гаруна / У. Казбярук // Роднае слова. – 1997. – № 3. – С. 11–25.

13. Казбярук, У. Пакутлівы шлях набыткаў (А. Гарун) / У. Казбярук // Полымя. – № 7–8. – С. 245.

14. Казбярук, У. Церневыя і лаўровыя вянкі А. Гаруна: творчасць А. Гаруна / У. Казбярук // Сэрцам пачуты звон: Паэзія. Проза. Драматургія. Публіцыстыка / А. Гарун; уклад. У. Казбярук. – Мінск, 1991. – С. 5–28.

15. Казбярук, У. «Вызваль дух свой, рабскі люд!» / У. Казбярук // Матчын дар / А. Гарун; уклад. У. Казбярук. – Мінск, 1995. – С. 4–11.

16. Казбярук, У. Светлай волі зычны звон. Алесь Гарун / У. Казбярук. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991.

17. Лебедзеў, У. Паэзія А. Гаруна. Зборнік «Матчын дар» / У. Лебедзеў // Белар. літаратура. У святле новых фактаў і назіранняў: вучэбны дапаможнік / БрДУ. – Брэст, 1996. – Выпуск 1. – С. 57–71.

18. Мазоўка, Н. Паэт у няволі. Матэрыялы судовай справы А. Гаруна / Н. Мазоўка // Шляхам гадоў: гіст.-маст. зб. – Мінск, 1990. – С. 187–192.

19. Марціновіч, А. Каб не парывалася сувязь часоў (аб творчай спадчыне А. Гаруна) / А. Марціновіч // Далучанасць : літаратурна-крытычныя арт., рэц., эсэ / А. Марціновіч. – Мінск: Мастацкая літаратура. 1990. – С. 4–7.

20. Навумовіч, У. Алесь Гарун: станаўленне творчай індывідуальнасці паэта / У. Навумовіч // Міфалогія – фальклор – літаратура: праблемы паэтыкі: зб. навук. прац / Беларус. дзярж. ун-т, Філал. фак., Каф. тэорыі літ., Каф. беларус. лінгвістыкі і міфалогіі. – 2008. – Вып. 6. – С. 84–89.

21. Рагойша, У. «Матчын дар» А. Гаруна і «Вянок» М. Багдановіча: спроба тыпал. параўнання / У. Рагойша // Бел. літ. Рэспуб. міжвед. зб. / Гомельскі дзяржаўны універсітэт. – Мінск, 1992. – Вып. 20. – С. 29–37.

22. Рагойша, У. Этапы А. Гаруна / У. Рагойша // Полымя. – 1990. – № 7. – С. 220–230.

23. Сачанка, Б. Аляксандр Прушынскі – Алесь Гарун / Б. Сачанка // Сняцца сны аб Беларусі: літ.-крыт. арт., інтэрв’ю. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – С. 277–281.

**Для завучвання на памяць**

«Ты, мой брат, каго зваць беларусам», «Жыццё», «Хмары», «Гімн роднай мове», «Лісток і надзея», «Думкі-дыяменты, краскі жыцця», «Мае думкі», «Матчын дар», «Мілая, родная старонка-маці!», «Дзяўчынка – сэрца сябе не трывож», «Як ліст вярбінкі маладой», «Адбітак», «Дакоры».

# «АСВЯТЛЯЦЬ ДУШУ БЕЛАРУСА ДОБРЫМ ТЭАТРАМ» УЛАДЗІСЛАЎ ГАЛУБОК (1882–1942)

Асвятляць душу і розум працоўнага беларуса... Гэткая задача наўрад ці была пасільнай нават для такога таленавітага калектыву, як тэатр Галубка. Аднак колькі ў гэтай задуме хараства і высакароднасці! Ажыццяўляючы яе, драматург вырастаў у значную пісьменніцкую і грамадскую постаць. Грандыёзнасць мэты абумовіла шырыню ідэйна-тэматычнага дыяпазону яго п'ес. Пачаўшы з апрацовак, са сцэнічных адаптацый сваіх апавяданняў... Галубок прыйшоў да напісання буйных драматычных палотнаў, багата насычаных думкамі пра мінулае і сучаснае беларускага народа, пра яго гістарычную місію...

1. Звесткі з біяграфіі У. Галубка. Трагічны лёс мастака. Яго ўклад у развіццё і станаўленне беларускай драматургіі і тэатра ў ацэнках сучаснага літаратуразнаўства.
2. Празаічныя творы У. Галубка і іх жанравыя адметнасці: «Журавінка», «Не паклаўшы, не возьмеш», «Марымонавы сабакі», «Чужое смачней», «Адукаваная кабыла» і інш. М. Багдановіч аб апавяданнях У. Галубка.
3. Праблематыка вершаў У. Галубка ў кантэксце нашаніўскай паэзіі. «Доля мужыка», «Чакай, браце!..», «Забытая хатка», «Будучыня», «Сярмяжнік».
4. Далучэнне да тэатральнай справы і драматургічнай дзейнасці. Дзейнасць у «Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі» (1913–1917). Рэарганізацыя «Таварыства» («Беларускі савецкі тэатр»). Культасветніцкая дзейнасць вандроўнай тэатральнай трупы Галубка. Дзейнасць БДТ-3.
5. Праблемна-вобразны аналіз п'ес У. Галубка «Апошняе спатканне», «Пісаравы імяніны», «Ганка», «Суд» і інш. Ідэйна-мастацкія пошукі Галубка-драматурга. Жанрава-стылявыя асаблівасці меладрам і бытавых камедый. Уплыў традыцый батлейкі і скамарохаў. М. Гарэцкі аб п'есах У. Галубка.
6. Наватарства У. Галубка ў распрацоўцы жанру фальклорна-гістарычнай п'есы. Аналіз п'ес «Пан Сурынта», «Плытагоны». Уплыў драматургічнай класікі на творчасць У. Галубка.

- Традыцыі Шэкспіра, Мальера, Купалы і іншых выдатных камедыёграфаў і галубкоўская драматургія.

**Літаратура**

1. Галубок, У. Творы / У. Галубок. – Мінск, 1983.
2. Гарэцкі, М. У. Галубок / М. Гарэцкі // Гісторыя беларускай літаратуры. – Мінск, 1992. – С. 364.
3. Завадская, І. Яму не было замены: пра Уладзіслава Галубка / І. Завадская // Роднае слова. – 2002. – № 5. – С. 72.
4. Замкавец, У. Жыццё, абарванае куляй / У. Замкавец // Полымя. – 1993. – № 8. – С. 138–146.
5. Лаўшук, С. Паплечнік волатаў беларускай культуры: Уладзіслаў Іосіфавіч Галубок (Голуб) / С. Лаўшук // ЛіМ. – 2007. – 28 снежня. – С. 14.
6. Уладзіслаў Галубок // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. МАльдзіна. – Мінск: БелЭн., 1993. – Т. 2. – С. 97.
7. Сабалеўскі, А. Тэатр Уладзіслава Галубка / А. Сабалеўскі // Роднае слова. – 2007. – № 5. – С. 76.

## «МЫ – МАЛАДНЯК НОВАГА ЗМЕСТУ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ»
## Дзейнасць і творчасць літаратурна-мастацкай арганізацыі «Маладняк» (1923–1928)

Мы маладняк гэтых новых усходаў і разрастаемся на загонах беларускай мастацкай творчасці, выціскаючы ўвесь чэмер і палын, што аддае затхласцю мінулага.

*Маладняк (замест дэкларацыі)*

Маладнякоўскі рух быў несумненным выражэннем перш за ўсё палітычнай, сацыяльнай, нацыянальнай актыўнасці маладых у беларускай літаратуры канкрэтнага часу... «Маладняк» меў на мэце паставіць мастацкую літаратуру на службу сацыялізму, здзейсненай рэвалюцыі; але рабіў гэта залішне прамалінейна, публіцыстычна.

*І. Чыгрын*

1. Часопіс ЦК КСМБ «Маладняк» (кастрычнік 1923 г.) і заснаванне літаратурна-мастацкай арганізацыі «Маладняк» (28 лістапада 1923 г.). «Група песняроў-заснавальнікаў»: М. Чарот, А. Александровіч, А. Дудар, Я. Пушча, А. Вольны, А. Бабарэка.

2. Праграма «Маладняка» (дэкларацыя, снежань 1924 г.). «Ажыццяўленне ідэі матэрыялізму, марксізму, ленінізму ў беларускай мастацкай творчасці...»; мастацкі вобраз і аб'ектыўная рэальнасць. Дэкларацыя 1925, 1926 гадоў аб размежаванні творчай і культурна-мастацкай працы, аб барацьбе за «марксісцкую крытыку» і інш. Сацыяльна-культурная і ідэалагічна-масавая скіраванасць дзейнасці «Маладняка».

3. Першы Усебеларускі з'езд «Маладняка» (1925 г.). А. Бабарэка аб станоўчым і адмоўным у дзейнасці арганізацыі: «Маладняк і яго месца ў літаратуры».

4. Культурна-асветніцкая дзейнасць «Маладняка». Маладнякоўскія філіі і іх значэнне. Узмацненне творчых кантактаў і літаратурных узаемасувязей. Узаемапераклады. Назавіце аналагічныя літаратурна-мастацкія арганізацыі гэтага часу ў рускай, украінскай, іншых літаратурах. Што агульнае ў іх дзейнасці? «Маладняк» і РАПП.

5. Фальклор, беларуская рэвалюцыйна-дэмакратычная літаратура канца XIX – пачатку XX ст., творчасць старэйшых пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі, М. Гарэцкага ў ацэнках маладнякоўскіх крытыкаў Т. Глыбоцкага (А. Дудара), М. Аляхновіча, А. Бабарэкі, У. Гайдукевіча. Барацьба са «старымі літаратурнымі школамі».

6. Творчасць маладнякоўцаў у ацэнках старэйшых пісьменнікаў. Артыкул М. Гарэцкага «”Маладняк” за пяць гадоў». Стылёва-жанравыя асаблівасці твораў маладнякоўцаў. Перавага жанраў паэзіі (грамадзянская лірыка, верш, песня, прыпеўка). Сімвалічная абагульненасць вобразаў, дэкларацыйнасць, публіцыстычнасць, рэвалюцыйна-рамантычная скіраванасць. Уплывы розных літаратурных напрамкаў (рамантызму, імажынізму, футурызму).

7. Арганізацыйна-творчы крызіс «Маладняка». Выхад з аб'яднання У. Дубоўкі, К. Чорнага, К. Крапівы, А. Бабарэкі, Я. Пушчы, П. Глебкі, М. Лужаніна, С. Дарожнага, В. Шашалевіча (1926 г.) і ўтварэнне «Узвышша»:

а) «чыстка радоў» «Маладняка» (канец 1927 – пачатак 1928 гг.). Выхад з арганізацыі заснавальнікаў М. Чарота, А. Дудара, А. Александровіча, М. Зарэцкага, А. Вольнага, В. Сташэўскага. Далучэнне іх да старэйшых пісьменнікаў: Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, У. Галубка, А. Нёманскага і ўтварэнне «Полымя» (16 студзеня 1928 г.);

б) уваход «Маладняка» ў расійскую літаратурна-мастацкую арганізацыю ВАПП і ўтварэнне БелАПП (лістапад 1928 г.).

8. Дзейнасць і творчасць маладнякоўцаў (М. Чарот, К. Крапіва, А. Дудар, У. Дубоўка, А. Александровіч, А. Вольны, Н. Чарнушэвіч, А. Моркаўка, Я. Пушча, А. Якімовіч, П. Трус, П. Глебка, А. Звонак, М. Хведаровіч, П. Броўка, М. Лужанін, Ул. Хадыка, Т. Кляшторны, С. Дарожны, В. Маракоў, З. Астапенка, Ю. Таўбін, А. Куляшоў, М. Багун, Ю. Гаўрук, А. Русак, С. Шушкевіч, А. Дзяркач, Ю. Лявонны, М. Дуброўскі, С. Ліхадзіеўскі, С. Фамін, З. Бандарына, Н. Вішнеўская, Я. Пфляўмбаўм, Я. Бобрык, Я. Туміловіч, Із. Плаўнік, В. Казлоўскі, А. Вечар, Я. Падабед, Я. Кохан, Г. Сапрыка, Я. Сукала і іншыя) у гісторыі станаўлення беларускай літаратуры. Значэнне іх творчай практыкі для наступных пісьменніцкіх пакаленняў. Літаратурна-мастацкая арганізацыя «Маладняк» у ацэнках сучаснага літаратуразнаўства (Н. Гілевіч, І. Чыгрын, У. Конан, М. Мушынскі і інш.).

9. Літаратура «Маладняка» ў постацях:
   а) творчасць Андрэя Александровіча (1906–1963);
   б) творчасць Алеся Дудара (1904–1946);
   в) творчасць Паўлюка Труса (1904–1929);
   г) творчасць Міхася Чарота (1896–1937);
   д) творчасць Станіслава Шушкевіча (1908–1991);
   е) творчасць Сымона Баранавых (1900–1942);
   ж) творчасць Барыса Мікуліча (1912–1954);
   з) творчасць Рыгора Мурашкі (1902–1944);
   і) творчасць Хвядоса Шынклера (1903–1942).

## Літаратура

*Мастацкія творы:*

1. Александровіч, А. Творы / А. Александровіч. – Мінск, 1981.
2. Дудар, А. Вежа: вершы і паэмы / А. Дудар. – Мінск, 1984.
3. Трус, П. Творы / П. Трус. – Мінск, 1977.
3. Чыгрын, І. Мрый Андрэй / І. Чыгрын // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – Т. 4. – С. 334–335.

4. Бугаёў, Д. Сатырычная проза А. Мрыя / Д. Бугаёў // Полымя. – 1993. – № 2. – С. 229–235.

5. Васючэнка, П. Летапісец шапялеўскай эпохі / П. Васючэнка // Вяртання маўклівая споведзь. – Мінск: Выш. школа, 1994. – С. 225–235.

6. Васючэнка, П. Трагедыя пісьменніцкага лёсу / П. Васючэнка // Полымя. – 2000. – № 5. – С. 256–260.

7. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 657 – 672.

8. Казлоў, А. Бюракратызм і літаратурная сатыра / А. Казлоў // Маладосць. – 2002. – № 11–12. – С. 144–149.

9. Казлоў, А. Сацыяльна-побытавая і палітычная сатыра ў рамане «Запіскі Самсона Самасуя» А. Мрыя / А. Казлоў // Роднае слова. – 2003. – № 9. – С. 22–25.

10. Лецка, Я. З захапленнем і любасцю / Я. Лецка // Полымя. – 1990. – № 8. – С. 214–217.

11. Маракоў, Л. Вядомы пад псеўданімам А. Мрый / Л. Маракоў // Роднае слова. – 2001. – № 9. – С. 97–102.

12. Марціновіч, А. Каб не парывалася сувязь часоў / А. Марціновіч // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1989. – № 9.

13. Мішчанчук, М. Прага духоўнага ачышчэння. Агульны кірунак і жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы А. Мрыя / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура 20 ст. – Мінск: Выш. школа, 2001. – С. 179–185.

14. Чыгрын, І. Крокі «Узвышша»: проза // І. Чыгрын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 121–140.

## БОГАМ ДАДЗЕНЫ ТАЛЕНТ
## ЛУКАШ КАЛЮГА
## (1909–1937)

> Дзяўблі мне ў школе, што бедная, нязграбная наша краіна. Не, думаю, не можа гэтага быць. Сам на свае вочы пагляджу, адно толькі каб узбіцца на свой хлеб. І цяпер я ведаю, што няма лепшага краю над наш. От чаму так шмат тут навілі гнёздаў гэтыя груганы... Крукі не будуць гняздзіцца, дзе блага жыць.
>
> *Л. Калюга*

1. Звесткі з біяграфіі. Творчасць узвышэнскага перыяду. Трагізм лёсу. Л. Калюга ва ўспамінах сучаснікаў. Месца творчасці пісьменніка ў літаратурным працэсе 20–30-х гадоў.

2. Канцэпцыя самабытнасці чалавека, годнасці асобы, любоў да вёскі і яе жыхароў у апавяданнях «Вясна», «Лук'ян – кааперацыўскі сабака», «Трахім з Пагулянкі», «Трахім – штучны чалавек», «Іллюк-дослед-

чык», «Тахвілін швагер», «Баркаўцы – добрая вёска…», «Вам знаёмае» і інш. Апісанне нораваў і каларытнасці вясковага жыцця, сцверджанне яго самакаштоўнасці. Спалучэнне гумару і чалавекалюбства ў абмалёўцы герояў. «Узвышэнскія» эстэтычныя прынцыпы і іх рэалізацыя ў навелах пісьменніка. Асаблівасці мовы.

3. Аповесць «Ні госць, ні гаспадар» (1928 г.). Паэтызацыя традыцый народнага жыцця. Аналітызм і эпічнасць у творы. Адлюстраванне маральна-этычных і ідэалагічных дэфармацый, прадчуванне разбурэння асноў быцця беларускай вёскі. Трагічная раздвоенасць унутранага свету маладога пакалення. Асаблівасці мовы і стылю

4. Аўтабіяграфізм аповесці «Нядоля Заблоцкіх» (1931). Асэнсаванне «вечных» праблем існавання чалавека і гістарычнага шляху народа. Падтэкставасць твора, элементы філасофскай прыпавесці, свет народных паданняў і звычаяў. Разнастайнасць чалавечых тыпаў і характараў. Сродкі гумару ў аповесці.

5. Незакончаныя «Творы з-за крат» (1933–1935 гг.). Праблематыка рамана «Пустадомкі». Вобраз Маркі і пратэст супраць неспрыяльных абставін і тагачаснай рэчаіснасці. Шматзначнасць аўтарскіх інтанацый. Вобраз сонца як сімвалічнае ўвасабленне любові да Бацькаўшчыны, свайго народа.

6. Аповесць «Дзе косці мелюць» – адлюстраванне лагернай долі беларускага пісьменніка. Абагульнены вобраз «аблудных бесхацімцаў». Вобраз Беларусі: апісанне народных традыцый, свят. Веліч Бацькаўшчыны і сум па ёй. Параўнайце «Творы з-за крат» са «Скарбамі жыцця» М. Гарэцкага. Што ў іх агульнага?

7. Роздум над лёсам беларускай моладзі ў аповесці «Зоры вядомага вам горада». Праблема беларускай вёскі і горада, нацыянальнае аблічча жыхароў, іх побыту. Перавага вясковай маралі і этыкі.

8. Празаічны накірунак, створаны пісьменнікам. Проза Л. Калюгі ў кантэксце нацыянальнай і сусветнай літаратуры. Сучаснае літаратуразнаўства аб творчасці пісьменніка.

## Літаратура


1. Калюга, Л. Творы / Л. Калюга. – Мінск: Маст. літ., 1992.
2. Калюга, Л. Пустадомкі / Л. Калюга // Полымя. – 1990. – № 8.
3. Алейнік, А, Мастацкія асаблівасці аповесці Л. Калюгі «Зоры вам вядомага горада» / А. Алейнік // Весці НАН Беларусі. – 2002. – № 1. – С. 96–100.
4. Чыгрын, І. Калюга Лукаш / І. Чыгрын // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – Т. 3. – С. 121.

5. Вышынскі, М. Ні госць ні гаспадар / М. Вышынскі, Л. Калюга. – Мінск: Маст. літ., 1974.

6. Вышынскі, М. З любасцю да людзей / М. Вышынскі // Полымя. – 1974. – № 10.

7. Гінтаўт, Ф. Успаміны пра сябра / Ф. Гінтаўт // Творы / Л. Калюга. – Мінск: Маст. літ., 1992. – С. 594.

8. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 690–710.

9. Грахоўскі, С. Лукаш Калюга / С. Грахоўскі // Так і было. – Мінск: Маст. літ., 1986.

10. Дасаева, Т. Пошукі героя: з вопыту беларускай прозы 20-х гадоў / Т. Дасаева. – Мінск, 1993.

11. Драздова, З. Чараўнік беларускай класікі (творчая асоба Л. Калюгі) / З. Драздова // Полымя. – 2000. – № 4. – С. 230–236.

12. Копчык, П. З віхуры «кручаных» дзён / П. Копчык // ЛіМ. – 1990. – № 38.

13. Лецка, Я. Чараўнік слова / Я. Лецка // Творы / Л. Калюга. – Мінск: Маст. літ., 1992. – С. 5.

14. Лецка, Я. Залатое слова прасветленай душы / Я. Лецка // Роднае слова. – 1994. – № 10. – С. 3–8.

15. Лецка, Я. Богам дадзены талент / Я. Лецка // Вяртання маўклівая споведзь / рэцэнзент С. Андраюк. – Мінск: Выш. школа, 1994. – С. 236–257.

16. Маракоў, Л. Новае пра Л. Калюгу / Л. Маракоў // Роднае слова. – 1999. – № 9. – С. 194–196.

17. Марціновіч, А. Каб не парывалася сувязь часоў / А. Марціновіч // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1998. – № 9.

18. Марціновіч, А. Напісана за кратамі / А. Марціновіч // ЛіМ. – 1990. – 26 студзеня.

19. «…Робімся простымі людзьмі…» Пісьмы Пушчы, Жылкі, Калюгі і інш. да П. Глебкі // Беларусь. – 1990. – № 12.

20. Скрыган, Я. Каляровы аловак / Я. Скрыган // Некалькі хвілін чужога жыцця. – Мінск: Маст. літ., 1979.

21. Чыгрын, І. Крокі: проза «Узвышша» / І. Чыгрын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989.

22. Янкоўскі, Ф. Чытаючы Кастуся Вашыну: Старонкі з дзённіка / Ф. Янкоўскі // Вобраз-81. – Мінск: Маст. літ., 1981.

# МУЖНЫ МАСТАК-ГУМАНІСТ МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ (1901–1937)

1. Біяграфія пісьменніка, трагізм лёсу. Смеласць грамадзянскай пазіцыі. Шматграннасць творчай асобы.
2. Апавяданні М. Зарэцкага як прадстаўніка рамантычнага кірунку ў прозе 20-х гадоў («У Саўках», «У віры жыцця», «Мар'я», «Ворагі», «Адна партыя ў шашкі», «Кветка пажоўклая», «Двое Жвіроўскіх», «42 дакументы», «Бель», «Дзіўная», «Смерць», «Ой, ляцелі гусі», «На чыгунцы», «Ракавыя жаронцы»). Праблемы, вобразы, эвалюцыя стылю пісьменніка. Гуманістычная сутнасць таленту мастака. Выяўленне драматызму і трагізму эпохі, іх асэнсаванне з хрысціянскіх маральна-этычных пазіцый.
3. Аповесць «Голы звер» (1926). Неадназначнасць вобраза Яроцкага. Асуджэнне філасофіі эгаізму. Сатырычна-выкрывальныя прыёмы пісьма ў творы.
4. Праблема інтэлігенцыі і рэвалюцыі ў рамане «Сцежкі-дарожкі» (1927). Пакутлівыя пошукі інтэлігенцыі ў перыяд ваенна-рэвалюцыйных катаклізмаў. Гуманістычны пафас твора. Вобраз Васіля Лясніцкага і паступовая дэфармацыя ўнутранага свету героя. Філасофскія погляды Славіна. Вобразы народніка Матруніна, анархіста Халімы, рабочага Андрэя. Майстэрства ў раскрыцці адносін паміж людзьмі ( любоўныя калізіі і роля жаночых вобразаў). Дасканаласць сюжэтна-кампазіцыйнай структуры рамана.
5. Супраціўленне ідэалогіі сталінізму. Нарыс «Падарожжа на новую зямлю» і раман «Крывічы». Удзел у тэатральнай дыскусіі (1928 г.).
6. Выяўленне трагедыі народнага жыцця ў рамане М. Зарэцкага «Вязьмо» (1932). Непрыманне аўтарам суцэльнай калектывізацыі. Вобраз галоўнага героя Сымона Карызны як ахвяры таталітарнага рэжыму. Вобразы Пацяроба, Зеленюка. Прарочыя матывы ў рамане (вобраз Ахрэма Пунціка), яго гуманістычны і філасофскі змест. Асаблівасці кампазіцыі, стылю рамана. Якую ролю ў творы адыгрывае вобраз вязьма?
7. М. Зарэцкі як драматург, публіцыст, крытык (п'есы «Віхор на балоце», «Белыя ружы» (1928), «Сымон Карызна», «Ная» (1936) і інш.).

## Літаратура


1. Зарэцкі, М. Збор твораў: у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1989.
2. Чыгрын, І. Зарэцкі Міхась / І. Чыгрын // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – Т. 2. – С. 502–505.

3. Адамовіч, А. Беларускі раман / А. Адамовіч. – Мінск: Маст. літ., 1961 – С. 138–149, 156–163.

4. Бугаёў, Д. Дасягнутае і страчанае. М. Зарэцкі / Д. Бугаёў // Полымя. – 1992. – № 10. – С. 212–215.

5. Бугаёў, Д. Пакутныя дарогі рамантыка / Д. Бугаёў // Полымя. – 2001. – № 11. – С. 181–185.

6. Воюш, І. У непрытульным свеце (жаночыя вобразы ў прозе М. Зарэцкага) / І. Воюш // Роднае слова. – 2004. – № 9. – С. 9–12.

7. Гібок-Гібкоўскі, А. У пошуках гармоніі (філасафічнасць навел М. Зарэцкага) / А. Гібок-Гібкоўскі // Роднае слова. – 1997. – № 5. – С. 31–37.

8. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 504–549.

9. Далідовіч, Л. М. Зарэцкаму – 100! З ліку мужных і сумленных / Л. Далідовіч // Маладосць. – 2001. – № 12. – С. 233–237.

10. Каваленка, В. Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы / В. Каваленка, М. Мушынскі, А. Яскевіч. – Мінск: Маст. літ., 1972. – С. 156–167.

11. Карніловіч, Э. За што цкавалі Зарэцкага? / Э. Карніловіч // Маладосць. – 1991. – № 2. – С. 120–125.

12. Майсеенка, А.Ф. Творчасць Міхася Зарэцкага / А.Ф. Майсеенка. – Мінск: Выш. школа, 1978. – 150 с.

13. Макарэвіч, А. Экзістэнцыяльны рух у аповесці М. Зарэцкага «Голы звер» / А. Макарэвіч // Весці НАН Беларусі. – 1999. – № 1. – С. 113–117.

14. Мішчанчук, М. М. Зарэцкі. Эвалюцыя творчасці / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя. – Мінск: Выш. школа, 2001. – С. 50–65.

15. Мушынскі, М.І. Няскораны талент / М.І. Мушынскі. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 294 с.

16. Мушынскі, М.І. Мужнасць таленту / М.І. Мушынскі // Полымя. – 1989. – № 5.

17. Падстаўленка, В. Антыгерой у «малой прозе» Я. Коласа і М. Зарэцкага / В. Падстаўленка // Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 18–20.

## НЯСТОМНЫ ПРАЦАЎНІК
## КАНДРАТ КРАПІВА
## (1896–1991)

1. Жыццёвы і творчы шлях Крапівы, яго грамадская і навуковая дзейнасць. Уклад у беларускую літаратуру і мовазнаўства.

2. Зборнікі сатыры і гумару «Асцё» (1925). «Крапіва» (1925), «Біблія» (1926), «Байкі» (1927) і інш. Нігілістычны і тэндэнцыйны характар

твораў «маладнякоўскага» перыяду. Эвалюцыя светапогляду сатырыка ва «ўзвышэнскі» перыяд: паглыбленне філасафічнасці, маральна-этычнай і эстэтычнай асновы. Стыхія народнага гумару ў байках, іх каларытнасць і вобразнасць. Тэматычная разнастайнасць баек і сатырычных вершаў («Крапіва», «Грышча», «Плеткары», «Вось такія дактары…», «Чырвоная мятла…», «Вол і Авадзень», «Дзве кумы», «Праборка музе», «Будуйце лазні!», «Камсамольскія прыпеўкі», «Кормны і Надворны», «Сука ў збане», «Махальнік Іваноў», «Саманадзейны конь», «Мандат», «Дзед і Баба», «Угоднікі-маўчальнікі», «Дыпламаваны Баран», «Старшыня», «Ганарысты парсюк», «З барышом», «Мурашка і Жук», «Дэкрэт», «Хлеб і вата», «Едзе крытык малады» і інш.).

3. Сатырычныя паэмы «Біблія» (1926), «Шкірута» (1928) і «Хвядос – Чырвоны нос» (1930). Антырэлігійная зададзенасць і павярхоўнасць першай паэмы. Прыём парадзіравання тэмы гераічнага подзвігу ў «Шкіруце». Неадназначнасць і палітычная тэндэнцыйнасць пародыі на літаратурнае жыццё канца 20-х гадоў у паэме «Хвядос – Чырвоны нос».

4. Гумарыстычныя і сатырычныя апавяданні 20–30-х гадоў. Кнігі «Апавяданні» (1926), «Людзі-суседзі» (1928), «Жывыя праявы» (1930). Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў «Здаў экзамінт», «Каровін мужык», «Споведзь», «Людзі-суседзі», «Певень», «Смерць», «На алкагольным фронце» і інш. Праявы рэалізму ў адлюстраванні «новага жыцця» горада і вёскі.

5. Шматграннасць праблематыкі рамана «Мядзведзічы» (1932). Праўдзівы паказ драматызму жыцця беларускай вёскі 20-х гадоў. Юзік Верамейчык – тыповы герой свайго часу. Вобразы Зосі, вясковых гаспадароў Каржакевіча, Грамабоя і іншых, камсамольцаў і актывістаў. Дыферэнцыяцыя вёскі і яе ўплыў на псіхалогію селяніна. Асаблівасці кампазіцыі (раман у навелах) Спалучэнне рэалістычнага і гумарыстычнага планаў, каларытнасць мовы. Праявы тэндэнцыйнасці ў творы.

6. Прычыны звароту Крапівы да драматургіі ў 30-я гады. Праблематыка п’есы «Канец дружбы» (1933). Асэнсаванне здрады спрадвечным маральным каштоўнасцям у імя згубных ідэй і прынцыпаў новай улады. Вобразы Карнейчыка і Лютынскага, гісторыя іх адносін. Увасабленне ў творы трагічных рэалій сталінскай эпохі:

а) асаблівасці канфлікту і сістэма вобразаў у драме «Партызаны» (1937). Адлюстраванне праз характары, учынкі герояў драматызму падзей грамадзянскай вайны. Параўнайце п’есу Крапівы з сугучнымі творамі гэтага часу рускай савецкай драматургіі: «Любоў Яравая» К. Транёва, «Браняпоезд 14-69» Ус. Іванова, «Разлом» Б. Транёва, «Шторм» У. Біль-Белацаркоўскага;

б) сатырычнае выкрыццё прыстасаванцаў, махляроў, падхалімаў, плеткароў у камедыі «Хто смяецца апошнім» (1939). Увасабленне атмасферы ўсеагульнага страху, падазронасці, пошуку «ворагаў» у эпоху 30-х гадоў. Прыёмы сатырычнай абмалёўкі персанажаў, элементы карыкатурнасці ( Гарлахвацкі, Зёлкін). Вобраз Тулягі. Майстэрства камедыёграфа. Сцэнічнае жыццё п'есы.

7. Творчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Байкі, памфлеты, вершаваныя фельетоны. «Валодзеў гальштук» (1943): схематызм твора. Праблематыка п'есы «Проба агнём» (1943). Сістэма вобразаў. Выпрабаванне характараў і пачуццяў людзей у дні вайны. Маральныя якасці герояў (Караневіча, Наталлі, Перагуда):

а) сатырычная камедыя «Мілы чалавек» (1945). Асуджэнне прыстасавальніцкай філасофіі. Жлукта-Чарскі і яго «кліенты». Маральныя прынцыпы эпохі і філасофскі падтэкст п'есы. Канфлікт і спосабы яго вырашэння. Роля вобразаў Язвы і Праменнага. Тэатральны лёс камедыі.

8. Драматургія 40–50-х гадоў ( драмы «З народам» (1948) і «Людзі і д'яблы» (1958), камедыі «Пяюць жаваранкі» (1950) і «Зацікаўленая асоба» (1952–1953) і інш. Уплыў «тэорыі бесканфліктнасці» на аўтарскую канцэпцыю твораў. Самабытнасць характараў, народны гумар і мова, разнастайнасць сродкаў і прыёмаў драматурга.

9. Фантастычная камедыя «Брама неўміручасці» (1972). Кола сацыяльна-філасофскіх, маральна-этычных праблем 20 стагоддзя ў асэнсаванні драматурга. Галерэя сатырычных тыпаў: Дажывалаў, Караўкін, Торгала, Застрамілава, «Банкір» і інш. Асуджэнне бездухоўнасці, прымітывізму. Майстэрства камедыёграфа. Ці можна лічыць гэтую п'есу класічным творам?

10. П'еса «На вастрыі» (1982) як спроба стварэння шматпланавай карціны тагачаснай эпохі.

11. Традыцыі Крапівы-байкапісца і драматурга і сучасны літаратурны працэс. Крапіва як перакладчык твораў сусветнай літаратуры. Спадчына пісьменніка ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

**Літаратура**

1. Крапіва, К. Збор твораў: у 5 т. / К. Крапіва. – Мінск: Маст. літ., 1974–1976.

2. Крапіва, К. Выбраныя творы: у 2 т. / К. Крапіва. – Мінск: Маст. літ., 1986.

3. Аўрамчык, М. Талент перамог асцярожнасць / М. Аўрамчык // Знаёмыя постаці. – Мінск:, 2004. – С. 54–57.

4. Семяновіч, А. Крапіва Кандрат / А. Семяновіч // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – Т. 3. – С. 396.

5. Бугаёў, Дз. Зброяй сатыры, зброяй праўды / Дз. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 1971. – С. 18–74.

6. Бугаёў, Дз. Майстэрства драматурга / Дз. Бугаёў // Талент і праца. – Мінск: Маст. літ., 1979.

7. Бугаёў, Д. К. Крапіва. Дасягнутае і страчанае / Д. Бугаёў // Спавядальнае слова. – Мінск: Маст. літ., 2001. – С. 145–147.

8. Гілевіч, Н. Майстэрства байкапісца / Н. Гілевіч // У гэта веру. – Мінск: Маст. літ., 1978.

9. Гілевіч, Н. Мастак і грамадзянін / Н. Гілевіч // Покліч жыцця і часу. – Мінск: Маст. літ., 1983.

10. Гніламёдаў, У. На шляху да «Брамы неўміручасці» / У. Гніламёдаў // Роднае слова. – 1997. – № 12. – С. 4–7.

11. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 282–329.

12. Казека, Я. Кандрат Крапіва: крытыка-біяграфічны нарыс / Я. Казека. – Мінск: Маст. літ., 1965. – 168 с.

13. Казека, Я. Гартаванне слова / Я. Казека. – Мінск: Маст. літ., 1985.

14. Лаўшук, С. Крапіва і беларуская драматургія / С. Лаўшук. – Мінск: Маст. літ., 1986. – 252 с.

15. Макарэвіч, А. Сатыра Кандрата Крапівы / А. Макарэвіч. – Мінск: Маст. літ., 1962.

16. Мельнікава, З. Ахвяруючы лёсам друга / З. Мельнікава // ЛіМ. – 1989. – № 17.

17. Мельнікава, З. Выпрабаванне сучаснасцю. Перачытваючы творчасць Кандрата Крапівы 20–30-х гадоў / З. Мельнікава // Беларуская літаратура. У святле новых фактаў і назіранняў. – Брэст: БрДУ, 1996. – 249 с.

18. Сабалеўскі, А. Кандрат Крапіва / А. Сабалеўскі // Беларуская савецкая драма. – Мінск: Маст. літ., 1987.

19. Сабалеўскі, А. Кандрат Крапіва: Нарыс жыцця і творчасці / А. Сабалеўскі. – Мінск: Маст. літ., 1989.

20. Сабалеўскі, А. Сугучныя з часам / А. Сабалеўскі // Роднае слова. – 2006. – № 11. – С. 8–12.

21. Усікаў, Я. Драматургія Кандрата Крапівы / Я. Усікаў. – Мінск: Маст. літ., 1978.

22. Шаўлоўская, М. Кандрат Крапіва / М. Шаўлоўская // Беларуская драматургія. – Мінск: Маст. літ., 1981.

**Для завучвання на памяць**

«Крапіва», «Праборка музе», «Кормны і надворны», «Мандат», «Кукарэку», «Дыпламаваны баран», «Саманадзейны конь», «Мурашка і Жук»і інш.

## ЗАГУБЛЕНЫ ТАЛЕНТ ПЛАТОН ГАЛАВАЧ (1903–1937)

Таварышы, калі ў чым вінаваты,
прабачце. Гісторыя скажа праўду.
*Платон Галавач*

1. Біяграфічныя звесткі. Трагічны лёс пісьменніка.
2. Апавяданні П. Галавача (зборнікі «Дробязі жыцця» (1927), «Хочацца жыць» (1930), «Апавяданні» (1934). Эвалюцыя творчасці. Лірызм і публіцыстычная дэкларатыўнасць, спробы рэалізму ў ранніх творах («Рубанаўскі вузел», «Абмылілася», «Бывае й так»), выяўленне драматызму жыцця новай эпохі ў позніх апавяданнях («Дзве сцежкі», «Уцякач», «Кнак», «Дасужая», «Суседзі» і інш.). Паглыбленне псіхалагізму.
3. Аповесць «Вінаваты» (1929). Маральна-этычная праблематыка ў кантэксце эпохі «класавай барацьбы». Вобраз Алеся Шаўца як тыповага параджэння і тыповай ахвяры свайго часу. Папярэджанне пісьменніка пра небяспеку звышпільнасці і жорсткасці. Сродкі стварэння характараў. Асаблівасці кампазіцыйнай будовы.
4. Аповесць «Спалох на загонах» (1930). Палітычная заангажаванасць твора. Складанасць пазіцыі аўтара ў выяўленні тэмы калектывізацыі. Вобраз Панаса як героя новага тыпу. Схематызм характараў і тэндэнцыйнасць у паказе «вялікага пералому» на вёсцы. Ці ёсць падабенства вырашэння праблемы ў творы Галавача і рамане М. Шолахава «Узнятая цаліна»?
5. Жанрава-стылёвыя пошукі празаіка. Раман «Праз гады» (1934) і шырокі фон гістарычных падзей у ім. Шматпланавасць рамана. Тэма інтэлігенцыі (вобразы Паўла Будніка, прафесара Галынскага і інш.) і пэўны схематызм, зададзенасць ў стварэнні характараў. Асэнсаванне лёсу сялянства (браты Шкробаты). Стылёвая неаднароднасць твора.

## Літаратура


1. Галавач, П. Збор твораў: у 2 т. / П. Галавач. – Мінск: Маст. літ., 1958.
2. Багдановіч, І. Галавач Платон / І. Багдановіч // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – Т. 2. – С. 87–91.
3. Галавач, П. …Робімся проста людзьмі… (Пісьмы П. Галавача) / П. Галавач // Беларусь. – 1990. – № 12. – С. 25–26.
4. Гарэцкі, М. Платон Галавач / М. Гарэцкі // Творы. – Мінск: Маст. літ., 1990. – С. 385–389.
5. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 576–599.
6. Дасаева, Т. «Ці змагу я быць патрэбным у літаратуры?» (Жыццё і творчасць П. Галавача) / Т. Дасаева // Роднае слова. – 1993. – № 4. – С. 7–13.
7. Дасаева, Т. З верай у светлыя ідэалы / Т. Дасаева // Роднае слова. – 2003. – № 4. – С. 15–19.
8. Караткевіч, У. Моваю памяці (пра аповесць Галавача «Заўтра настане») / У. Караткевіч // Заўтра настане / П. Галавач. – Мінск: Маст. літ., 1987. – С. 3–4.
9. Куляшова, В. Дзяцька Платон / В. Куляшова // Голас радзімы. – 1993. – № 18. – 6 мая. – С. 1–6.
10. Куляшова, В. «Ты была маёй любай зямлёй...» / В. Куляшова // Роднае слова. – 2007. – № 5. – С. 81–83.
11. Лебедзеў, У. «Я прывык да працы адносіцца сумленна». Сучаснае прачытанне твораў П. Галавача / У. Лебедзеў // Беларуская літаратура. У святле новых фактаў іназіранняў: вучэбны дапаможнік. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 1996. – С. 71–82.
12. Марціновіч, А. Хацелася жыць… / А. Марціновіч // Спалох на загонах / П. Галавач. – Мінск : Маст.літ., 1996. – С. 3–22.
13. Мінскевіч, С. Перамагла зададзенасць / С. Мінскевіч // ЛіМ. – 1992. – 17 красавіка.
14. Мушынскі, М. І нічога апроч праўды: якой быць гісторыі беларускай літаратуры / М. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – С. 68–73.
15. Навумовіч, У. Шляхамі арлянят: проза «Маладняка» / У. Навумовіч. – Мінск: Маст. літ., 1984. – С. 136–138.
16. Пруднікаў, П. Яго забыць нельга (успаміны пра Галавача) / П. Пруднікаў // Далёкае, але не забытае. – Мінск, 1988. – С. 81–88.
17. Скрыган, Я. Некалькі хвілін чужога жыцця: Апавяданні, успаміны, роздум / Я. Скрыган. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – С. 52–55.
18. Хведаровіч, М. Памятныя сустрэчы / М. Хведаровіч. – Мінск: Маст. літ., 1977. – С. 173–184.

# ВЯРТАННЕ З НЕБЫЦЦЯ ЯНКА НЁМАНСКІ (1890–1937)

1. Жыццёвы і творчы шлях. Грамадская, навукова-публіцыстычная дзейнасць. Трагізм лёсу. Самабытнасць, арыгінальнасць асобы Я. Нёманскага. Вяртанне спадчыны празаіка.

2. Пошукі і знаходкі Я. Нёманскага ў «малой» прозе (зборнік «Апавяданні» 1925 г.). Мінулае і сучаснасць 20-х гадоў у апавяданнях «Над Кроманню», «Рамэа і Джульета на Беларусі», «Дэзерцір», «Маці», «Зварот», «Абмылка» і інш. Рысы апавядальнай манеры пісьма ( прастата і дакладнасць, драматызм, псіхалагізм, майстэрства ў апісанні батальных сцэн, пейзажных замалёвак і інш.) Роля кантрасту ў выяўленні трагізму жыцця. М. Гарэцкі, разглядаючы творчасць Я. Нёманскага, вызначаў у яго «шэкспіраўскі спосаб» раскрыцця характару. Якія мажлівасці адкрываў гэты прыём пісьменніку?

3. Аповесць «Партызан» (1927) – узор героіка-прыгодніцкай аповесці. Рамантычны пафас твора, напісаным у «маладнякоўскай» манеры. Паэтызацыя подзвігу беларускіх партызан у барацьбе з белапалякамі.

4. Сацыяльна-палітычны воблік эпохі і лёс асобы ў рамане Я. Нёманскага «Драпежнікі» (1928–1930). Эпічная шырыня ў паказе пераломных падзей пачатку XX стагоддзя і разнастайнасць характараў (паны Ляскоўскія, князі Друцкія, гандляр Масей Ліўшыц, Зыкаў-Росяк, Зося, Пятрусь Мікалаевіч, сем'і рабочага Рыгорчыка і селяніна Кавальчыка і інш.). Драматызм сюжэту, заснаванага на прынцыпе кантрастнага супастаўлення (чым абумоўлена, на вашу думку, выкарыстанне прыёму кантрасту?). Стылёвая і сюжэтная распрацаванасць рамана, арыгінальнасць аўтарскай думкі. Маляўнічасць пейзажу. Незавершанасць твора. Рост майстэрства Я. Нёманскага-празаіка.

## Літаратура

1. Нёманскі, Я. Творы / Я. Нёманскі. – Мінск: Маст. літ., 1984.

2. Чыгрын, І. Нёманскі Янка / І. Чыгрын // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – Т. 4. – С. 387–388.

3. Бугаёў, Дз. Дасягнутае і страчанае. Жанрава-стылёвыя тэндэнцыі ў развіцці беларускай літаратуры XX стагоддзя (па апав. «Маці», рам. «Драпежнікі») / Дз. Бугаёў // Полымя. – 1992. – № 3. – С. 219–233.

4. Гарэцкі, М. Творчасць Янкі Нёманскага / М. Гарэцкі // Творы. – Мінск: Маст. літ., 1990. – С. 301–308.

5. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 615–631.

6. Платонаў, Р. «Партыйная справа» Я. Нёманскага / Р. Платонаў // Полымя. – 1996. – № 1. – С. 254–272.

7. Савік, Л. Чалавек шматграннага таленту / Л. Савік // Творы / Я. Нёманскі. – Мінск: Маст. літ., 1984. – С. 3–22.

8. Хомчанка, В. Абавязак памяці. (Пра Я. Нёманскага) / В. Хомчанка // ЛіМ. – 1985. – 15 лістапада. – С. 4–15.

9. Шаладонаў, У. Сямейныя канфлікты і духоўна-маральныя пошукі беларускай «малой» прозы 20-х гадоў / У. Шаладонаў // Весці АН Бел. Сер. гум. нав. – 1994. – № 4. – С. 101–107.

10. Янушэвіч, С. Спадзяючыся на свае сілы / С. Янушэвіч // Голас Радзімы. – 1990. – 10 мая.

11. Ярош, М. Вяртанне ў дзень сённяшні / М. Ярош // Полымя. – 1985. – № 12. – С. 204–206.

### Для завучвання на памяць

Урывак з апавядання «Над Кроманню» ад слоў: «Аб гэтым спакон вякоў ідзе гамонка…» да «Вось што кажуць старыя людзі» (С. 24).

## ПІСЬМЕННІК. АКАДЭМІК. ДАБРАДЗЕЙ
## МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ
## (1899–1975)

1. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, яго грамадская дзейнасць. Станаўленне таленту.

2. Праблематыка зборнікаў апавяданняў «Апавяданні» (1927), «Гой» (1929). Выяўленне трагізму грамадзянскай вайны і маральна-псіхалагічных канфліктаў ў апавяданнях «Гой», «Радо», «Крот», «Над Бугам», «Чыгунныя песні» і інш. Спалучэнне героіка-рамантычнай і рэалістычнай плыняў.

3. Тэматычная разнастайнасць твораў М. Лынькова 30-х гадоў: «Андрэй Лятун», «Апошні зверыядавец», «Салавей-разбойнік», «Світка», «Баян», «Талісман», «На высокай хвалі», «Саўка-агіцірнік», «Сінія галіфэ», «Аб чалавечым сэрцы», «Маладосць». Спалучэнне мастацкай праўдзівасці і ідэалагічнай зададзенасці. М. Лынькоў і БелАПП.

4. Раман «На чырвоных лядах» (1934) як спроба «стварыць эпас нашага часу» (М. Лынькоў). Літаратурна-крытычныя спрэчкі вакол яго (выступленні М. Клімковіча, Я. Коласа і інш.). Адлюстраванне драматызму жыцця беларускай вёскі на пачатку стагоддзя, перыяду вайны і напярэдад-

ні рэвалюцый. Сацыяльна-класавыя і ідэалагічныя размежаванні герояў. Сучасныя ацэнкі гэтага твора. Праблематыка незакончанага рамана «Сенька Сокал». Аповесць «Міколка-паравоз» і іншыя творы для дзяцей.

5. Кніга «Сустрэчы» (1940) як мастацкі водгук на запатрабаванні часу. Тэма жыцця Заходняй Беларусі і тэндэнцыйнасць яе адлюстравання ў аповесці «Сустрэчы», апавяданнях «Ядвісін дуб», «Восеньскай ноччу», «Капля малака», «Тры злоты», «Тонкая сітуацыя» і інш. Кантрастнасць малюнкаў, напружанасць сюжэтаў, драматызм лёсаў.

6. Творчасць М. Лынькова перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Публіцыстычныя і сатырычныя артыкулы, нарысы. Патрыятычны і гуманістычны змест апавяданняў зборніка «Астап» (1944): «Салют», «Ірына», «Пацалунак», «Астап», «Дзіцячы башмачок», «Недапетыя песні», «Васількі», «Дзед Астап і Палашка». Гераічны подзвіг беларуса-патрыёта. Трагедыя растаптанага дзяцінства. Асабівасці стылю.

7. Раман-эпапея «Векапомныя дні» (1958–1969). Кампазіцыя і асноўныя сюжэтныя лініі. Абагульнены, збіральны вобраз беларускага народа. Драматызм і трагізм лёсаў кіраўнікоў і ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху Васіля Саколіча, Слышэні, Заслонава, Астапа-Канапелькі, Надзеі Канапелькі, Паўла Дубка і інш. Асуджэнне здрадніцтва (Клопікаў, Слімак, Сіпак і інш.). Спалучэнне дакументалізму з мастацкасцю. Элементы рамантызацыі, моўная індывідуалізацыя, сатырычная тыпізацыя ў творы.

8. Праблематыка апавяданняў і нарысаў апошніх год. «Замежныя» творы ( зборнік «За акіянам» 1962 г.). «Дыпламатычная» тэма. Апавяданні «Джыавані», «Цана крыві», «У булачнай», «Прыгоды з чамаданам», «Падарунак матцы» і інш.

9. М. Лынькоў – вучоны-літаратуразнаўца: «Беларуская літаратура за 30 год» (1948), «Якуб Колас» (1952), «Летапіс эпохі» (1968), «Літаратура і жыццё» (1978) і інш.

### Літаратура

1. Лынькоў, М. Збор твораў: у 4 т. / М. Лынькоў. – Мінск: Маст. літ., 1967–1968.

2. Лынькоў, М. Збор твораў: у 8 т. / М. Лынькоў. – Мінск: Маст. літ., 1981–1985.

3. Аўтабіяграфія М. Лынькова // Пяцьдзесят чатыры дарогі. – Мінск: Маст. літ., 1963.

4. Адамовіч, А. Літаратура, час і мы / А. Адамовіч. – Мінск: Маст. літ., 1979.

5. Бугаёў, Д. Шчодрае сэрца пісьменніка: проза Міхася Лынькова даваеннага часу / Д. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 1963.

6. Бугаёў, Д. М. Лынькоў / Д. Бугаёў // Служэнне Беларусі. – Мінск: Маст. літ., 2003. – С. 124–140.

7. Бугаёў, Д. М. Лынькоў / Д. Бугаёў // Спавядальнае слова. – Мінск: Маст. літ., 2001. – С. 158–165.

8. Василевич, А. «Как поздно-поздно и как рано-рано…» / А. Василевич // Нёман. – 1990. – № 4.

9. Гілевіч, Н. Годнасць чалавека і творцы / Н. Гілевіч // Удзячнасць і абавязак. – Мінск: Маст. літ., 1982.

10. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 370–412.

11. Грахоўскі, С. Зажураныя жураўлі / С. Грахоўскі // Так і было. – Мінск: Маст. літ., 1986.

12. Дзюбайла, П. Праўда аб вайне і подзвігах / П. Дзюбайла // У вялікай дарозе. – Мінск: Маст. літ., 1981.

13. Каваленка, В. Адзінства духу і волі / В. Каваленка // Далягляды. – Мінск: Маст. літ., 1985.

14. Кенька, М. Міхась Лынькоў: летапіс жыцця і творчасці / М. Кенька. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 150 с.

15. Куляшоў, Ф. Міхась Лынькоў: нарыс жыцця і творчасці / Ф. Куляшоў. – Мінск: Маст. літ., 1979. – 191 с.

16. Рагуля, А. Семантычныя ёмкасці лакальнай формы. Эстэтыка прозы М. Лынькова / А. Рагуля // Роднае слова. – 2009. – № 11. – С. 3–6.

17. Саламаха, У. Да Лынькова ў Крынкі / У. Саламаха // Маладосць. – 2000. – № 2. – С. 237–240.

18. Сачанка, Б. Дзве гадзіны з Міхасём Лыньковым / Б. Сачанка // Жывое жыццё. – Мінск: Маст. літ., 1985.

19. Сачанка, Б.Святло яго душы. Успаміны пра Міхася Лынькова / Б. Сачанка. – Мінск: Маст. літ, 1979. – 368 с.

20. Тычына, М. Паэзія прозы / М. Тычына // Змена квадры. – Мінск: Маст. літ., 1983.

21. Тычына, М. Пясняр рамантычнага парыву / М. Тычына // Роднае слова. – 1999. – № 11. – С. 11–17.

# ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР. ВУЧОНЫ. ПІСЬМЕННІК ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ (1883–1938)

Чала я не хіліў прад сілай...
*В. Ластоўскі*

1. Жыццёвы і творчы шлях. Адзін з лідэраў беларускага нацыянальнага Адраджэння. Грамадска-палітычная, літаратурная, навуковая і выдавецкая дзейнасць.

2. Апавяданні, легенды, прыпавесці («Лебядзіная песня». «Прывід», «Дзень ружавай кветкі», «Каменная труна», «Сож і Няпро», «Князёўна Рагнеда», «Вітаўт і Ягайла» і інш.). Наватарскі характар творчасці. Выкарыстанне фальклорна-міфалагічных матываў і вобразаў. Зварот да гістарычнай тэмы. Праблематыка апавяданняў, іх жанрава-стылёвая разнастайнасць. М. Багдановіч-крытык аб творах і стылі пісьменніка.

3. Аповесць «Прыгоды Тараса і Панаса» (1912). Рысы нацыянальнага тыпу характару ў вобразах сялян. Мастацкая адметнасць твора.

4. «Лабірынты» (1923). Адметнасць жанравай формы твора. Спалучэнне рэалістычнай, фантастычнай і дэтэктыўна-прыгодніцкай плыняў. Гісторыя і сучаснасць старажытнага Полацка. Вобразы археолага і гісторыка Івана Іванавіча, Падземнага чалавека. Самабытная філасофская канцэпцыя нацыянальнага быцця. Беларуская культура ў кантэксце сусветнай. Вобраз Крывіі ў светапогляднай сістэме Ластоўскага.

5. Паэзія В. Ластоўскага. Вершы 20-х гадоў. Іх адраджэнска-патрыятычны пафас, інтэлектуальна-філасофская заглыбленасць зместу («О, Крыўская зямля...», цыкл «Конадні», «Чала я не хіліў прад сілай,,.», «Рэйнскі вадапад» і інш.). Вобразы еўрапейскай сучаснасці і класічнай даўніны ў асэнсаванні паэта. Разнастайнасць жанравых формаў.

6. В. Ластоўскі як крытык і публіцыст. Рэцэнзіі на першыя зборнікі апавяданняў Ядвігіна Ш., Я. Коласа, М. Гарэцкага. Ініцыятар «нашаніўскай» дыскусіі 1913–1914 гадоў (артыкулы Юркі Верашчакі «Сплачывайце доўг», «Па сваім шляху»). Сцверджанне эстэтычнай сутнасці літаратуры і вызначэнне шляхоў яе развіцця як часткі сусветнай літаратуры.

7. Навуковыя даследаванні: «Кароткая гісторыя Беларусі» (1910), «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (1924), «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» (1926). Іх значнасць для айчыннай гісторыі і культуры. Пераклады і мемуары В. Ластоўскага.

**Літаратура**


1. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.
2. Кісялёў, Г. Ластоўскі Вацлаў / Г. Кісялёў // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – Т. 4. – С. 16–20.
3. Мароз, К. Літаратурная крытыка Заходняй Беларусі / К. Мароз. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2001. – С. 29–30.
4. Мароз, К. Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі: хрэстаматыя / К. Мароз, М. Мішчанчук. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – С. 40–42, 48–55, 142.
5. Сачанка, Б. Вацлаў Ластоўскі / Б. Сачанка // ЛІМ. – 1989. – 22 верасня.
6. Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі / Я. Янушкевіч. – Мінск: Выш. школа, 1995.
7. Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар: Вацлаў Ластоўскі / Я. Янушкевіч // Вяртання маўклівая споведзь. – Мінск: Выш. школа, 1994. – С. 91–121.


## «БАЦЬКА БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ»
## ФРАНЦІШАК АЛЯХНОВІЧ
## (1883–1944)

Каменне вострае крывава раніць ногі,
Дрыжыць у паветры плач старых бяроз…
Хаця мне жудасна, я не зыйду з дарогі,
Ня кіну край, дзе радзіўся, рос…

*Ф. Аляхновіч*

1. Трагічны лёс беларускага адраджэнца. Уклад Ф. Аляхновіча ў развіццё беларускай драматургіі, тэатральнага мастацтва. Спадчына драматурга ў асэнсаванні літаратуразнаўцаў.

2. Жанр драмы ў творчасці Ф. Аляхновіча. Сацыяльна-філасофская праблематыка драм «На вёсцы» (1916), «Манька» (1917), «Дрыгва» (1925), ««Калісь» (1917), «Страхі жыцця» (1918), «Цені» (1919), «Няскончаная драма» (1920). Тэма жыцця вёскі і горада, беларускага адраджэння, лёсу інтэлігенцыі. Маральна-этычная завостранасць ў асэнсаванні негатыўных з'яў жыцця і экзістэнцыяльная глыбіня твораў. Увасабленне ідэі адраджэння, незалежнасці Беларусі ў п'есе «Няскончаная драма». Вобразы Васіля, Ядзькі, Багдзевіча і Кастуся. Падабенства Васіля і яго жыццёвага праваб-

раза. Два погляды на беларускую ідэю. Унутраны драматызм, псіхалагічная напоўненасць п'есы. Увядзенне разгорнутых дыялогаў і маналогаў.

3. Жанр камедыі: «На Антокалі» (1915), «Заручыны Паўлінкі» (1918), «Шчаслівы муж» (1922), «Пан Міністар» (1922). Сацыяльна-бытавая і палітычная аснова канфлікту ў п'есах. Спалучэнне гумару і сатыры у паказе жыцця віленскіх мяшчан. Аблегчанасць у вырашэнні канфлікту ў камедыі «Заручыны Паўлінкі» – спробе працягу «Паўлінкі» Я. Купалы. Майстэрства камедыёграфа ў п'есе «Шчаслівы муж». Сатырычная напоўненасць вобраза Філімона Пупкіна – прэтэндэнта на высокую дзяржаўную пасаду ў п'есе «Пан Міністар». Займальнасць сюжэта, вострае развіццё інтрыгі, распрацаванасць характараў персанажаў.

4. Фальклорна-міфалагічная аснова драмы «Бутрым Няміра» (1916). Філасофска-хрысціянскае асэнсаванне тэмы злачынства і пакарання. Вобраз Бутрыма і тэма пакаяння. Спосабы вырашэння канфлікту і ўвасаблення характараў. Рэалістычны і містычны план у драме. «Базылішк»(1917), камедыя-рымейк «Птушка шчасця» (1919), «сцэнічны гратэск» «Круці ня круці – трэба памерці» (1943). Роля умоўна-міфалагічных вобразаў. Праблема жыцця і смерці ў асэнсаванні аўтара.

5. Тэатральная дзейнасць Ф. Аляхновіча. Даследаванне па гісторыі беларускага тэатра, кніга «Беларускі тэатр» (1924) і яе значэнне для нацыянальнага тэатразнаўства.

6. Ф. Аляхновіч – пачынальнік гулагаўскай тэмы. «У кіпцюрах ГПУ» (1935–1937) – успаміны Ф. Аляхновіча пра Салаўкі. Стрыманасць і разважлівасць аўтара ў паказе жыцця і побыту вязняў у савецкіх турмах, нораваў і звычаяў, якія культываваліся турэмнай адміністрацыяй. Страшная праўда пра часы сталінізму па творах рускіх і беларускіх пісьменнікаў: А. Салжаніцына («Архіпелаг Гулаг», «Адзін дзень Івана Дзянісавіча»), А. Рыбакова («Дзеці Арбата»), В. Шаламава («Калымскія апавяданні»), Ю. Домбраўскага («Захавальнік старажытнасцей», «Факультэт непатрэбных рэчаў»), успаміны і творы на гэту тэму С. Грахоўскага, С. Шушкевіча, П. Пруднікава, Б. Мікуліча.

## Літаратура

1. Аляхновіч, Ф. У капцюрох ГПУ / Ф. Аляхновіч. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 238 с.

2. Аляхновіч, Ф. Нясконченая драма / Ф. Аляхновіч // Полымя. – 1992. – № 5. – С. 109–146.

3. Лебедзеў, У. Аляхновіч Францішак / У. Лебедзеў // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1996. – Т. 6. – С. 76–78.

4. Бяляцкі, А. «Як я памру…» Ф. Аляхновіч / А. Бяляцкі // Вяртання маўклівая споведзь. – Мінск: Выш. школа, 1994. – С. 191–203.

5. Гарэцкі, М. Творы. Беларускае драматургічнае пісьменства (Ф. Аляхновіч, п'еса «Страхі жыцця») / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1990. – С. 225–228.

6. Іверс, А. Вяртанне праз пакуты (аб дакументальнай аповесці Ф. Аляхновіча «У капцюрох ГПУ») / А. Іверс // ЛіМ. – 1991. – 12 красавіка. – С. 7.

7. Зарэцкая, В. Гуманістычны пафас заходнебеларускай літаратуры / В. Зарэцкая, М. Яніцкі. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2007. – С. 177–180.

8. Ковель, Ч.А. Фальклорныя матывы, сюжэты і вобразы ў творчасці Ф. Аляхновіча / Ч.А. Ковель // Весці АН Бел. Сер. гум. навук. – 1997. – № 2. – С. 106–115.

9. Ковель Ч. Жыцця няскончаная драма. Нарыс тэатральнай і грамадскай дзейнасці Ф. Аляхновіча / Ч. Ковель // Тэатральная Беларусь. – 1995. – № 4. – С. 16–22.

10. Лецка, Я. «А суд гісторыі цяжкі…» (пра Ф. Аляхновіча, аўтара кнігі «У капцюрох ГПУ») / Я. Лецка // Народная газета. – 1991. – 3 студзеня.

11. Лысенка, З. Пакутнік Адраджэння / З. Лысенка // Маладосць. – 1995. – № 4. – С. 233–242.

12. Ляхоўскі, У. Малавядомы факт з біяграфіі Ф. Аляхновіча / У. Ляхоўскі // Спадчына. – 1997. – № 1. – С. 205–211.

13. Максімовіч, В. «Новая драма» Ф. Аляхновіча (пра творчасць драматурга) / В. Максімовіч // Роднае слова. – 1997. – № 9. – С. 47–58.

14. Максімовіч, В. Непазбыўныя цені жыцця (пра п'есу Ф. Аляхновіча «Цені») / В. Максімовіч // Роднае слова. – 1997. – № 10. – С. 41–49.

15. Максімовіч, В. Ф. Аляхновіч і Л. Родзевіч / В. Максімовіч // Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя. – Мінск: Бел. навука, 2006. – С. 301–324.

16. Марціновіч, А. Хто ж ён, Ф. Аляхновіч? / А. Марціновіч // Сувязь. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 3–18.

17. Мішчанчук, М. Ф. Аляхновіч. Лёс і творчасць / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура 20 стагоддзя. – Мінск: Выш. школа, 2001. – С. 196–210.

18. Няфёд, У. Францішак Аляхновіч. Тэатральная і грамадска-палітычная дзейнасць / У. Няфёд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – 144 с.

19. Сабалеўскі, А. Адметны след (пра Ф. Аляхновіча) / А. Сабалеўскі // Абнавіцца духам. – Мінск: Маст. літ., 1993. – С. 366–377.

20. Сабалеўскі, А. Здзяйсненні – насуперак лёсу. Шляхі Ф. Аляхновіча / А. Сабалеўскі // Роднае слова. – 1994. – № 5. – С. 17–22.

21. Сабалеўскі, М. Шлях творцы. (пра творчасць Ф. Аляхновіча, пісьменніка, драматурга, тэатразнаўцы) / М. Сабалеўскі // Асоба мастака: літ.-крыт. артыкулы. – Мінск: Маст. літ., 1992. – С. 16–27.

22. Харытончык, Р. Шлях да праўды. Ф. Аляхновіч – дзеяч, беларус, адраджэнец, паэт, акцёр, драматург / Р. Харытончык // Мастацтва. – 1997. – № 8. – С. 27–30; № 1. – С. 46–50.

23. Харытончык, Р. З набыткаў паўлінкіяны (пра п'есу Аляхновіча «Заручыны Паўлінкі») / Р. Харытончык // Тэатральная Беларусь. – 1992. – № 3. – С. 18–19.

## ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Ганебны падзел Беларусі паводле Рыжскага дагавору 18 сакавіка 1921 года Расіі з Польшчай (без удзелу беларускага прадстаўніцтва) расцэньваўся як здрада нацыянальнай справе. На «крэсах усходніх», дзе налічвалася больш 3 млн. беларусаў, усталявалася напружаная атмасфера. Палітыка асіміляцыі, апалячвання і акаталічвання, сацыяльны ўціск выклікалі ўзброеныя выступленні, стаўку на якія рабілі эсэры і камуністы, але гэта не апраўдала сябе. Беларускі рух, цэнтрам якога заставалася Вільня, адухоўлены імкненнем да нацыянальнага вызвалення, выпрацоўваў агульнадэмакратычную платформу ( у 1922 годзе ў Сейм было абрана 11 беларускіх паслоў). Але з утварэннем КПЗБ у 1923 годзе пачаўся раскол беларускага руху: такія масавыя легальныя арганізацыі, як Грамада, Таварыства Беларускай Школы, пасольскі клуб «Змаганне за інтарэсы сялян і работнікаў», сталі пад уплывам КПЗБ выразнікамі рэвалюцыйных поглядаў (на ўз'яднанне з БССР), супрацьпаставіўшы сябе адраджэнскаму, дэмакратычнаму кірунку. Дэмакратычны кірунак у беларускім руху быў прадстаўлены партыяй Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, Беларускім Сялянскім Саюзам, Беларускім Студэнцкім Саюзам, Беларускім Нацыянальным Камітэтам, Беларускім Навуковым Таварыствам і інш. Яны кіраваліся ідэяй Адраджэння, незалежнасці, самастойнасці Беларусі.

Нацыянальная ідэя, увогуле, дамінавала над праблемамі сацыяльна-палітычнага плану ў заходнебеларускай літаратуры, крытыцы, публіцыстыцы, філасофіі (прыкладам з'яўляецца філасофскае эсэ І. Канчэўскага «Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветагляду», 1921 г.).

Мастацкай літаратуры нярэдка даводзілася сумяшчаць эстэтычныя і ідэалагічныя функцыі, што абумоўлівала развіццё розных літаратурных накірункаў. Іх аб'ядноўваў **рамантызм** як тып светаадчування, творчы стыль, што ўвабраў у сябе ўплывы патрыятычнай, дэмакратычнай традыцыі Захаду і сацыяльнай ідэі Усходу. Спалучаючы адраджэнскія і бунтарскія матывы, паэзія Заходняй Беларусі значную перавагу аддавала гумані-

стычна-асветніцкім ідэалам, асэнсоўвала рэлігійныя, філасофскія і містыка-псіхалагічныя настроі, эстэтычныя каштоўнасці.

З першай паловы 20-х гадоў у паэзіі вызначыліся тры асноўныя напрамкі, якія вылучылі сваіх таленавітых прадстаўнікоў:

1) рэвалюцыйна-рамантычны, «барацьбяны» (Уладзімр Жылка, Гальяш Леўчык, Леапольд Родзевіч, Міхась Васілёк, Міхась Машара, Піліп Пестрак, Алесь Салагуб і інш.);

2) адраджэнска-рамантычны, ці «незалежніцкі», дэмакратычны (Вацлаў Ластоўскі, Хведар Ільяшэвіч, Алег Бартуль, Францішак Грышкевіч, У. Грыневіч, Тулейка і інш., сярод іх значны рэлігійна-адраджэнскі кірунак – Казімір Сваяк, Янка Быліна, Вінцук Адважны);

3) эстэтычны (Наталля Арсеннева).

Але гэты падзел у многім умоўны, таму што паэты ў сваёй творчасці выходзілі за межы пэўнага кірунку. Напрыклад, У. Жылка вырастаў з агульнай масы «барацьбянай» і адраджэнскай паэзіі да ўзроўню нацыянальнага песняра, які імкнуўся спасцігнуць таямніцы красы і сапраўднай паэзіі, тым самым ён набліжаўся да пераемнікаў багдановічаўскіх традыцый – Н. Арсеннevай і У. Дубоўкі.

Заходнебеларуская літаратура прадстаўлена і жанрамі прозы, драматургіі: апавяданні і аповесць «Дзве душы» М. Гарэцкага, апавяданні і раман «Лабірынты» Власта (В. Ластоўскага), раман «Вар'ят без вар'яцтва» Язэпа Нарцызава (Я. Драздовіча) і яго рукапісныя, ненадрукаваныя творы, аповесць «Хлапец» В. Адважнага, творы Ст. Грынкевіча, п'есы Ф. Аляхновіча («Няскончаная драма», «Заручыны Паўлінкі», «Пан Міністар» і інш.), Сучаснага, ці Л. Родзевіча («На Каляды», «Досвіткі», «Збянтэжаны Саўка», «Конскі партрэт» і інш.), К. Сваяка і інш. Некаторыя пісьменнікі імкнуліся спалучыць мадэрнісцкую і рамантычную, рэалістычную плыні ў сваёй творчасці, былі наватарамі: у прыватнасці, Власт стварыў міфалагізаваную канцэпцыю нацыянальнага быцця, Я. Нарцызаў (Драздовіч) – прадстаўнік неасімвалізму, абодва пачыналі распрацоўваць жанры фантастычнай і дэтэктыўна-прыгодніцкай літаратуры, Ф. Аляхновіч ствараў жанр «новай драмы».

Да лепшых здабыткаў літаратуры першай паловы 20-х гадоў належаць паэтычныя зборнікі У. Жылкі («Уяўленне», «На ростані»), Л. Родзевіча («Беларусь»), К. Сваяка («Мая ліра»), творы Г. Леўчыка, Н. Арсеннevай, Власта і інш. Вакол творчага вобліку К. Сваяка разгарэлася цэлая крытычная дыскусія ў 1926 годзе, якая выявіла сутыкненне розных светапоглядных, а таксама эстэтычных і метадалагічных пазіцый у заходнебеларускай літаратуры і крытыцы.

Уздым Грамады (1925–1927 гг.) выклікаў да жыцця такую з'яву як масавая паэзія, якая мела завострана публіцыстычны характар. У яе прыхо-

дзілі аматары мастацкага слова, паэты-самавукі, захопленыя адраджэнскімі зрухамі. Папулярным быў вобраз змагара, грамадаўца-актывіста, які ахвярує сабой дзеля вызвалення, сацыяльнага і нацыянальнага. Нярэдка ён быў выразнікам палітычных ідэй «перадавой» КПЗБ, якая курыравала грамадскі друк. Для прадстаўнікоў масавай паэзіі характэрна была аднастайнасць тэматыкі, трафарэтная сімволіка вобразаў, прымітывізм вершавання, не хапала самабытнасці стылю.

З шэрагаў масавай паэзіі вылучыліся сапраўдныя таленты, адметныя творчыя індывідуальнасці: М. Васілёк, М. Машара, С. Крывец, Фр. Грышкевіч і інш. Галоўным пафасам іх паэзіі было выяўленне абуджанай нацыянальнай і чалавечай годнасці беларуса, духоўных памкненняў. Нярэдка іх творчасць набывала апалітычны характар, пашыралася да асэнсавання вечных каштоўнасцей, выяўлення хараства ў жыцці чалавека прыроды і Сусвету. Эстэтычныя ідэалы, пошукі гармоніі прываблівалі ў паэзіі пясняркі «чыстай красы» Н. Арсенневай (зборнік «Пад сінім небам», 1927 г.).

Рамантычны тып светаўспрымання такіх паэтаў, як Л. Родзевіч, А. Салагуб, П. Пестрак, В.Таўлай (камуністаў-падпольшчыкаў), акцэнтаваўся на ідэалах рэвалюцыйнай барацьбы, ідэалагічных прынцыпах – прынцыпах класавасці, партыйнасці, як і ў савецкай літаратуры.

Крышталізацыі нацыянальна-эстэтычных каштоўнасцей садзейнічала літаратурная крытыка (Антон Луцкевіч, Уладзімір Самойла, Адам Станкевіч, Ігнат Дварчанін і інш.), здабыткі якой у асэнсаванні мастацкіх з’яў сталі заваёвай агульнабеларускага культурнага працэсу.

У складаных варунках 30-х гадоў, выкліканых сусветным эканамічным крызісам, падаўленнем адраджэнскага руху ў Заходняй і нацыянальным тэрорам, рэпрэсіямі ў Савецкай Беларусі, мастацкая літаратура развівалася ў адзінай плыні беларускай культуры, на захаванне якой арыентавалі дэмакратычныя арганізацыі Заходняй Беларусі. Многія пісьменнікі перажывалі духоўны крызіс, перыяд творчых хістанняў, абумоўлены засіллем рэакцыі на ўсёй Беларусі. Так, М. Васілёк і М. Машара расчараваліся ў палітычных ідэалах Грамады, зведаўшы турмы, сталі вольнымі паэтамі, асэнсоўвалі шматлікія праявы хараства, філасофію жыцця.

У літаратуры і крытыцы высока лунаў сцяг «красы й мастацтва», узняты яшчэ ў 20-я гады А. Луцкевічам. Нават паэты-камуністы зразумелі, што адмаўленне ад эстэтычнай функцыі літаратуры можа знішчыць мастацтва слова. Пасля роспуску КПЗБ Камінтэрнам яны пайшлі на супрацоўніцтва з дэмакратычным друкам, расцэньваючы гэта як тактычны крок (М. Танк, Р. Шырма).

Значнай падзеяй стала з’яўленне літаратурна-мастацкага часопіса «Калосьсе» (1935–1939 гг.), які імкнуўся аб’яднаць усе творчыя сілы на

агульнабеларускім грунце. У тагачаснай паэзіі вылучыўся самабытны талент М. Танка (зб. «На этапах», «Журавінавы цвет», «Пад мачтай»).

Адраджэнскія ідэалы асэнсоўваюцца на новым этапе праз тэматычную паліфанію і мадэрнісцкія сродкі вобразна-інтанацыйнай экспрэсіі, сінтаксічнай будовы ў творчасці Хв. Ілляшэвіча (зб. «Веснапенні», «Зорным шляхам», «Захварбаваныя вершы»), у новых паэтычных зборніках М. Машары («З-пад сялянскіх стрэх»), М. Васілька («З сялянскіх ніў»), Фр. Грышкевіча (зб. «Веснавыя мелодыі» і інш.).

Сатырычны пафас творчасці ў спалучэнні з хрысціянскімі і нацыянальнымі ідэаламі вызначаюць мастацкія індывідуальнасці В. Адважнага (паэтычны зборнік «Беларускія цымбалы», аповесць «Хлапец», апавяданні), Я. Быліны (зборнік баек і сатырычных вершаў «На покуці», камедыя «Выбар старшыні»).

Увогуле з сярэдзіны 30-х гадоў адбыўся новы ўздым паэзіі, які спрыяў смелым пошукам, мадэрнісцкім тэндэнцыям у ёй, праблемнаму і жанраваму ўзбагачэнню мастацкай літаратуры. Асабліва значныя набыткі назіраліся ў жанры паэмы. Паэтычны эпас у Заходняй Беларусі замяняў часткова буйныя жанры прозы. Форма паэмы давала мажлівасць звярнуцца да асэнсавання гістарычна і нацыянальна значных грамадскіх падзей, асэнсаваць іх з пазіцый эпасу. Адсюль і з'яўленне розных відаў паэмы ў творчасці М. Танка (гераічная паэма-хроніка «Нарач», фальклорна-рамантычная паэма «Журавінавы цвет» і інш.), М. Машары ( гістарычная паэма «Смерць К. Каліноўскага», фальклорная паэма «Мамчына горка», «Валачобнае» – «хрысціянская імша» і інш.), М. Васілька («Арлы»), В. Таўлая (лірыка-публіцыстычныя паэмы «Песня пра сухар», «Таварыш», «Кобрыншчына»). Дасягненні заходнебеларускай паэмы былі высока ацэнены крытыкай (таксама і польскай), асабліва творчасць М. Танка.

«Другім рэнесансам» называўся перыяд другой паловы 30-х гадоў, распачаты ў заходнебеларускай літаратуры М. Танкам, М. Васільком, М. Машарам і інш. Ім быў характэрны творчы пошук, засваенне прыёмаў еўрапейскага мадэрнізму: наватарства ў выкарыстанні смелай вобразнасці, формаў белага і свабоднага верша, караткаметражнасць і хранікальнасць ў перадачы падзей ( у М. Танка), новыя, арыгінальныя сродкі экспрэсіі паэта «лініі падзелу» (М. Васілька) і інш.

Заходнебеларуская крытыка апынулася ў авангардзе нацыянальнай крытыкі. Яна давала аб'ектыўную, праўдзівую ацэнку беларускай літаратуры 30-х гадоў, выяўляла бесперспектыўнасць партыйна-ідэалагічных прыярытэтаў, супрацьстаяла вульгарна-сацыялагізатарскай савецкай крытыцы. Духоўна-эстэтычныя крытэрыі вызначалі праграму крытыкі часопіса «Калосьсе» (Адам Станкевіч, Антон Луцкевіч (Навіна), Уладзімір Самойла, Станіслаў Станкевіч, А. Бужанскі і інш.). Адкрываліся абсягі больш

шырокіх творчых кантактаў на еўрапейскім узроўні. Мастацкае і крытычнае слова ў складаных умовах несла свайму народу святло красы, праўды, свабоды, умацоўвала веру ў адраджэнскія ідэалы. Гэты перспектыўны ва ўсіх адносінах працэс развіцця быў спынены ў 1939 годзе.

## ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў ПОСТАЦЯХ: КАЗІМІР СВАЯК (1890–1926)

Каб не змалела Айчыны ідэя…
*К. Сваяк*

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадская і рэлігійная дзейнасць заходнебеларускага святара-адраджэнца.
2. Зборнік вершаў К. Сваяка «Мая ліра» (1924). Духоўныя і хрысціянскія каштоўнасці ў асэнсаванні паэта. Гуманістычны і патрыятычна-адраджэнскі пафас яго вершаў. Асаблівасці паэтычнага стылю Сваяка. Дыскусія ў друку (1926 г.) вакол творчай індывідуальнасці паэта (артыкулы У. Самойлы, А. Навіны, Я. Светазара, Ст. Грынкевіча і інш.).
3. Тэматыка і праблематыка драматургічных твораў К. Сваяка «Янка Канцавы», «Купалле». Народны побыт і хрысціянская мараль. Жанравыя асаблівасці твораў.
4. Філасофскі дзённік паэта «Дзея маёй мыслі, сэрца і волі».

### Літаратура


1. Сваяк, К. Мая ліра / К. Сваяк. – Мінск: Маст. літ., 1993.
2. Сваяк, К. Дзея маёй мыслі, сэрца і волі / К. Сваяк. – Мінск: Маст. літ., 1992.
3. Багдановіч, І. Сваяк Казімір / І. Багдановіч // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1995. – Т. 5. – С. 270–273.
4. Бельскі, А. Казімір Сваяк / А. Бельскі // Краса і смутак / рэд. У. Караткова. – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 19–21.
5. Дубавец, С. «Пішу, бо плача сэрца…» (да 100-годдзя з дня нараджэння К. Сваяка) / С. Дубавец // ЛіМ. – 1990. – 2 сакавіка.
6. Кавальчук, А. Спавіў мне сэрца жаль...» / А. Кавальчук // Роднае слова. – 2002. – № 12. – С. 7–9.
7. Калеснік, У. Ветразі Адысея / У. Калеснік. – Мінск, 1977. – С. 141–143.

8. Мароз, К. Дыскусія 1926 года як адлюстраванне светапоглядных і творчых разыходжанняў даследчыкаў літаратуры / К. Мароз // Літаратурная крытыка Заходняй Беларусі / пад рэд. У. Сенькаўца. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2001. – С. 45–51.

9. Мароз, К. Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі: хрэстаматыя / К. Мароз, М. Мішчанчук. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – С. 154–158.

10. Мікуліч, М. «Мудрае шчасце – веры шуканне...» / М. Мікуліч // Полымя. – 2009. – № 10. – С. 149–152.

11. Сачанка, Б. Казімір Сваяк / Б. Сачанка // Сняцца сны аб Беларусі… / рэд. М. Мятліцкі. – Мінск: Маст. літ., 1990. – С. 281–284.

12. Стаповіч, Б. З успамінаў пра К. Сваяка / Б. Стаповіч // Полымя. – 1990. – № 2. – С. 115–117.

## МІХАСЬ МАШАРА
## (1902–1976)

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадская і творчая дзейнасць.
2. Нацыянальна-вызваленчыя і агульначалавечыя матывы ў лірыцы Машары. Зборнікі вершаў «Малюнкі» (1928), «На сонечны бераг» (1934), «Напрадвесні» (1935), «З-пад стрэх саламяных» (1937). Адметнасці паэтычнага стылю.
3. Паэмы «Вяселле» (1934), «Валачобнае»(1935), «Смерць Кастуся Каліноўскага» (1934), «Мамчына горка» (1936). Тэмы, вобразы, асаблівасці жанравай формы паэм.
4. Драматычныя творы М. Машары: п’есы «Вось тут і зразумей» (1934), «Лёгкі хлеб» (1936) і інш. Адлюстраванне жыцця вясковай моладзі.
5. Творчасць перыяду вайны і пасляваеннага часу. Патрыятычны пафас паэзіі.

### Літаратура

1. Лебедзеў, У. Машара Міхась / У. Лебедзеў // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994.– Т. 4. – С. 270–278.

2. Гілевіч, Н. Паэзія М. Машары / Н. Гілевіч // Мая азёрная краіна / М. Машара. – Мінск: Маст. літ., 1962.

3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 210–282.

4. Зарэцкая, В. Гуманістычны пафас заходнебеларускай літаратуры / В. Зарэцкая, М. Яніцкі. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2007. – С. 61–75.
5. Ліс, А. Адраджэнская маладосць Міхася Машары / А. Ліс // Спадчына. – 1997. – № 5. – С. 124–126.
6. Станкевіч, С. Аб беларускай літаратурнай сучаснасьці ў Заходняй Беларусі / С. Станкевіч // Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі: хрэстаматыя / К. Мароз, М. Мішчанчук. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – С. 179–183.
7. Мікуліч, М. «Сею песні на ўзмежку...» / М. Мікуліч // Полымя. – 2004. – № 12. – С. 18–22.
8. Яніцкі, М. Гуманістычныя традыцыі давераснёўскай лірыкі М. Машары / М. Яніцкі // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2002. – С. 169–172.

## МІХАСЬ ВАСІЛЁК
## (1905–1960)

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадская і творчая дзейнасць.
2. Зборнікі паэзіі «Шум баравы» (1929) і «З сялянскіх ніў» (1937). Эвалюцыя поглядаў і мастацкага стылю. Адраджэнска-вызваленчыя матывы і філасофска-эстэтычныя пошукі.

### Літаратура

1. Калеснік, У. Васілёк Міхась / У. Калеснік // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1992. – Т. 1. – С. 529–533.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 210–281.
3. Зарэцкая, В. Гуманістычны пафас заходнебеларускай літаратуры / В. Зарэцкая, М. Яніцкі. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2007. – С. 51–60.
4. Калеснік, У. Лёсам пазнанае / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1982. – С. 31–115.
5. Бужанскі, А. Міхась Васілёк «З сялянскіх ніў» / А. Бужанскі // Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі: хрэстаматыя / К. Мароз, М. Мішчанчук. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – С. 205.
6. Мікуліч, М. «Я – сын мазоля, сын раллі» / М. Мікуліч // ЛіМ. – 1995. – 8 снежня.
7. Шырма, Р. Песні барацьбы і народнага шчасця / Р. Шырма // Песня – душа народа. – Мінск: Маст. літ., 1976. – С. 124–1127.

## ХВЕДАР ІЛЬЯШЭВІЧ
## (1910–1948)

1. Біяграфічныя звесткі. Драматызм і трагізм лёсу эмігранта.

2. Зборнікі вершаў «Веснапесні» (1929), «Зорным шляхам» (1932), «Захварбаваныя вершы» (1936). Тэма горада ў паэзіі віленскага перыяду. Пейзажная і інтымная лірыка. Вобраз лірычнага героя. Філасофская і эстэтычная глыбіня твораў. Самабытнасць творчай індывідуальнасці, мадэрнісцкія адзнакі стылю.

### Літаратура

1. Мальдзіс, А. Ільяшэвіч Хведар / А. Мальдзіс // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – Т. 3. – С. 14–16.

2. Віч, Я. Хведар Ільяшэвіч «Захварбаваныя вершы» / Я. Віч // Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі: хрэстаматыя / К. Мароз, М. Мішчанчук. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – С. 203.

3. Зарэцкая, В. Гуманістычны пафас заходнебеларускай літаратуры / В. Зарэцкая, М. Яніцкі. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2007. – С. 45–50.

4. Ліс, А. Лірыка Хведара Ільяшэвіча / А. Ліс // Полымя. – 1998. – № 11. – С. 241–244.

5. Мішчанчук, М. «Я не першы ў песьнях згараю...» / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура 20 стагоддзя. – Мінск: Выш. школа, 2001. – С. 215–220.

6. Сачанка, Б. Беларуская эміграцыя: факты і меркаванні / Б. Сачанка // Маладосць. – 1988. – № 11. – С. 156–158.

7. Яніцкі, М. Асоба лірычнага героя ў заходнебеларускай спадчыне Хведара Ільяшэвіча / М. Яніцкі // V рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2005. – С. 301–306.

## ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ
## (1888–1954)

1. Жыццё і творчасць мастака-жывапісца і пісьменніка. Самабытнасць таленту.

2. Праблематыка задуманага рамана «Вар'ят без вар'яцтва». Першая частка – аповесць «Пабрацімцы. Вялікая шышка»(1923). Наватарства пісьменніка ў стварэнні жанру інтэлектуальна-псіхалагічнага рамана. Вобразы інтэлігентаў-мастакоў. Вобраз Гапука як тып антыгероя. Сімвалізм як метад пісьменніка.

3. Гістарычная і філасофска-касмічная тэматыка рукапісных твораў (паэма «Трызна мінуўшчыны», «Алвазія», «Жыццё на Месяцы», «Андрыянаполіс» і інш.). Пачынальнік філасофска-фантастычнага жанру ў прозе. Містычны план у творах пісьменніка.

4. Дзённік Я. Драздовіча. Самабытнасць светаразумення, прарочыя і фантастычныя матывы. Як дапаўняюць алегарычна-сімвалічную сутнасць карцін Я. Драздовіча яго тэксты-каментарыі да іх?

5. Творчасць Я. Драздовіча ў еўрапейскім кантэксце.

**Літаратура**


1. Драздовіч, Я. Дзённік / Я. Драздовіч // Маладосць. – 1991. – № 5–12.
2. Багдановіч, І. Драздовіч Язэп / І. Багдановіч // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993.– Т. 2. – С. 370–372.
3. Ліс, А. Вечны вандроўнік / А. Ліс. – Мінск: Маст. літ., 1984.
4. Малаш, Ю. «Нашы прадзеды жылі словамі» (літаратурная і даследчыцкая дзейнасць Я. Драздовіча) / Ю. Малаш // Роднае слова. – 1998. – № 2.
5. Малаш, Ю. «Нашы прадзеды жылі словамі» (літаратурная і даследчыцкая дзейнасць Я. Драздовіча) / Ю. Малаш // Полымя. – 1998. – № 4.
6. Малаш, Ю. Язэп Драздовіч – аўтар «Трызны мінуўшчыны» / Ю. Малаш // ЛІМ. – 2007. – № 42. – С. 15.
7. Мароз, К. Язэп Драздовіч як мастак слова / К. Мароз // Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ. – Брэст: ПУП «Издательство Альтернатива», 2008. – С. 123–129.
8. Суліма. З «Гаспадарства кветак васілька і пралескі» на заваяваньне места / З. Суліма // Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі: хрэстаматыя / К. Мароз, М. Мішчанчук. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – С. 142–145.


## ЛЕАПОЛЬД РОДЗЕВІЧ
## (1895–1938)

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадская і творчая дзейнасць. Драматызм лёсу.

2. Апавяданні і зборнік вершаў «Беларусь» (1922). Патрыятычны пафас. Прыёмы мадэрнісцкай манеры пісьма.

3. Тэматыка і праблематыка драматычных твораў: «Пакрыўджаныя» (1921), «Пасланец» (1920), «Збянтэжаны Саўка» (1921), «Конскі партрэт» (1923), «На Каляды» (1922), «Досьвіткі»(1922), «У кавалёвай хаце» і інш.

Народныя тыпы характараў. Камедыйнае майстэрства драматурга. Адметнасці жанравай формы. Сцэнічны лёс лепшых п’ес.

4. Творчасць савецкага перыяду. Дэкларатыўнасць і тэндэнцыйнасць у адлюстраванні жыцця. Падмена эстэтычнага прынцыпу класавым у крытычных працах («Слова аб літаратуры»).

**Літаратура**

1. Калеснік, У. Родзевіч Леапольд / У. Калеснік // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1995. – Т. 5. – С. 153–156.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – Т. 2. – С. 210–281.

3. Калеснік, У. Ветразі Адысея / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1977. – С. 69–71, 112–115, 190–192, 229–231.

4. Калеснік, У. Пасланец Праметэя / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1984. – С. 130–133, 137–138, 141–143.

5. Семяновіч, А. Л. Родзевіч / А. Семяновіч // Гісторыя беларускай драматургіі: XIX – пач. XX стст. – Мінск: Выш. школа, 1985.

6. Ліс, А. Паміж літаратурай і палітыкай: драма аднаго рамантыка / А. Ліс // Спадчына. – 1997. – № 3. – С. 123–126.

## ПІЛІП ПЕСТРАК
## (1903–1978)

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадска-палітычная і творчая дзейнасць.

2. Тэмы, матывы паэзіі Пестрака, вобраз лірычнага героя ў зборніку «На варце» (1940). Рэвалюцыйныя матывы, турэмныя вершы.

3. Апавяданні і раманы пасляваеннага часу: раманы «Сустрэнемся на барыкадах» (1951), «Серадзібор» (1963), незакончаны «Лесавічанка». Праблемы жыцця заходнебеларускай вёскі, дзейнасці камуністаў-падпольшчыкаў, утварэння калгасаў. Тэндэнцыйнасць у стварэнні вобразаў. Вартасці і недахопы раманаў, адметнасці стылю.

**Літаратура**

1. Савік, Л. Пестрак Піліп / Л. Савік // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1995. – Т. 5. – С. 5–13.

2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 2003. – Т. 4. – С. 163–182.

3. Пестрак, П. Збор твораў: у 5 т. / П. Пестрак. – Мінск: Маст. літ., 1984.

4. Каваленка, В. Праз цяжар асрожных пакут / В. Каваленка // Полымя. – 2001. – № 10. – С. 247–249.

5. Калеснік, У. Інжынер барыкад / У. Калеснік // Зорны спеў. – Мінск: Маст. літ., 1975.

6. Куляшоў, Ф. Піліп Пестрак як раманіст / Ф. Куляшоў // Літаратурныя партрэты. – Мінск: Маст. літ., 1983.

7. Хромчанка, К. Непадуладнае забыццю / К. Хромчанка // Роднае слова. – 2003. – № 9. – С. 5–9.

## ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ
## (1914–1947)

1. Біяграфічныя звесткі. Падпольная і творчая дзейнасць.
2. Патрыятычная і гуманістычная напоўненасць вершаў В. Таўлая, асаблівасці паэтычнай манеры пісьма.
3. Эпічныя творы: паэмы «Непераможная» (1928), «Кобрыншчына», «Песня пра сухар», «Таварыш». Адлюстраванне жыцця палітвязняў, стыхійных выступленняў у абарону Грамады, на Кобрыншчыне. Ідэйны змест і мастацкія асаблівасці. Жанравая форма твораў.

### Літаратура

1. Таўлай, В. Выбраныя вершы і паэмы / В. Таўлай. – Мінск: Маст. літ., 1967.

2. Арочка, М. Беларуская савецкая паэма / М. Арочка. – Мінск, 1979. – С. 171–174.

3. Калеснік, У. Таўлай Валянцін / У. Калеснік // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1995. – Т. 6. – С. 80–84.

4. Бярозкін, Р. Кніга пра паэзію / Р. Бярозкін. – Мінск: Маст. літ., 1974. – С. 352–367.

5. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. Навук Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 2001. – Т. 3. – С. 457–478.

6. Грамадчанка, Т. Шляхі В. Таўлая / Т. Грамадчанка // Роднае слова. – 1999. – № 2. – С. 7–10.

7. Жалкоўскі, А. Малавядомыя старонкі з біяграфіі В. Таўлая / А. Жалкоўскі // ЛІМ. – 2008. – № 27. – С. 14.

8. Зарэцкая, В. Выяўленча-гуманістычны пафас паэм В. Таўлая / В. Зарэцкая // Гуманістычны пафас заходнебеларускай літаратуры / В. Зарэцкая, М. Яніцкі. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2007. – С. 241–251.

9. Калеснік, У. Усё чалавечае / У. Калеснік. – Мінск: Маст літ., 1993. – С. 38–60.

## ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

1. «За парогам калючкамі слалася сцежка». Трагічныя старонкі жыцця Янкі Купалы.
2. «Змагайся і стань вольным, беларускі народ!» Паэзія і публіцыстыка Янкі Купалы 1918–1919 гадоў XX ст.
3. Палітычная лірыка Янкі Купалы 20-х гадоў XX ст.
4. Паэт і дыктатура. Творчасць Купалы канца 20–30-х гадоў XX ст.
5. Ідэя Маладой Беларусі ў спадчыне Купалы.
6. Раннія паэмы Янкі Купалы і фальклорна-літаратурная традыцыя: «Зімою», «Нікому», «Адплата кахання», «Калека», «У піліпаўку».
7. Фальклорна-рамантычныя паэмы Янкі Купалы.
8. «Хай вам шчасцем свецяць дні!..» Тэма беларускай моладзі ў спадчыне Купалы.
9. «Ты не можаш быць, песня, скаванаю». Праблема прызначэння паэта і паэзіі, мастака і мастацтва ў творчасці Янкі Купалы.
10. «Роднай нівы я мільённая часціца». Услаўленне стваральнай працы, чалавека-працаўніка і патрыёта ў спадчыне Янкі Купалы.
11. Вобраз галоўнага героя інтэлігента ў першым пакаленні ў ранняй творчасці Максіма Гарэцкага.
12. Антываенныя творы Максіма Гарэцкага.
13. Праблематыка і сістэма вобразаў у аповесці «Дзве душы».
14. Максім Гарэцкі як літаратурны крытык.
15. Публіцыстыка Максіма Гарэцкага.
16. Максім Гарэцкі – перакладчык «Слова аб палку Ігаравым».
17. «Выспа Патмос сэрца мацуе». Творчасць М. Гарэцкага ў высылцы.
18. Лёс беларускага народа і самога пісьменніка ў «Скарбах жыцця».
19. Жыццёвыя, духоўна-філасофскія пошукі Лявона Задумы ў аповесцях «У чым яго крыўда?», «Меланхолія».
20. «Камароўская хроніка» – апошні паклон вёсцы, з якой выйшаў сам пісьменнік» (А. Адамовіч).
21. Л. Калюга ва ўспамінах сучаснікаў, сяброў.
22. Пратэст супраць глумлення над чалавекам, супраць сляпога паслушэнства ў апавяданнях Л. Калюгі.
23. Асэнсаванне лёсу аўтабіяграфічнага героя і ўсяго беларускага народа ў аповесці «Нядоля Заблоцкіх».
24. Вобраз Маркі, пратэст супраць абставін і любоў да Беларусі ў рамане «Пустадомкі».
25. Тэма Беларусі і абагульнены вобраз «аблудных бесхацімцаў» у аповесці «Дзе косці мелюць».
26. Праблемы маралі і роздум над лёсам беларускай моладзі ў аповесці «Зоры вядомага вам горада».

27. Спадчына Л. Калюгі ў ацэнках сучаснага літаратуразнаўства.

28. З якімі творамі «гулагаўскай» тэматыкі беларускай і іншых літаратур можна параўноўваць «Творы з-за крат» Л. Калюгі?

29. Тэматычная разнастайнасць і мастацкая арыгінальнасць баек Крапівы. Канкрэтна-гістарычнае і агульначалавечае ў іх.

30. Праблематыка і мастацкія асаблівасці празаічных твораў Крапівы (апавяданні, раман «Мядзведзічы»).

31. Кола маральна-этычных праблем у п’есе «Канец дружбы». Канкрэтна-гістарычнае і агульначалавечае ў творы.

32. Сатырычныя і гумарыстычныя творы Крапівы часу Вялікай Айчыннай вайны.

33. Рэаліі 30-х гадоў у сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім».

34. Фантастычная камедыя «Брама неўміручасці» як класічны твор.

35. Вобразы Жлукты і яго «кліентаў» і асуджэнне паразітызму, прыстасаванства (па п’есе «Мілы чалавек»).

36. Літаратурна-крытычныя працы Крапівы: «Беларускія прыказкі», «Думкі пра сатыру», «П’есы і вобразы», «Аб сатырычнай камедыі», «Канфлікт – аснова п’есы».

37. Патрыятызм і шматпакутнасць беларускага народа ў апавяданнях Міхася Лынькова часу Вялікай Айчыннай вайны.

38. Збіральны вобраз беларускага народа-змагара ў рамане «Векапомныя дні».

39. Рэалістычна-бытавыя апавяданні Бядулі, іх праблематыка і вобразы.

40. Духоўнае аблічча скразнога лірычнага героя «Абразкоў» Бядулі.

41. Антываенныя творы Бядулі і іх стылёвыя асаблівасці.

42. Асаблівасці адлюстравання грамадзянскай вайны ў творчасці Бядулі.

43. Творчасць Бядулі перыяду «Маладняка».

44. Творчасць Бядулі перыяду «Узвышша».

45. Драматызм лёсу мастака і народа ва ўмовах сацыяльнага і духоўнага ўціску (па аповесці Бядулі «Салавей»).

46. Ідэя абароны чалавечай годнасці ў аповесці «Тры пальцы» Бядулі.

47. Праблематыка і мастацкія асаблівасці рамана-гратэска Бядулі «Язэп Крушынскі».

48. Філасафізм і актуальнасць зместу аповесці-казкі «Сярэбраная табакерка» Бядулі.

49. Якуб Колас як філосаф і псіхолаг у прозе «малых» жанраў.

50. Майстэрства прыроднага жывапісу ў паэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка» Я. Коласа.

51. Коласаўскі эпас. Праблема чалавека і зямлі.

52. Коласаўскі эпас. Праблема мастака і мастацтва.

53. Праблема інтэлігенцыі ў трылогіі «На ростанях».

54. Апавяданні А. Мрыя. Маральна-этычныя вартасці і іх дэфармацыя падчас рэвалюцыйных і грамадскіх зменаў.

55. Самсон Самасуй і самасуеўшчына.

56. Сінтэз рэалістычных і рамантычных прыёмаў пісьма ў апавяданнях і аповесцях М. Зарэцкага.

57. Праблемна-тэматычнае і кампазіцыйнае «вязьмо» ў рамане «Вязьмо» М. Зарэцкага.

58. Сатырычнае адлюстраванне грамадскага жыцця 20-х гадоў XX ст. у рамане А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя».

59. Трылогія паэм У. Дубоўкі і рэаліі 20-х гадоў у адлюстраванні паэта. Наватарскія пошукі ў галіне жанру.

60. Патрыятычны пафас і апяванне красы ў паэзіі У. Дубоўкі.

61. Проза У. Дубоўкі. Зборнік «Пялёсткі» і яго філасофскі змест.

62. Нацыянальная філасофія і міфалогія ў аповесці «Лабірынты» В. Ластоўскага.

63. Мастацкі стыль В. Ластоўскага-апавядальніка.

64. Інтэлектуальна-філасофская і патрыятычная змястоўнасць паэзіі В. Ластоўскага.

65. Духоўна-адраджэнская паэзія Казіміра Сваяка.

66. Раман Я. Нёманскага «Драпежнікі». Драматызм чалавечых лёсаў падчас грамадскіх катаклізмаў пачатку 20 стагоддзя.

67. Лёс і спадчына Я. Нёманскага. Гуманістычны пафас яго апавяданняў.

68. Таталітарная сістэма і яе носьбіты ў аповесці Ф. Аляхновіча «У капцюрох ГПУ». Аўтабіяграфічнасць твора.

69. Увасабленне ідэі служэння народу ў п’есе Ф. Аляхновіча «Няскончаная драма». Вобразы Васіля і Кастуся.

70. «Заручыны Паўлінкі» і «Пан Міністар» Ф. Аляхновіча. Вобразы і адметнасць драматургічнага майстэрства.

71. Кузьма Чорны-апавядальнік. Эвалюцыя стылю.

72. Раманы «Сястра» і «Зямля» К. Чорнага. Эпоха 20-х гадоў, чалавек і народ ў інтэлектуальна-псіхалагічным і сацыяльна-філасофскім асвятленні аўтара.

73. Трагедыя чалавека і беларускага сялянства ў творах К. Чорнага 20–30-х гадоў («Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне»).

74. Эпічная маштабнасць і філасофская глыбіня раманаў К. Чорнага перыяду вайны.

75. Праблематыка і вобразы аповесцяў П. Галавача «Вінаваты», «Спалох на загонах». Тэндэнцыйнасць у паказе «вялікага пералому».

76. Я. Пушча – прадстаўнік імажынізму ў паэзіі 20-х гадоў. Эвалюцыя паэта.

77. Паэма Я. Пушчы «Цень Консула». Гістарычная аснова твора.

78. У. Жылка як прадстаўнік эстэтычнага кірунку ў беларускай паэзіі.

79. Паэма «Уяўленне» У. Жылкі. Хрысціянская сімволіка і адраджэнскі пафас.

80. Творчыя пошукі А. Гаруна ў галіне прозы і драматургіі.

81. Я. Драздовіч як адзін з пачынальнікаў інтэлектуальна-філасофскай і фантастычнай прозы.

82. «Збянтэжаны Саўка», «Конскі партрэт» Л. Родзевіча. Камедыйнае майстэрства аўтара.

83. Творчая індывідуальнасць М. Машары.

84. Адраджэнскія і агульначалавечыя матывы ў паэзіі М. Васілька.

85. Паэмы В. Таўлая і іх значэнне ў развіцці заходнебеларускага эпасу.

86. П. Пестрак як паэт і празаік.

87. Літаратурна-грамадскі рух на Беларусі ў 20-я гады XX ст. Пісьменніцкія арганізацыі: «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», «БелАПП».

88. Мастацкая канцэпцыя зборніка «Вянок» М. Багдановіча. Паэт «чыстай красы» і шматграннасць яго светаўяўлення.

89. Вершы, паэмы М. Багдановіча апошніх гадоў жыцця. Іх праблематыка, мастацкія асаблівасці.

90. М. Багдановіч – празаік.

91. Літаратурна-крытычная і навуковая спадчына М. Багдановіча.

92. Ядвігін Ш. – пачынальнік беларускай прозы.

# ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ
## па курсу гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя для студэнтаў ІІІ курса БФ

1. Літаратура пачатку ХХ стагоддзя. «Нашаніўскі» перыяд. Фарміраванне класічных асноў паэзіі, прозы, драматургіі.
2. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Багдановіча. Станаўленне творчай індывідуальнасці. Літаратуразнаўчыя даследаванні аб творчасці паэта.
3. Зборнік «Вянок» М. Багдановіча. Творчая задума, структура зборніка, асноўныя тэмы, матывы, вобразы. Наватарства Багдановіча ў галіне паэтыкі, жанравых формаў (на памяць).
4. Вершы М. Багдановіча апошніх гадоў. Пошук нацыянальна-самабытнага шляху ў вершах «беларускага складу». Сінтэз нацыянальных і класічных традыцый у творах 1915–17 гг. Паэмы М. Багдановіча.
5. Праблема мастака і мастацтва ў апавяданнях М. Багдановіча «Музыка», «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару», «Шаман» і інш. Крытычная і навуковая дзейнасць.
6. Біяграфічныя звесткі і творчы шлях Янкі Купалы. Фарміраванне творчай індывідуальнасці.
7. Паэзія Янкі Купалы «нашаніўскага» перыяду. Зборнікі «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця». Тэматычная і жанравая разнастайнасць вершаў. Вобразы мужыка, народа, маладой Беларусі. Рысы паэтычнага стылю Я. Купалы як рамантыка і мадэрніста (на памяць).
8. Фальклорна-рамантычныя паэмы Я. Купалы «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва». Увасабленне гераічнага народнага характару як ідэалу паэта. Мастацкія асаблівасці твораў. Паэма «На Куццю».
9. Драматычныя паэмы Я.Купалы («Адвечная песня», «Сон на кургане», «На папасе»). Вобразы. Умоўна-сімвалічны план у паэмах. Асаблівасці жанру.
10. Драматургія Я. Купалы («Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Прымакі»). Праблемы, вобразы, жанравыя асаблівасці.
11. Паэзія і публіцыстыка Янкі Купалы 1918–1920 гг. Зборнік «Спадчына» і вернутыя творы. Патрыятычна-адраджэнскі пафас, публіцыстычная накіраванасць вершаў. Паэма «Безназоўнае» (на памяць).
12. Трагікамедыя Я. Купалы «Тутэйшыя». Праблематыка, вобразная сістэма, асаблівасці жанру.
13. Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Значэнне творчасці нацыянальнага класіка.
14. Станаўленне і развіццё мастацкай індывідуальнасці Я.Коласа-лірыка. Зборнік «Песні жальбы», тэматыка, вобраз мужыка, рысы стылю. Вершы савецкага часу (на памяць).

15. Раннія апавяданні Я. Коласа. Наватарства пісьменніка, паглыбленне псіхалагізму. «Казкі жыцця». Гуманістычны пафас апавяданняў 20-х гадоў.

16. Паэма Я. Коласа «Новая зямля». Гісторыя напісання. Біблейская сімволіка. Праблема зямлі ў творы і яе вырашэнне. Вобраз Міхала. Паэма ў ацэнках літаратуразнаўцаў.

17. Паэтызацыя сялянскай працы, народны побыт, звычаі, святы ў паэме «Новая зямля» Я. Коласа. Беларуская сям’я ў творы. Роля пейзажных замалёвак і лірычных адступленняў, жанр твора.

18. Тэма мастака і мастацтва ў паэме «Сымон-музыка» Я. Коласа. Вобраз Сымона, другарадныя вобразы і іх значэнне ў творы. Рамантычная сімволіка і алегорыя ў паэме, роля ўстаўных элементаў.

19. Трылогія «На ростанях» Я. Коласа. Гісторыя напісання, тэматыка і праблематыка. Вобраз Андрэя Лабановіча.

20. Праблема інтэлігенцыі і яе вырашэнне ў трылогіі «На ростанях» Я. Коласа («крынічны струмень» і «балотная вада»). Чыноўнікі і духавенства ў творы. Адметнасць коласаўскага гумару. Стыль твора. Сэнс назваў аповесцей.

21. Асноўныя тэндэнцыі развіцця літаратуры ў 20-я гады. Дзейнасць літаб’яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя» і інш. Паэзія, проза, даматургія.

22. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага. Фарміраванне творчай індывідуальнасці. Даследаванні па творчасці пісьменніка.

23. Зборнік «Рунь» М. Гарэцкага. Наватарства , пісьменніка, тэматыка, вобразы, рысы мастацкага стылю. Апавяданні 20-х гадоў («Апостал», «Усебеларускі з’езд 1917 г.», «У 1920 г.», зб. «Сібірскія абразкі» і інш.).

24. Дакументальна-мастацкія запіскі «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага. Антываенны пафас твора, вобраз Лявона Задумы. Адметнасць жанру. Апавяданні перыяду вайны («Рускі», «Генерал», «Літоўскі хутарок» і інш.).

25. Аповесць «Дзве душы» М. Гарэцкага. Праблемы, адметнасць жанру, вобраз Ігната Абдзіраловіча. Праблема нацыянальнага адраджэння. Асуджэнне бальшавіцкага партыйнага тэрору і дыктату ўлады.

26. Аповесці М. Гарэцкага («У чым яго крыўда», «Ціхая плынь», «Меланхолія»). Сацыяльна-філасофскі змест твораў.

27. Раман-хроніка «Віленскія камунары» М. Гарэцкага. Тэматыка і праблематыка. Вобразы Міхася і Мацея Мышкаў, другарадныя вобразы, рысы мастацкага стылю.

28. «Камароўская хроніка» М. Гарэцкага як увасабленне гістарычнага і нацыянальнага лёсу народа. Сям’я Батураў-Задумаў у творы. «Скарбы жыцця» і іншыя дзённікавыя творы М. Гарэцкага апошніх гадоў.

Алегарычна-філасофскае асэнсаванне трагізму эпохі, уласнага жыцця і лёсу ўсяго народа.

29. Драматычная аповесць «Антон» М. Гарэцкага ці п’еса «Жартаўлівы Пісарэвіч». Праблематыка, вобразы, майстэрства пісьменніка і драматурга.

30. Творчасць У. Дубоўкі. Трылогія паэм «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты». Тэматыка, вобразы, адметнасці кампазіцыйнай будовы. Наватарства У. Дубоўкі (на памяць).

31. Творчасць Я. Пушчы. Эвалюцыя паэта ў 20-я гады (зб. «Раніца рыкае» і інш., цыкл «Лісты да сабакі», паэма «Цень Консула»).

32. Эвалюцыя мастацкага стылю К. Чорнага-апавядальніка ў 20-я гады. Тэмы, вобразы, філасофскае асэнсаванне чалавека і рэчаіснасці.

33. Інтэлектуальна-псіхалагічны раман «Сястра» К. Чорнага. Праблематыка, сістэма вобразаў. Евангельскі сэнс назвы.

34. Сацыяльна-філасофскі раман «Зямля» К. Чорнага. Кола праблем, вобразы, адметнасць кампазіцыйнай будовы, рысы стылю.

35. Аповесць «Лявон Бушмар» К. Чорнага. Неадназначнасць вобраза Бушмара-селяніна, ахвяры прымусовай калектывізацыі. Ацэнка твора савецкімі і сучаснымі даследчыкамі.

36. Раман «Бацькаўшчына» К. Чорнага ці «Трэцяе пакаленне» (на выбар). Праблематыка, драматызм лёсаў герояў. Схематызм як даніна часу. Рысы стылю.

37. Творчасць К. Чорнага перыяду вайны. Паглыблены філасофска-гуманістычны пачатак у рамане «Пошукі будучыні». Гістарызм у творы, вобразы сумлічан. Роля ўмоўнасці і сімволікі.

38. Лёс беларускага народа ў кантэксце сусветнай гісторыі ў рамане «Млечны шлях» К.Чорнага. Прыёмы ўмоўнасці і сімволікі. Вобразы У. Ярмаліцкага і іншых герояў твора. Асэнсаванне сутнасці фашызму. Ці: Сацыяльна-філасофская глыбіня рамана «Вялікі дзень» К. Чорнага. Сістэма вобразаў. Даследаванне вытокаў фашызму ў творы. Стыль, структура рамана. Наватарства Чорнага ў творах на антываенную тэму.

39. Творчасць В. Ластоўскага. Паэзія, проза. Раман «Лабірынты».

40. Апавяданні і аповесці М. Зарэцкага. Праблематыка, вобразы, эвалюцыя мастацкага стылю.

41. Праблематыка рамана М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі». Вобраз Васіля Лясніцкага. Другарадныя героі ў творы. Гуманістычны сэнс рамана, рысы творчай манеры пісьма.

42. Трагедыя народнага жыцця ў 30-я гады ў рамане М. Зарэцкага «Вязьмо». Праблема расчалавечвання чалавека ва ўмовах таталітарнай сістэмы. Вобразы, канфлікт у творы, рысы стылю. Ацэнка твора літаратуразнаўствам.

43. Жыццёвы і творчы шлях Андрэя Мрыя. Фарміраванне індывідуальнасці сатырыка ў апавяданнях 20-х гадоў.

44. Раман «Запіскі Самсона Самасуя» А. Мрыя. Праблематыка, вобразы, асаблівасці жанру, прыёмы і сродкі сатырычнага адлюстравання рэчаіснасці 20-х гадоў. Ацэнка твора вульгарызатарскай крытыкай 30-х гадоў і сучаснымі даследчыкамі.

45. К. Крапіва як байкапісец і сатырык. Апавяданні 20-х гадоў і асаблівасці мастацкага стылю (на памяць байкі).

46. Раман «Мядзведзічы» К. Крапівы. Праблематыка, вобразы, стыль, адметнасць жанравай формы.

47. Драма «Канец дружбы» К. Крапівы і рэаліі сталінскай эпохі 30-х гадоў. Вобразы, майстэрства драматурга. Ацэнка ў літаратуразнаўстве розных эпох. Ці: Сатырычная камедыя «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы. Узнаўленне атмасферы 30-х гадоў, праблемы, вобразы, майстэрства камедыёграфа.

48. Сатырычная камедыя «Мілы чалавек» К. Крапівы. Праблематыка, вобраз Жлукты, роля вобразаў Язвы і Праменнага. Майстэрства камедыёграфа. Ці: Фантастычная камедыя «Брама неўміручасці» К. Крапівы. Кола праблем, сатырычныя вобразы ў камедыі. Сродкі стварэння характараў персанажаў.

49. Творчасць У. Жылкі. Тэмы, матывы, вобразы лірыкі. Рысы паэтычнага стылю. Даследаванні па творчасці паэта.

50. Творчасць Л. Калюгі. Апавяданні, аповесць «Ні госць, ні гаспадар» (або «Нядоля Заблоцкіх»). Раман «Пустадомкі».

51. Заходнебеларуская літаратура. Творчасць М. Танка гэтага перыяду (вершы, паэмы «Нарач», «Журавінавы цвет», «Сказ пра Валя», «Каліноўскі»).

52. Шматграннасць паэзіі М. Танка 60–90-х гг. Майстэрства паэтыкі (удасканаленне верлібра, асацыятыўная вобразнасць і г.д.) (на памяць 1–2 вершы).

## ТЛУМАЧЭННЕ НЕКАТОРЫХ ІМЁНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

**Анакрэон** – старажытнагрэчаскі паэт. Прадстаўнік лёгкай жыццярадаснай лірыкі, якая апявала пачуцці асалоды, кахання.
**Броснець** – пакрывацца бросняй (зялёная паверхня з водарасцей, якой пакрываецца застаялая вада).
**Быльнёг** – адзін з відаў палыну, чарнобыль.
**Бянёкаць** – калыхаць дзіця.
**Вакханальны** – крайняя ступень беспарадку, разгульнага балявання (Вакх – у антычнасці – Бог віна, весялосці).
**Валатоўка** – курган, у якім паводле народных уяўленняў беларусаў, пахаваны легендарныя асілкі-волаты.
**Virelai –** класічнае «вирале», дзевяцірадковы верш, які складаецца з трох трохрадкоўяў з рыфмоўкай аБааБааБа.
**Вульгарызацыя** – грубае спрашчэнне якога-небудзь пытання, поглядаў, падача іх у скажоным выглядзе.
**Гемка** – Вялікая Мядзведзіца.
**Герцы** – махляры, марнатраўцы.
**Гея** – багіня зямлі.
**Грум** – (англ.) слуга, які конна суправаджае вершніка або едзе на запятках карэты, хлопчык-прыслужнік.
**Дэнацыяналізацыя –** заняпад нацыянальнай мовы, культуры, страта часткай інтэлігенцыі нацыянальнага самаўсведамлення, адыход ад сваіх абавязкаў перад народам, нацыяй.
**Жарства** – буйны калючы пясок, дробныя каменьчыкі, якія ўтвараюцца ад разбурэння горных парод.
**Забраснеўшы** – пакрыты цвіллю.
**Зык** – выкрык. Адрывісты гук.
**Імпэт** – парыў ветру. Пылкасць, імкненне.
**Інкрымінацыя** – прад’яўленне карнымі органамі каму-небудзь абвінавачванняў у чым-небудзь.
**Кааба** – галоўная святыня іслама.
**Каберац** – дыванок пад ногі.
**Каламыйка** – кароткія ўкраінскія песні, якія нагадваюць прыпеўкі.
**Каліўе** – сцёблы збожжавых злакаў, траў.
**Канцэпцыя** – сістэма поглядаў, спосаб разумення якіх-небудзь з’яў.
**Кілім** – шарсцяны бязворсавы дыван ручной работы.
**Кроза** – летуценне, мара.
**Крывія** – тое ж самае, што Беларусь; назвы Крывія, крывіч абгрунтоўваў у 20-я гады Вацлаў Ластоўскі, спасылаючыся на гістарычныя, геаграфічныя факты (крывічане – адно з найбольш пашыраных старажытных плямёнаў, на аснове якіх сфарміравалася беларуская нацыя)

**Крэп** – шаўковая альбо шарсцяная тканіна з шурпатай паверхняй; чорная празрыстая тканіна, а таксама жалобная павязка з такой тканіны.

**Латошыць** – ірваць без разбору, псуючы і спусташаючы; знішчыць безразважана; біць, лупцаваць.

**Лёха** – падземны ход, склеп.

**Лунь** – драпежная птушка сямейства ястрабіных з шаравата-белым апярэннем.

**Лютня** – старадаўні струнны шчыпковы музычны інструмент.

**Манюка** – хлус, ілгун.

**Медына** – горад, дзе жыў і пахаваны прарок Мухамад.

**Месія** – пасланец Бога, які павінен прыйсці на зямлю і выратаваць род чалавечы ад зла і пакут.

**Нагбом** – піць з вялікай пасудзіны, нахіліўшы яе.

**Нарог** – частка плуга, якая падразае зямлю знізу.

**Падвей –** міфалагічны вобраз, бог завірухі. Увасабляе нязломную сілу і мужнасць.

**Палаш** – зброя, падобна на шаблю, толькі з прамым і шырокім лязом, вострым з абодвух бакоў.

**Палімпсест** – рукапіс на пергаменце паверх змытага альбо саскрэбенага тэксту.

**Памаўзлівасць** – шкодлівасць, збродлівасць.

**Парка** – багіня лёсу ў старажытнай рымскай міфалогіі.

**Паркан** – агароджа з бярвёнаў, штыкецін альбо мураваная.

**Пасак** – шырокая рыска на чым-небудзь; частка збруі –рэмень, працягнуты ад адной аглоблі да другой цераз падсядзёлак; вузкі доўгі кавалак чаго-небудзь.

**Пегас** – міфалагічны крылаты конь, сімвал паэтычнага натхнення.

**Пошчак** – пералівісты, дрыжачы гук, трэль; водгук, рэха.

**Рамадан** – дзевяты месяц у мусульманскім календары, калі ўсе вернікі павінны трымаць пост і займацца дабрачыннай дзейнасцю.

**Рэабілітацыя** – аднаўленне ў ранейшых правах, вяртанне добрага імя беспадстаўна абвінавачанай асобе.

**Рэпрэсія** – карная мера (арышт, турэмнае зняволенне, высылка), пакаранне, якое прымяняецца дзяржаўнымі органамі.

**Самнамбул** – лунатык.

**Спрат** – тайнік; памяшканне для захоўвання чаго-небудзь.

**Стараваць** – гаварыць, размаўляць.

**Сура** – раздзел Карана.

**Таталітарны** – з адкрыта тэрарыстычнай дыктатурай і падаўленнем дэмакратычных свабод.

**Трысцё** – вадзяная ці балотная шматгадовая расліна сямейства злакаў з каленчатым цвёрдым сцяблом і раскідзістай мяцёлкай.
**Тэстамент** – запавет нашчадкам.
**Фэст** – вялікае свята ў сяле.
**Цырата** – тканіна, пакрытая з аднаго боку асобым саставам, які робіць яе непрамакальнай.
**Шал** – псіхічны стан чалавека, ахопленага вялікім гневам.
**Шопа** (szopa – польск.) – павець, стрэшка.

# ЗМЕСТ

Ад аўтараў ........ 3
Праграма па гісторыі беларускай літаратуры ........ 10
Паэзія 20-х – 30-х гадоў ........ 20
Беларуская проза 20-х – 30-х гадоў ........ 25
Драматургія ........ 38
«Нашаніўскі» перыяд беларускай літаратуры ........ 44
«Стану песняй у народзе». Цётка – Алаіза Пашкевіч ........ 46
Пачынальнік беларускай прозы. Ядвігін Ш. ........ 47
«Смерці ў паэта няма…» Максім Багдановіч ........ 49
«Падніміся з нізін сакаліна сям'я!» Янка Купала ........ 54
Народны пясняр. Якуб Колас ........ 60
«Браму скарбаў сваіх адчыняю…» Максім Гарэцкі ........ 62
«Званар нацыі». Вацлаў Ластоўскі ........ 69
«На горне душы». Змітрок Бядуля ........ 71
Дар паэта. Алесь Гарун ........ 75
«Асвятляць душу беларусаў добрым тэатрам». Уладзіслаў Галубок ........ 78
«Мы – маладняк новага зместу мастацкай творчасці».
Дзейнасць і творчасць літаратурна-мастацкай арганізацыі «Маладняк» ... 79
«З далін на ўзвышшы». Літаратурнае аб'яднанне «Узвышша» ........ 85
Літаратурнае аб'яднанне «Узвашша» ў постаццях:
Васіль Шашалевіч ........ 87
Тодар Кляшторны ........ 88
Сяргей Дарожны ........ 88
Максім Лужанін ........ 89
Пясняр красы і прыгажосці. Уладзімір Дубоўка ........ 90
Шукальнік хараства. Уладзімір Жылка ........ 92
«Лепш вольным птахам рэзаць шыр нябёсаў…» Язэп Пушча ........ 95
«Беларускі Дастаеўскі». Кузьма Чорны ........ 98
Вяршыня беларускай сатыры. Андрэй Мрый ........ 102
«Богам дадзены талент». Лукаш Калюга ........ 104
Мужны мастак-гуманіст. Міхась Зарэцкі ........ 107
Нястомны працаўнік. Кандрат Крапіва ........ 108
Загублены талент. Платон Галавач ........ 112
Вяртанне з небыцця. Янка Нёманскі ........ 114
Пісьменнік. Акадэмік. Дабрадзей. Міхась Лынькоў ........ 115
Прэм'ер-міністр. Вучоны. Пісьменнік. Вацлаў Ластоўскі ........ 118
«Бацька беларускай драматургіі». Францішак Аляхновіч ........ 119
Заходнебеларуская літаратура ........ 122
Заходнебеларуская літаратура ў постацях:
Казімір Сваяк ........ 126

Міхась Машара ........................................................................ 127
Міхась Васілёк ........................................................................ 128
Хведар Ільяшэвіч ........................................................................ 129
Язэп Драздовіч ........................................................................ 129
Леапольд Родзевіч ........................................................................ 130
Піліп Пестрак ........................................................................ 131
Валянцін Таўлай ........................................................................ 132
Пытанні для самакантролю ........................................................................ 134
Пытанні да экзамена па беларускай літаратуры
для студэнтаў III курса БФ ........................................................................ 138
Тлумачэнне некаторых імёнаў і паняццяў ........................................................................ 142